У. А. Сосна

# ФАРМІРАВАННЕ САСЛОЎНА-ГРУПАВОГА СКЛАДУ СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ
## Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.





БДУ

**У. А. Сосна**

# ФАРМІРАВАННЕ САСЛОЎНА-ГРУПАВОГА СКЛАДУ СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ

## ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

МІНСК
БДУ
2000

УДК 947.6
ББК 63.3(4Беи)
С63

Рэцэнзенты:
кандыдаты гістарычных навук, дацэнты
*Ю. А. Блашкоў, В. В. Швед*

Навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук, прафесар *А. П. Ігнаценка*

Рэкамендавана саветам гістарычнага факультэта БДУ
23 чэрвеня 1998 г., пратакол № 10

**Сосна У. А.**
С63 Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. – Мн.: БДУ, 2000. – 115 с.
ISBN 985-445-279-4.

Манаграфія ўяўляе сабой комплекснае даследаванне палітыкі царскіх улад па фарміраванні саслоўна-групавога складу земляробскага насельніцтва Беларусі ў часы ад падзелаў Рэчы Паспалітай да адмены прыгоннага права. Разгледжаны сацыяльна-прававы статус як асноўных (дзяржаўныя і прыватнаўласніцкія), так і спецыяльных (вольныя людзі, аднадворцы, яўрэі-земляробы і інш.) катэгорый сялянства. Прааналізаваны ход канфіскацый і падараванняў маёнткаў, секулярызацыя царкоўных уладанняў. Высветлены адносіны сялян да змен у іх стане.

Разлічана на навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў і ўсіх, хто цікавіцца гістарычным мінулым Беларусі.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 985-445-279-4**

© У. А. Сосна, 2000

# УВОДЗІНЫ

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй (1772, 1793, 1795) некалі магутная, буйнейшая дзяржава Еўропы перастала існаваць. Тэрыторыя Беларусі апынулася ў рамках іншага дзяржаўнага ўтварэння – Расійскай імперыі. Гэта, несумненна, адбілася на лёсе ўсяго беларускага насельніцтва, сярод якого тады дамінавала сялянства. У 1796 г. яго доля складала 89,1 %, праз паўстагоддзя, у 1851 г., – 80,8 %[1]. Хоць асновы сацыяльна-эканамічнага існавання сялянскіх мас аж да адмены прыгоннага права (1861) карэнным чынам не змяніліся, але адбыліся істотныя зрухі ў іх складзе, выкліканыя як уключэннем у расійскую сацыяльна-саслоўную структуру, так і разлажэннем феадальных і выспяваннем буржуазных адносін, характэрных для перыяду канца XVIII – сярэдзіны XIX ст. Працэсы змены дзяржаўнай прыналежнасці і грамадскага ладу выклікалі новыя з'явы ў жыцці, што непасрэдна ўплывала на саслоўна-класавую палітыку царызму.

Адрозненні паміж разрадамі сялян, што гістарычна склаліся на працягу стагоддзяў генезісу феадалізму, аказвалі вялікі ўплыў на стан грамадства і ў пазнейшыя часы, адбіваліся на характары сацыяльных супярэчнасцей, пазіцыі і паводзінах сялянства ў розных сітуацыях[2]. Па словах даследаваўшага аграрнае пытанне У. І. Леніна, "...гісторыя Расіі XIX веку і асабліва яе непасрэдны вынік – падзеі пачатку XX веку ў Расіі – зусім не могуць быць зразуметы, калі не ацаніць усяго значэння гэтага факту"[3].

Выклікаюць цікавасць перш за ўсё паходжанне сялянскіх разрадаў, колькасныя і якасныя іх змены. Разам з тым пастаноўка праблемы фарміравання саслоўна-групавога складу сялянства дае магчымасць засяродзіць увагу на асаблівасцях не толькі памешчыцкіх і дзяржаўных сялян, чым у асноўным і абмяжоўваліся дагэтуль даследчыкі, але і астатніх, больш дробных катэгорый сельскага насельніцтва, а таксама дазваляе ў пэўнай ступені прасачыць эвалюцыю саслоўнага ладу ва ўмовах змены феадалізму капіталізмам. Высвятленне колькасных перамяшчэнняў унутры сялянскага класа дапаможа даць адказ і на пытанне аб шляхах скарачэння прыгоннага насельніцтва, пастаўленае вядомым расійскім гісторыкам П. Р. Рындзюнскім[4].

Першы артыкул аб складзе сялянства Расійскай імперыі, якое знаходзілася ў веданні Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, быў на-

пісаны чыноўнікам гэтага міністэрства В. І. Вешняковым[5]. Задавальняючы практычныя патрэбы казённага апарату, аўтар надаў яму пераважна канцылярскі характар. Тым не менш звядзенне разам і пераказ законапалажэнняў аб кожным разрадзе сельскага насельніцтва ў спалучэнні з пагубернскімі зводкамі аб іх колькасці ў сярэдзіне XIX ст. робяць агляд Вешнякова даволі каштоўнай крыніцай. Такога ж роду матэрыялы ў рознай ступені ўтрымліваюцца і ў апісаннях асобных губерняў, складзеных афіцэрамі генеральнага штаба і выдадзеных у 60-х гг. XIX ст.[6]

Праблема канфіскацыі памешчыцкай і секулярызацыі царкоўнай уласнасці 30 – 40 гг. XIX ст. на матэрыялах Правабярэжнай Украіны закраналася ў кнізе[7] і часопіснай публікацыі манархіста В. Я. Шульгіна. Лічачы паўстанне 1830 – 1831 гг. падзеяй, што абудзіла ў цара клопат аб сялянах Заходняга краю, ён тым не менш вымушаны быў прызнаць: "у справе аб вызваленні праваслаўных сялян ад улады каталіцкага духавенства тагачасная мясцовая адміністрацыя кіравалася чыста палітычнымі меркаваннямі і дужа мала спагадай да сацыяльнага становішча сялян"[8].

Вядомы расійскі эканаміст А. П. Заблоцкі-Дзесятоўскі ў чатырохтомнай біяграфічнай працы аб міністры дзяржаўных маёмасцей П. Дз. Кісялёве з ліберальных пазіцый выклаў палітыку царызму ў дзяржаўнай і часткова памешчыцкай вёсцы ў 40 – 50-х гг. XIX ст.[9] У факталагічных адносінах найбольш каштоўны чацвёрты том, дзе апублікаваны ўласныя запіскі Кісялёва, што характарызуюць яго пазіцыю ў адносінах да канфіскаваных у паўстаўшых у 1830 – 1831 гг. памешчыкаў маёнткаў, стварэння ваенных пасяленняў і па іншых пытаннях. Па часе, тэматыцы і форме выкладу да гэтага выдання прымыкае жыццеапісанне віленскага генерал-губернатара Ф. Я. Міркавіча, які аказваў актыўны ўплыў на вырашэнне сялянскага пытання ў падведамасным яму краі[10].

Прадстаўнік народніцкага накірунку ў гістарыяграфіі В. І. Сямеўскі найбольш поўна разгледзеў праблему царскіх "падараванняў", упершыню прывёў іх агульныя лічбы па ўсёй імперыі і асобных рэгіёнах, вызначыў крыніцы, умовы і этапы раздач сялян. Аднак абмежаванасць метадалагічнай канцэпцыі не дазволіла аўтару выйсці з палону ўяўленняў аб тым, што прычынай падараванняў былі, на яго думку, асабістыя матывы і жаданні гасудароў і прыдворных[11]. Ся-

меўскаму належыць таксама грунтоўны энцыклапедычны артыкул аб складзе сялянства[12].

Каштоўную работу па вывучэнні саслоўнага складу насельніцтва Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны ў перыяд уключэння іх у склад Расійскай імперыі выканаў П. М. Жуковіч[13]. Абапіраючыся пераважна на архіўныя матэрыялы, ён узнавіў карціну колькасных перамяшчэнняў, што адбыліся ў саслоўнай структуры насельніцтва краю ў сувязі з падзеламі Рэчы Паспалітай. Праўда, з іх не заўсёды можна вылзеліць даныя, што датычыліся толькі тэрыторыі Беларусі. Гэта запатрабавала ад нас дадатковага звароту ў архівы і правядзення ўласных разлікаў. Як прадстаўнік дзяржаўна-прававой школы рускіх гісторыкаў Жуковіч бачыў асноўную прычыну саслоўных змен насельніцтва ў царскіх указах і дзейнасці дзяржаўных органаў, ігнаруючы глыбінныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы. Такая пазіцыя, за рэдкім выключэннем, характэрная для ўсіх рускіх дасавецкіх гісторыкаў[14].

Знамянальна, што вывад аб канфіскацыях памешчыцкіх маёнткаў як важнейшай крыніцы фарміравання дзяржаўных сялян упершыню быў сфармуляваны ў беларускай рэвалюцыйнай публіцыстыцы. "Стуль то ў нас і мужыкі казённыя, – тлумачыў К. С. Каліноўскі ў "Пісьмах з-пад шыбеніцы". – Пярвей яны служылі казне паншчызну, а после ў аброк іх упісалі, дай акром аброку ганялі без ніякай падзякі ўсялякаму чорту на работу: то акружному, то асэсару дай кожнаму, хто адно перакупіў"[15].

У 20-х гг. нашага стагоддзя праблемам падараванняў і канфіскацый маёнткаў прысвяцілі спецыяльныя працы польскія даследчыкі В. Шмідт[16] і Я. Івашкевіч[17], якія рэгіянальна і храналагічна сістэматызавалі гэтыя з'явы, абапіраючыся на ўжо існуючую гістарыяграфію і некаторыя ўласныя знаходкі. Метадалагічныя падыходы гэтых польскіх даваенных гісторыкаў мала чым адрозніваліся ад такіх жа падыходаў іх рускіх ліберальных калег, хіба што большы акцэнт рабіўся на чыста нацыянальныя ўзаемаадносіны.

Сур'ёзна займаўся даследаваннем аграрных адносін на Беларусі другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. К. І. Кернажыцкі[18]. Ён апублікаваў дакументы аб спробах раздачы канфіскаваных у 1831 г. маёнткаў рускім памешчыкам і перасялення ў Мінскую губерню рускіх дзяржаўных сялян. Апошняй праблеме прысвяціў спецыяльны артыкул К. А. Пушкарэвіч[19].

У даваеннай савецкай гістарыяграфіі, што распрацавала з апорай на марксізм агульную канцэпцыю гісторыі СССР і вызначыла асноўныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця феадальнай вёскі, асобныя катэгорыі сялян яшчэ толькі выдзяляліся ў аб'екты самастойных даследаванняў[20]. Аб'ектыўнаму і ўзважанаму аналізу іх эвалюцыі перашкаджала гіпертрафіраванае панаванне ў савецкія часы тэорыі класавай барацьбы, тэматыка даследавання якой адносна дакастрычніцкай гісторыі лічылася афіцыйна першачарговай, прыярытэтнай і якой імкнуліся тлумачыць усе з'явы грамадскага жыцця.

Пераломнай падзеяй у гісторыі вывучэння дарэформеннай вёскі з'явіўся выхад фундаментальнай працы расійскага акадэміка М. М. Дружыніна[21]. Першы том манаграфіі пачынаўся з параграфаў: "Утварэнне саслоўя дзяржаўных сялян" і "Эвалюцыя складу і колькасці новага саслоўя". У апошнім коратка характарызуецца якаснае папаўненне дзяржаўных сялян у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, робіцца заключэнне аб тым, што "саслоўе дзяржаўных сялян ператварылася ў вялізны рэзервуар, куды сцякаліся розныя патокі земляробскага насельніцтва"[22]. Разглядаючы статыстычныя звесткі аб колькасці казённага саслоўя па губернях і важнейшых разрадах, аналізуючы заканадаўства і практыку яго прымянення ў адносінах да спецыяльных катэгорый, М. М. Дружынін прыходзіць да прынцыповага вываду аб тым, што дзяржава, праяўляючы сацыяльна-палітычную ініцыятыву, імкнулася зблізіць паміж сабой разнастайныя праслойкі земляробскага насельніцтва шляхам ураўноўвання іх з асноўнай масай дзяржаўнага сялянства. Не ставячы перад сабой задачы ўсебаковага пагубернскага даследавання сваёй тэмы, аўтар тым не менш разглядаў Беларусь і Літву як асобны і своеасаблівы рэгіён.

Праца М. М. Дружыніна мела вялікі рэзананс і склала зыходную пазіцыю для правядзення серыі лакальных даследаванняў. Паказальны ў гэтых адносінах прыклад даследчыкаў гісторыі сялянства другой трэці XIX ст. суседняй Літвы, што знаходзілася ў падобных з Беларуссю сацыяльна-эканамічных і палітычных умовах. Дэталёва разгледзела рэформу П. Дз. Кісялёва ў Віленскай і Ковенскай губернях Т. А. Конюхава. У манаграфіі, прысвечанай гэтай тэме[23], аўтар змясціла грунтоўны нарыс складу казённай вёскі, указаўшы на актыўную ролю дзяржавы ў яе складванні. Значныя лічбы росту казённага

саслоўя ў Літве ў 30 – 40-х гг. XIX ст. яна тлумачыць “не столькі натуральным прыростам, колькі палітыкай урада, накіраванай на ўсямернае павелічэнне саслоўя дзяржаўных сялян і дзяржаўных маёмасцей ва ўсіх заходніх губернях”[24].

У шматлікіх артыкулах В. І. Неўпакоева, які глыбока і ўсебакова разгледзеў аграрна-сялянскае пытанне ў Літве гэтага часу, распрацаваны такія праблемы, як палітыка царызму ў канфіскаванай вёсцы, пераўтварэнне шляхты ў аднадворцаў, лёс “вольных” людзей заходніх губерняў[25]. У яго кнізе[26] асаблівую цікавасць уяўляе глава “Канфіскаваныя маёнткі Літвы ў планах аграрна-сялянскай палітыкі царызму”, у якой прагледжваецца ўвесь складаны і зацягнуты працэс пераходу сялян, што належалі ўдзельнікам паўстання 1830 – 1831 гг., у разрад дзяржаўных.

Працы Т. А. Конюхавай і В. І. Неўпакоева ўносяць значны ўклад у распрацоўку разглядаемай тэмы яшчэ і таму, што Віленская губерня і па тэрыторыі, і па насельніцтве з’яўлялася часткова, а з 1843 г. пераважна беларускай.

Пасляваенныя беларускія гісторыкі, засяродзіўшы максімум увагі на сацыяльна-эканамічным становішчы памешчыцкай вёскі, у той ці іншай ступені закраналі астатні яе склад у рамках агульных прац па аграрнай гісторыі Беларусі.

Даволі грунтоўна разгледжаны склад усяго насельніцтва Літвы і заходняй часткі Беларусі ў асобнай главе манаграфіі М. М. Улашчыка аб прадпасылках рэформы 1861 г. Аўтар акрэсліў кола крыніц па праблеме і прывёў даныя рэвізій аб колькасці розных катэгорый па паветах, забяспечыўшы іх нарысамі-каментарыямі. Апроч памешчыцкіх і дзяржаўных сялян, М. М. Улашчык выдзеліў сялян, што належалі духавенству і розным ведамствам, вольных людзей і аднадворцаў заходніх губерняў. Падагульняючы зробленае папярэднікамі, ён канстатаваў, што “да гэтага часу невядомы ні лік жыхароў, ні сацыяльны склад насельніцтва Літвы і Заходняй Беларусі. Работа В. І. Неўпакоева аб вольных людзях Літвы з’яўляецца толькі пачаткам вывучэння гэтага надзвычай складанага пытання”[27].

В. У. Чапко, даследуючы праблему разлажэння феадальна-прыгонніцкіх і фарміравання капіталістычных адносін у беларускай вёсцы, сцісла характарызуе групавы склад сялянства і спыняецца на гаспадарцы памешчыцкіх і дзяржаўных сялян[28]. У кнізе аб сялянскім руху

яна падводзіць вынік падаравання сялян Кацярынай II і Паўлам I. "Аграрная палітыка царскага ўрада ў Беларусі, – робіць з гэтага выснову аўтар, – заключалася ў насаджэнні землеўладання рускага дваранства і пашырэнні памешчыцкага землеўладання наогул"[29]. Тут жа змяшчаюцца цікавыя прыклады барацьбы прыватнаўласніцкіх сялян за пераход у склад дзяржаўных і адстойвання некаторымі з іх свайго папярэдняга статуса.

В. І. Мялешка, характарызуючы віды і структуру феадальнай зямельнай уласнасці на ўсходзе Беларусі другой паловы XVII – XVIII ст., прыводзіць даныя аб складзе сельскага насельніцтва гэтай тэрыторыі пасля далучэння да Расіі. У дадатку да яго працы змешчана табліца староstваў усходняй часткі Беларусі на 1773 г.[30]

Праблемы землеўладання і землекарыстання познефеадальнай Беларусі прыцягвалі ўвагу П. Р. Казлоўскага. У манаграфіі[31] ён пашырыў рамкі даследавання і на першую палову XIX ст., аперыруючы лічбамі аб колькасці сялян па пяці паўночна-заходніх губернях. У статыстычных табліцах зямельнай уласнасці аўтар адносіць да дзяржаўных ленных і першых паезуіцкіх сялян, хоць яны знаходзіліся ў адносінах да ўладальнікаў на вотчынным праве[32]. Відаць, гэта правамерна для пастаўленай ім тэмы, паколькі на працягу разглядаемага перыяду казна канчаткова не згубіла падзеленых з памешчыкамі правоў уласнасці на гэтыя маёнткі. Дарэчы, П. Р. Казлоўскаму належыць першапачатковая ідэя (разабрацца са складам дзяржаўных сялян) нашага даследавання, падтрыманая і развітая парадамі прафесара А. П. Ігнаценкі.

Асобныя аспекты тэмы таксама знайшлі адлюстраванне ў працах (іх назвы самі гавораць аб гэтым) У. М. Кабузана, А. П. Грыцкевіча, Ю. А. Блашкова, А. Л. Зінчанкі, Л. Р. Гарланава, А. М. Лютага і Г. М. Туміловіч, А. Г. Каралёвай, Я. К. Анішчанкі[33].

З прыведзенага агляду вынікае, што гісторыкамі асветлены шэраг пытанняў, якія адносяцца да пастаўленай тэмы, аднак асветлены яны нераўнамерна, а многія важныя бакі праблемы яшчэ не вывучаны. Даследчыкі, як правіла, толькі канстатавалі, са спасылкай на заканадаўчыя акты, наяўнасць такіх з'яў, як канфіскацыя памешчыцкіх маёнткаў у сувязі з вайной 1812 г., прыняцце ў казну езуіцкіх сялян, секулярызацыя манастырскіх вотчын і інш. Са спецыяльных катэгорый сельскага насельніцтва імі найбольш поўна разгледжаны вы-

бранцы, аднадворцы і вольныя людзі, а астатнія ці ўвогуле не закраналіся, ці асвятляліся крайне фрагментарна. Прыведзеныя ж агульныя звесткі аб землянробскім насельніцтве ці не ахоплівалі ўсёй беларускай тэрыторыі, ці далёка не вычэрпвалі яго разнастайнасці, а лічбавыя паказчыкі нярэдка даваліся ў статыцы, без раскрыцця механізмаў іх утварэння і змен, а то і з памылкамі ў каментарыях. Да прыкладу, стала хадавым, нават і для самых паважных выданняў[34], увайшло ў навучальныя дапаможнікі сцвярджэнне аб нібыта рэальна меўшых месца раздачах канфіскаваных у паўстанцаў 1830 – 1831 гг. маёнткаў рускім дваранам. Не заўсёды звярталася ўвага на канкрэтныя прычыны пераводу ў іншы разрад і на змены ў сувязі з гэтым становішча тых ці іншых груп сялянства, іх рэакцыю на вызначэнне свайго лёсу. Таму сам працэс эвалюцыі складу сялян Беларусі ў гэты перыяд не ўяўляецца цэласным, а з уласцівымі яму заканамернасцямі і этапамі. Усе гэтыя і іншыя недаробкі тлумачацца ў многім тым, што ў гістарыяграфіі яшчэ не разгледжана эвалюцыя непамешчыцкіх сялян Беларусі ўвогуле і ў сувязі з генезісам капіталізму з часоў палітычнага заняпаду Рэчы Паспалітай да рэформ 1860-х гг. Адчуваецца тут і адсутнасць абагульняючых работ па дэмаграфіі Беларусі.

Не выклікае сумнення, некаторыя аспекты тэмы ў розныя часы былі "нязручнымі" для тых, хто меў уладу, што магло стрымліваць іх распрацоўку ці ўвогуле замоўчваць. Так, Карл Маркс, закранаючы пытанні юрыдычнага афармлення прыгоннага права ў Расіі і масавых раздач казённых сялян памешчыкам пры Кацярыне II, заўважыў, што "ў расійскіх афіцыяльных дакументах непрыстойна было ўпамінаць аб такіх фактах"[35]. Не былі зацікаўлены царскія ўлады і ў афішыраванні былых "непаразуменняў" з пануючым саслоўем Заходняга краю, звязаных з канфіскацыямі. Наўрад ці можна лічыць выпадковай пазіцыю царкоўных гісторыкаў, якія аддалі шмат увагі духоўнай і палітычнай гісторыі канфесій, але па сутнасці ўхіліліся ад разгляду такой "зямной" праблемы, як секулярызацыя царкоўных уладанняў[36]. Савецкія ўлады фактычна наклалі табу на вывучэнне палітычнай гісторыі Беларусі феадальнай эпохі, выкідваючы з яе шляхту і яе ўдзел у палітычным жыцці, што напрасткі адбівалася на лёсе маёнткаў і сялян. У недалёкія яшчэ застойныя гады аўтара гэтых радкоў перасцерагалі ад публікацыі дакументальных даных аб

канфіскацыях расійскімі ўладамі маёнткаў у часы падзелаў Рэчы Паспалітай, бо гэта, маўляў, можа закрануць савецка-польскія адносіны. Да апошняга часу па нейкіх прычынах цяжка прабівалася да публікацыі інфармацыя аб яўрэях-земляробах...

Аснову крыніц для напісання манаграфіі склалі пераважна архіўныя дакументы. Даволі змястоўныя матэрыялы, што характарызуюць самыя разнастайныя пытанні тэмы, пачэрпнуты з такіх архівасховішчаў, як Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (РДГА), Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў (РДАСА), Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА) і Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ) у Маскве, Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы ў Вільні (ДГА Літвы), Нацыянальныя гістарычныя архівы Беларусі (НГА Беларусі) у Мінску і Гродне, Цэнтральныя дзяржаўныя гістарычныя архівы Украіны (ЦДГА Украіны) у Кіеве і Львове, Галоўны архіў даўніх актаў у Варшаве (ГАДА ў Варшаве), апошні – дзякуючы стыпендыі Касы імя Юзафа Мяноўскага Фонду падтрымкі польскай навукі. Усяго выкарыстана звыш 40 фондаў, многія архіўныя дакументы ўпершыню ўведзены ў навуковы ўжытак.

З апублікаваных крыніц варта выдзеліць першы і другі "Поўныя зборы законаў Расійскай імперыі"[37], дзе ў храналагічнай паслядоўнасці змешчаны ўказы, якія датычаць статуса і становішча розных катэгорый сялянства, указы аб канфіскацыях памешчыцкай і секулярызацыі царкоўнай уласнасці, а таксама шэраг іншых заканадаўчых актаў па сялянскім пытанні. Для перыяду 40 – 60-х гг. XIX ст., калі кіраванне дзяржаўнымі сялянамі перайшло да Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, важнае значэнне маюць яго выданні, што змяшчаюць пагубернскія, рэгіянальныя ці агульныя даныя складу падведамаснай вёскі і некаторыя факты саслоўна-групавых перамяшчэнняў[38]. Частка фактычнага матэрыялу ўзята са зборнікаў дакументаў па перыядзе феадалізму, выдадзеных у савецкі час[39]. У іх адлюстраваны характар палітыкі царызму ў Беларусі наогул і па сялянскім пытанні ў прыватнасці.

Каштоўныя звесткі выбраны з эпісталярных матэрыялаў, мемуарнай літаратуры і перыядычнага друку. Па магчымасці аўтар імкнуўся прыцягнуць усю сукупнасць адносімых да разглядаемага пытання фактаў. Пры гэтым улічвалася, што крыніцы маюць сваю

адметнасць і тэндэнцыйнасць, а таму запатрабаваўся адпаведны крытычны падыход да іх.

Асаблівыя праблемы ўзнікаюць са статыстыкай. У XVIII – першай палове XIX ст. асноўным метадам уліку насельніцтва Расійскай імперыі былі рэвізіі, паводле якіх складалі перапіс падатковага насельніцтва краіны, якое абавязана было плаціць падушны падатак і адбываць рэкруцкую павіннасць. Запісвалася таксама частка непадатных саслоўяў. У ходзе рэвізій (перыядычных праверак перапісаў) улічваліся рэвізскія душы (адзінкі ўліку мужчынскага насельніцтва), якія ўносіліся ў так званыя рэвізскія сказкі. Ва ўсходняй частцы Беларусі, якая раней была далучана да Расіі, праводзілася трэцяя (дадатковы перапіс 1772 г.) і чацвёртая (1782 г.) рэвізіі, разам з цэнтральнай і заходняй яе часткамі – пятая (1795 г.), шостая (1811 г.), сёмая (1816 г.), восьмая (1834 г.), дзевятая (1850 г.) і дзесятая (1858 г.) рэвізіі.

Першыя рэвізіі не вызначаліся асаблівай дакладнасцю, што прызнавалася і сучаснікамі. "...Падушны перапіс быў рэччу небывалай у Польшчы, – адзначаў у кнізе "О статистике в рассуждении России" кн. Шчарбатаў. – Сяляне думалі, што яны... абцяжарванням будуць падвергнуты, многія пайшлі, іншыя і, будучы на месцы, утойваліся, і такім чынам у многім гэты перапіс, як не ў строгасці роблены, ёсць няправільны"[40]. Праверка ў 1800 г. прапісных (прапушчаных) душ па V рэвізіі паказала, што ў Беларускай і Мінскай губернях было, напрыклад, не ўлічана адпаведна 5408 і 965 "казённага ведамства сялян" мужчынскага полу, у Віленскай і Гродзенскай – 13 737 і 4411 "сялян усіх назваў" мужчынскага полу[41]. Паводле іншых звестак, у Мінскай губерні былі запісаны лішнімі (два разы) 225 душ (з іх сялян – 204), а прапушчаны – 28 956 (мяшчан і цэхавых – 884, яўрэяў – 1863, сялян казённага кіравання – 51, старосцінскіх – 914, духоўных – 1060, памешчыцкіх і паезуіцкіх – 24 184) душ[42]. Блытаніна ў запісах сялян па станах, наяўнасць прапісных душ у рознай ступені характэрныя і для пазнейшых рэвізій. Памешчыкі і арандатары казённых маёнткаў, якія часта бралі на сябе працэдуру платы дзяржаўных падаткаў сялянамі, імкнуліся схаваць частку іх ад абкладання.

Своеасаблівасць саслоўна-групавой структуры грамадства, атрыманая ў спадчыну ад мінулых часоў, ваенна-палітычныя падзеі, што цягнулі за сабой шляхам канфіскацый пераходы, нярэдка толькі

часовыя, мас сялян з аднаго разраду ў другі, пераўтварэнні ў губернска-павятовым падзеле надзвычай ускладнялі ўлік насельніцтва паводле яго складу, параджалі разнабой і несупастаўляльнасць статыстычных звестак. Таму, як справядліва лічыў М. М. Улашчык, нідзе ў царскай Расіі вывучэнне гэтага пытання не звязана з такімі цяжкасцямі, як у Беларусі, Літве і на Правабярэжнай Украіне[43].

Манаграфія пабудавана па праблемна-храналагічным прынцыпе. Кожная з чатырох глаў прысвечана асобнай саслоўнай групоўцы. Увага ў іх сканцэнтравана на галоўных фактарах, што вызначалі змены ў колькаснай і якаснай эвалюцыі груповак: для памешчыцкіх сялян – гэта канфіскацыі памешчыцкіх маёнткаў; дзяржаўных – іх раздачы і папаўненні; належачых духавенству – секулярызацыя царкоўных уладанняў; спецыяльных ці паўсвабодных – іх нівеліроўка. Некаторыя са спецыфічных і спрэчных па прыналежнасці земляробскіх катэгорый пададзены ў главах разам з тымі разрадамі сялян, да якіх яны мелі адносіны ў працэсе саслоўна-групавых пераўтварэнняў. Агульныя высновы па тэме сфармуляваны ў заключэнні.

Разам з тым работа мае не гісторыка-дэмаграфічны, а хутчэй гісторыка-палітычны характар, бо ў сутнасці сваёй раскрывае адносіны ўлад па магчымасці да ўсяго разнастайнага складу сялянства Беларусі і ўплыў палітычных падзей на гэты склад. Натуральны рух сельскіх жыхароў, іх агульныя страты ў часе войнаў і эпідэмій, пераходы ў неземляробскія саслоўі, як не ўплываючыя істотным чынам на ўнутрысаслоўнае пераразмеркаванне сялянства, не разглядаюцца.

Лагічным працягам выдання была б падрыхтоўка спецыяльных прац па кожным з ахарактарызаваных тут разрадаў, катэгорый і груп. Тым больш, стан крыніц забяспечвае перспектыўнасць гэтай праблематыкі ў даследчыцкім сэнсе, а змест кнігі, спадзяёмся, будзе садзейнічаць абуджэнню цікавасці да яе.

## Бібліяграфічныя спасылкі

[1] Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Мн., 1997. Т. 1. С. 270 – 271.

[2] Гл.: *Литвак Б. Г.* Сословно-групповые особенности крестьянского движения в период кризиса крепостничества // Социально-экономические проблемы российской деревни в феодальную и капиталистическую эпохи. Ростов н/Д., 1980.

[3] *Ленін В. І.* Аграрнае пытанне ў Расіі к канцу XIX веку // Творы. Мн., 1955. Т. 15. С. 62.

[4] *Рындзюнский П. Г.* Вымирало ли крепостное крестьянство перед реформой 1861 г.? // Вопросы истории. 1967. № 7.

[5] *Вешняков В.* Исторический обзор происхождения разных названий государственных крестьян // Журнал Министерства государственных имуществ. 1857. № 1, 3, 4, 12.

[6] Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: *Бобровский П.* Гродненская губерния. Спб., 1863. Ч. 1, 2; *Зеленский И.* Минская губерния. Спб., 1864. Ч. 1, 2; *Корева А.* Виленская губерния. Спб., 1861.

[7] *Шульгин В.* Юго-Западный край в последнее двадцатипятилетие (1838 – 1863). Киев, 1864.

[8] *Шульгин В.* Юго-Западный край под управлением Д. Г. Бибикова // Древняя и новая Россия. 1879. № 6. С. 92.

[9] *Заблоцкий-Десятовский А. П.* Граф П. Д. Киселев и его время. В. 4 т. Спб., 1882. Т. 2, 4.

[10] Федор Яковлевич Миркович. 1789 – 1866. Его жизнеописание, составленное по собственным его запискам, воспоминаниям близких людей и подлинным документам. Спб., 1889.

[11] *Семевский В.* Пожалование населенных имений при императоре Павле // Русская мысль. 1882. № 12. *Он же.* Пожалования населенных имений в царствование Екатерины II-й. Спб., 1906.

[12] *Семевский В. И.* Крестьяне различных наименований в XVIII и первой половине XIX в. // Энцикл. слов. "Гранат". 7-е изд. Т. 25. Приложение к с. 563 – 564.

[13] *Жукович П. Н.* Сословный состав населения Западной России в царствование Екатерины II // Журнал Министерства народного просвещения. 1915. № 1, 2, 5.

[14] Гл. напрыклад: *Лаппо-Данилевский А. С.* Очерк истории образования главнейших разрядов крестьянского населения в России // Крестьянский строй. Спб., 1905. Т. 1.

[15] *Каліноўскі К.* За нашую вольнасць. Творы, дакументы. Мн., 1999. С. 41.

[16] *Schmidt W.* Geneza prywatnej rosyjskiej wlasności ziemskiej w guberniach wileńskiej, grodzieńskiej i mińskiej (1793 – 1875). Warszawa, 1923.

[17] *Iwaszkiewicz J.* Wykaz dóbr ziemskich skonfiskowanych przez rządy zaborcze w latach 1773 – 1867. Warszawa, 1929.

[18] *Кернажыцкі К. І.* Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мн., 1935.

[19] *Пушкаревич К. А.* Преобразование духа народности // Изв. АН СССР. Отд. обществ. наук. 1932. № 1.

[20] Гл.: *Выскочков Л. В.* Проблема государственных крестьян дореформенного периода в советской историографии // Генезис капитализма в России в отечественной историографии. Ярославль, 1981. С. 110 – 111.

[21] *Дружинин Н. М.* Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселева: Предпосылки и сущность реформы. М.; Л., 1946. Т. 1; Реализация и последствия реформы. М., 1958. Т. 2.

[22] *Дружинин Н. М.* Государственные крестьяне... Т. 1. С. 43.

[23] *Конюхова Т. А.* Государственная деревня Литвы и реформа П. Д. Киселева. 1840 – 1857 гг. (Виленская и Ковенская губернии). М., 1975.

[24] *Конюхова Т. А.* Люстрация и хозяйственное устройство государственной литовской деревни по реформе П. Д. Киселева // История СССР. 1966. № 5. С. 54.

[25] *Неупокоев В. И.* "Вольные" люди Литвы в первой половине XIX в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1960 г. Киев, 1962; *Он же.* Преобразование беспоместной шляхты в Литве в податное сословие однодворцев и граждан // Революционная ситуация в России в 1859 – 1861 гг. М., 1974; *Он же.* Позиция П. Д. Киселева в вопросе создания майоратов в западных губерниях // Из истории экономической и общественной жизни России. М., 1976.

[26] *Неупокоев В. И.* Крестьянский вопрос в Литве во второй трети XIX века. М., 1976.

[27] *Улащик Н. Н.* Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. С. 23.

[28] *Чепко В. В.* Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века. Мн., 1966.

[29] *Чепко В. В.* Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972. С. 23.

[30] *Мелешко В. И.* Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (вторая половина XVII – XVIII в.). Мн., 1975.

[31] *Козловский П. Г.* Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. Мн., 1982.

[32] Гл.: *Вешняков В.* О ленных имениях в западных губерниях // Журнал Министерства государственных имуществ. 1861. № 1; Имения ленные и поиезуитские // Журнал Министерства государственных имуществ. 1862. № 6; *Стоцкий.* Историко-юридические исследования о поиезуитских имениях в Западном крае // Записки для чтения. 1868. Нояб. и дек.

[33] *Кабузан В. М.* Изменения в размещении населения России в XVIII – первой половине XIX в. (По материалам ревизий). М., 1971; *Грицкевич А. П.* Материалы из истории слуцких выбранцев как источник по крестьянской генеалогии // Сов. славяноведение. 1973. № 5; *Блашков Ю. А.* Экономическое положение пахотных солдат Витебской и Могилевской губерний // Роль крестьянства в социально-экономическом развитии общества. Мн., 1984; *ЗинченкоА. Л.* Реформа государственной деревни и секуляризация церковного землевладения в западных губерниях Российской империи // Исторические записки. М., 1985. Т. 112; *Горланов Л. Р.* Удельные крестьяне России. 1797 – 1865 гг. Смоленск, 1986; *Люты А. М., Тумiловiч Г. М.* Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII – першая палова XIX ст.). Мн., 1991; *Королева Е. Г.* Численность и структура сельского населения Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. // Сельское хозяйство и крестьянство Беларуси. Мн., 1991; *Анішчанка Я. К.* Беларусь у часы Кацярыны II (1772 – 1796 гады). Мн., 1998.

[34] История СССР с древнейших времен до наших дней: В 12 т. М., 1967. Т. 4. С. 375.

[35] *Маркс К.* Об освобождении крестьян в России // *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч. 2-е изд. Т. 12. С. 692 – 693, примечание.

[36] Гл. напрыклад: *Киприанович Г. Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего до настоящего времени. 2-е изд. Вильна, 1899.

[37] Полное собрание законов Российской империи. Спб., 1830. Собр. 1 (далей – ПСЗ-I). Т. 19 – 40; 1830 – 1873. Собр. 2 (далей – ПСЗ-II). Т. 1 – 48.

[38] Общее обозрение состояния государственных имуществ по губерниям, подведомственным второму департаменту. Спб., 1841; Материалы для статистики России, собираемые по ведомству Министерства государственных имуществ. Спб., 1861. Вып. 3.

[39] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі / Пад рэд. Н. М. Нікольскага, Д. А. Дудкова, І. Ф. Лочмеля. Мн., 1940. Т. 2; Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. документов и материалов / Сост. В. В. Чепко, В. В. Шатилло. Мн., 1961. Т. 3; 1979. Т. 4.

[40] Цыт. па: *Заблоцкий М.* О количестве народонаселения России в 1776 – 1777 годах по губерниям и отчасти по состояниям // Указатель политико-экономический. 1859. Июль. Вып. 3. С. 63.

[41] РДАСА, ф. 248, воп. 58, спр. 4859, арк. 626 – 627.

[42] ЦДГА Украіны ў Кіеве, ф. 533, воп. 1, спр. 1565, арк. 1 – 3.

[43] *Улащик Н. Н.* Предпосылки крестьянской реформы... С. 36.

# Глава 1

## КАНФІСКАЦЫІ ПАМЕШЧЫЦКІХ МАЁНТКАЎ

Канфіскацыя азначае прымусовае адчужэнне маёмасці на карысць дзяржавы без кампенсацыі страты яго ўладальніку. У Расіі XVIII ст. існавала асобая канцылярыя канфіскацый, што адпісвала ў казну маёнткі за нядоімкі, банкаўскія даўгі, нярэдка ў вяльможаў, якія трапілі ў апалу пры перамене вярхоўнай улады. Абсалютысцкі ўрад Кацярыны II, што максімальна ўмацаваў памесную ўладу дваранства, знішчыў практыку адвольнага пазбаўлення маёнткаў "высакародных". Даравальная грамата дваранству 1785 г. не толькі забараніла гэта рабіць без суда, але і "ў выпадку прысуду і па важнейшаму злачынству" аддаваць "законнаму яго спадчынніку ці спадчыннікам"[1]. Нават пры вымушанай куплі казной прыватнай уласнасці для любых грамадскіх, дзяржаўных ці гаспадарчых патрэб неабходна было выданне спецыяльнага царскага ўказа[2]. У святле выкладзенага зразумела, што прыняцце ў адносінах да памешчыкаў Беларусі такіх мер выклікалася пільнай палітычнай неабходнасцю. Для абгрунтавання канфіскацый урад звяртаўся да адпаведных артыкулаў Статута Вялікага княства Літоўскага, што ў якасці асноўнага збору законаў феадальнага права дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы аж да 30 – 40-х гг. XIX ст.[3] Канфіскацыі часта папярэднічаў секвестр – наклад забарон і абмежаванняў на распараджэнне маёнткамі і прыняцце іх у "казённы нагляд".

Плакат ад 16 жніўня 1772 г. да насельніцтва ўсходнебеларускіх губерняў недвухсэнсава папярэджваў: "Калі ж хто з дваранства ці з іншага стану, які валодае нерухомымі маёнткамі, нядбаючы аб уласным сваім дабрабыце, не пажадае прысягаць (на падданства Расіі.– *У. С.*), таму дазваляецца на продаж нерухомага свайго маёнтка і добраахвотны выезд па-за межы ў трохмесячны тэрмін, па сканчэнні якога ўвесь маёнтак яго, які застаецца, секвестраваны і ў казну ўзяты быць павінен"[4]. Шляхам канфіскацый царскі ўрад падрываў эканамічны ўплыў палітычных праціўнікаў на анексаваных тэрыторыях.

Клапоцячыся аб захаванні сваіх уладанняў і атрыманні правоў расійскага дваранства, шляхта на ўсходзе Беларусі ў сваёй масе адразу прысягнула Кацярыне II. Ухіліліся ад прыняцця прысягі толькі некаторыя з буйных магнатаў: двое Радзівілаў – ваявода віленскі і староста рэчыцкі; трое Агінскіх – вялікі гетман літоўскі, кашталян

віленскі і ваявода трокскі; Сапега – ваявода полацкі і гетман польскі і літоўскі; Салагуб – ваявода віцебскі; Пацей – вялікі стражнік літоўскі; Чартарыйскі – ваявода рускі[5]. Відавочна, што іх апазіцыйнасць да царызму выклікалася бояззю згубіць разлеглыя ўладанні і высокія пасады ў Рэчы Паспалітай, а асобныя былі замешаныя і ў антырасійскай канфедэрацыі, створанай у 1768 г. у г. Бары на Падоллі.

У выніку канфіскацый па стане на 1 чэрвеня 1773 г. у казённае кіраванне паступіла 95 097 душ, якія лічыліся паводле перапісу ў вёсках і мястэчках, што належалі раней памешчыкам Магілёўскай і Пскоўскай губерняў[6].

Шляхта Рэчы Паспалітай падтрымлівала інтарэсы сваіх сабратоў на адлучанай тэрыторыі. Імкнучыся дабіцца асобага статуса гэтых зямель у складзе Расіі, яны настойвалі перад Кацярынай II на адмене канфіскацый. Для гэтага выкарыстоўваліся сейм, кароль, нават прапаноўвалася вынесці пытанне на кангрэс еўрапейскіх дзяржаў[7]. Землеўладальнікі і самі нярэдка звярталіся да расійскай адміністрацыі з просьбамі аб працягу тэрміну прысягі, спасылаючыся на хваробы, адлучкі, аддаленасць у знаходжанні і г. д. Царскі ўрад не мог абвастраць адносін з усім маёмным класам Рэчы Паспалітай і пашыраў тэрміны і ўмовы прыняцця прысягі. Ён звычайна лёгка ішоў насустрач тым, хто не быў замешаны ў адкрытым узброеным выступленні. Такім чынам, частка канфіскаваных маёнткаў была вернута ранейшым уладальнікам ці іх спадчыннікам. У выпадку, калі сяляне былі ўжо аддадзены рускім памешчыкам, за іх казна ўплочвала грашыма.

Кацярына II праяўляла цвёрдасць, калі справа тычылася тых, хто адкрыта выступаў супраць Расіі. Так, гетман вялікі літоўскі Міхал Казімір Агінскі ў свой час імкнуўся стаць яе каханкам і нават быў падтрыманы як адзін з кандыдатаў на трон Рэчы Паспалітай, але пасля перайшоў на бок барскіх канфедэратаў. На ўсходзе Беларусі ён страціў Чачэрскае і Казянскае староствы, родавыя маёнткі Круглае і Навіна, мястэчка Бешанковічы. Рознымі шляхамі Агінскі імкнуўся вярнуць свае маёнткі. Але шматлікія хадайніцтвы караля ў Пецярбург і нават афіцыйны дэмарш прадстаўнікоў Міністэрства замежных спраў засталіся безвыніковымі[8]. Такімі вялікімі маёнткамі, як лічыла Кацярына II, "няўдзячны Агінскі няварты быў валодаць"[9].

Напалоханыя вопытам сваіх папярэднікаў і бачачы бяссілле Рэчы Паспалітай, шляхецтва і духавенства ў цэнтры Беларусі прысяг-

нула Кацярыне II. Паводле трэцяга падзелу ў склад Расійскай імперыі ўвайшла фактычна ўся тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага і амаль ніхто з уладальнікаў не застаўся за мяжой. "Тут усе прысягалі, усе ў наяўнасці, як свецкія, так і духоўныя, – даносіў у Пецярбург генерал-губернатар Літвы і захаду Беларусі М. В. Рапнін. – З Польшчаю ж Літва, як асобная дзяржава, ніколі, нават па духавенстве і маёнтках яго, не змешвалася. Значыць, канфіскацыі амаль няма"[10]. Прыклад у прыняцці прысягі на гэты раз паказвала арыстакратыя, для якой ліквідацыя краіны стала ратункам ад рэвалюцыйных перамен.

Аднак у адказ на другі падзел Рэчы Паспалітай патрыятычныя арганізацыі паднялі ў 1794 г. паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Царызм не без падстаў убачыў у гэтым руху небяспеку буржуазных пераўтварэнняў на манер Вялікай французскай рэвалюцыі. Адсюль – суровыя пакаранні актыўных удзельнікаў паўстання і пераслед прадстаўнікоў маёмных пластоў, ахопленых патрыятычным рухам. Гэтым займаліся губернская адміністрацыя, ваенныя суды і Асобая следчая камісія ў Смаленску. 19 красавіка 1794 г. Кацярына II пісала мінскаму, ізяслаўскаму і брацлаўскаму генерал-губернатару Ц. І. Туталміну: "Калі хто-небудзь адкрыецца яўна ці ў змове ўлічаны будзе, то зараз жа накласці секвестр на яго маёнтак і ўзяць у казённае кіраванне... да часу рашаючага тлумачэння ў невінаватасці ці ў злачынстве... і тады, паводле дакладнага высвятлення, выйсці можа загад ці вярнуць, ці зусім пазбавіць маёнтка гэтага"[11].

Секвестр маёнткаў з'яўляўся прадметам палітычнай гульні імператрыцы, якая імкнулася кансерваваць грамадскі лад Рэчы Паспалітай, выкарыстоўваючы "пугу і пернік" для прыцягнення землеўладальнікаў на свой бок. Апошнія адразу адчулі гэта. Кіраўнік маёнткамі Храптовіча ў Аршанскім і Лепельскім паветах Ігнат Амульскі пісаў уладальніку 18 красавіка 1793 г.: "У Маніфесце нам пагражаюць секвестрацыяй маёнткаў у выпадку непрынясення прысягі на працягу месяца, а ў прысязе сказана, што мы добраахвотна, без прымусу хочам і жадаем знаходзіцца пад уладай Расіі"[12]. Адразу пасля першага падзелу рыхтаваліся інструкцыі расійскаму паслу ў Рэчы Паспалітай Штакельбергу "аб накладанні секвестру на маёмасці палякаў, якія працівяцца цяперашняму становішчу"[13]. 25 мая 1794 г. генерал-губернатар Туталмін, абмяркоўваючы ў пісьме да галоўнакамандуючага расійскім войскам у Вялікім княстве Літоўскім Рапніна магчымасці

стварэння працарскай канфедэрацыі шляхты, сцвярджаў, што пры прасоўванні расійскіх войскаў да рэзідэнцыі князя Сапегі ў Ружанах, "калі немалыя з яго маёнткаў будуць у небяспецы, ён не раздумае да нас прыстаць, і асабліва калі паласкаюць яго славалюбства, праз якое да бунтаўшчыкоў ён далучыўся"[14]. Таму Кацярына II не спяшалася з канчатковым пераводам секвестраваных сялян у склад казённых, пакідаючы магчымасць для іх уладальнікаў з'явіцца з павіннай. Так, на просьбу фаварыта, князя Зубава, аб "падараванні" секвестраваных маёнткаў пляменніка караля, яна сказала: "Што датычыць секвестру – так, але што да канфіскацыі, мы паглядзім, ці прыедзе ён"[15]. Секвестр маёнткаў меў і чыста ваенную мэту: не дапусціць выкарыстання даходаў "на садзейнічанне мяцежніцкім намерам"[16].

Указ аб канфіскацыі выйшаў толькі 3 мая 1795 г., праз паўгода пасля падаўлення паўстання[17]. Паводле Туталміна, яму прадпісвалася "ўсе маёнткі, што належалі яўным злачынцам, узяць у казну; староствы тых уладальнікаў, якія пры зацвярджэнні права валодання імі ў межах імперыі не знаходзіліся, таксама адабраць; адлучным уладальнікам, якія да 1 студзеня гэтага года вярнуліся, секвестраваныя іх памесці вярнуць; а тым, якія і да сёння не прыехалі з-за мяжы, загадана прадаць у гадавы тэрмін"[18].

Асноўная маса спадчынных канфіскаваных маёнткаў аказалася ў цэнтральнай частцы Беларусі. Тут адразу ж паступіла ў кіраванне казны 16 931 і часова заставалася ў арэндзе 8310 "карэнных пасялян мужчынскага полу" (акрамя "карэнных", у маёнтках знаходзілася яшчэ 1908 і 253 "вольнажывучых"). Звыш таго, па Мінскай губерні было ўзята ў казённы нагляд у памешчыкаў, якія знаходзіліся за мяжой, яшчэ 13 112 душ. У Магілёўскім і Полацкім намесніцтвах у казённы секвестр трапілі толькі маёнткі "адлучных" князя Сапегі і графа Пацея, у якіх налічвалася 31 355 рэвізскіх душ[19]. Па Слонімскай губерні і беларускіх (у цяперашніх межах) паветах Віленскай губерні ў дзевяці ўдзельнікаў паўстання былі секвестраваны 2854 сялянскія дымы[20].

Неаднолькавыя памеры канфіскацый у розных рэгіёнах Беларусі звязаны не толькі са ступенню ўдзелу ў паўстанні маёмных пластоў. На першы погляд здзіўляе самая меншая колькасць сялян, секвестраваных у яе заходняй частцы, дзе паўстанне Касцюшкі атрымала найбольшае развіццё. Відаць, гэта звязана як з тым, што абводы трэцяга падзелу былі юрыдычна замацаваны за Расіяй ужо пасля падаўлення паўстання,

так і з адносінамі да гэтага камандуючых расійскімі войскамі і вышэйшых прадстаўнікоў новай улады. Так, А. В. Сувораў меркаваў, што Рэч Паспалітая захаваецца, і таму даваў распараджэнні аб амністыі і роспуску па хатах паўстанцкіх атрадаў, аднаўляў мясцовую адміністрацыю. Князь Мікалай Рапнін, які стаў першым генерал-губернатарам Літвы і заходняй часткі Беларусі, наогул выступаў супраць канфіскацый, дапамагаючы пазбегнуць яе знатным фаміліям. Што да Цімафея Туталміна, які здзейсніў чыноўніцкую кар'еру да генерал-губернатара цэнтральнай часткі Беларусі і заходнеўкраінскіх зямель, але не меў уласных памесцяў, то ён не без падстаў разлічваў на "падараванне" канфіскаванага маёнтка і пастараўся дакладна выканаць прадпісанне імператрыцы. Ва ўсходніх намесніцтвах дваранства бачыла перад сабой існаваўшую ўжо больш 20 гадоў моцную дзяржаўную ўладу, якая дастаткова паспяхова зарэкамендавала сябе ў адстойванні іх асноўных сацыяльных інтарэсаў.

Трэба адзначыць, што пры канфіскацыях не ставілася мэтай павялічыць казённае сялянскае саслоўе за кошт змяншэння памешчыцкага. Гэта адбывалася мімаходна. Пад увагу не браліся нават магчымыя фіскальныя выгады такога пашырэння дзяржаўнай уласнасці. Канфіскацыі ажыццяўляліся ў рамках агульных мер па палітычным супакаенні краю. "...Мы не знаходзім ніякай карысці ў памнажэнні ўладаючых нерухомымі маёнткамі ў абводах нашых такіх людзей, – пісала імператрыца Туталміну 22 лістапада 1794 г., – у вернасці і шчырасці якіх няма такой пэўнасці, прызнаючы насупраць таго выгодай і лепшаю ўпэўненасцю для спакою тых абводаў, калі б колькасць такіх зменшылася выездам з межаў нашых і продажам маёнткаў сваіх такім, на вернасць і шчырасць якіх больш разлічваць можна"[21]. У заходнееўрапейскай прэсе нават з'явілася паведамленне аб куплі многіх памесцяў "ад вяльможаў у Літве і Украіне, каб уплыў тых вялікіх памешчыкаў абмежаваць на справы дзяржаўныя"[22].

Секвестр аказаўся дастаткова эфектыўным сродкам барацьбы з паўстаннем, ад якога адыходзілі найбольш маёмныя пласты. Паказальна рэакцыя сямейства Чартарыйскіх, якія, даведаўшыся аб накладанні секвестру на іх маёнткі, адразу парвалі з патрыятычным рухам і, заручыўшыся падтрымкай аўстрыйскага двара і літоўскага генерал-губернатара, паслалі ў Пецярбург двух сыноў прасіць Кацярыну II аб вяртанні сваёй маёмасці[23]. "Ледзьве гэтыя бednякі

адкруціліся", – спачувальна пісаў Рапнін[24], які адначасова рашуча караў тых, хто спрабаваў прыцягнуць да паўстання сялян.

З пачатку паўстання Кацярына II вырашыла спешна "вярнуць" сялян-уніятаў у праваслаўе. Указ 22 красавіка 1794 г. пагражаў памешчыкам-католікам секвестрам маёнткаў, калі яны акажуць процідзеянне праводзімаму мерапрыемству[25]. Аднак практычна да "ўз'яднання" уніятаў улады змаглі прыступіць толькі ў 1795 г., калі ўрад, справіўшыся з паўстаннем, хутка губляў цікавасць да гэтага. Ён фактычна закрыў вочы на мноства фактаў, якія сведчылі аб чыненні "перашкод" да пераходу ў праваслаўе, "зводзе" праваслаўных сялян у унію і уніятаў у рымска-каталіцтва, і не канфіскаваў ніводнага маёнтка. Такі ж лёс спасцігла і прынятае 15 студзеня 1797 г. у канчатковай канвенцыі падзелу Рэчы Паспалітай рашэнне аб канфіскацыі маёнткаў двайных падданых, калі яны на працягу 5 гадоў не вызначаць свайго грамадзянства[26].

Увогуле, калі небяспека паўстання мінавала, то Кацярына II "па засведчанні ў невінаватасці" ці проста "з міласэрнасці" не магла не дараваць многім знатным арыстакратам іх "памылак". На працягу 1795 г. і ў пачатку 1796 г. шэрагам імянных указаў больш двух трацей секвестраваных маёнткаў былі вернуты іх ранейшым уладальнікам[27]. Практычна канфіскаванымі заставаліся маёнткі асоб, якія былі прысуджаны Смаленскай камісіяй да ссылкі ці ўпаміналіся "ў публічных падбухторшчыцкіх актах". Павел I з прыходам да ўлады адразу ж вызваліў Касцюшку і 29 лістапада 1796 г. выдаў указ аб амністыі ўсіх "падпаўшых пад пакаранне, зняволенне і ссылку, з выпадку былых у Польшчы замяшанняў"[28]; некаторым з іх былі вернуты і маёнткі. У 1801 г. некалькім дваранам дазволіў вярнуцца ў свае маёнткі Аляксандр I[29].

Аднак частка пераважна небагатых дваран, захопленых патрыятычным рухам у эміграцыі, так і не атрымала даравання ці не скарыстала імператарскія "міласці". Таму не ўсе і не адразу канфіскаваныя вёскі вярталіся да ранейшых уладальнікаў. Так, на 1797 г. сярод 37 949 дзяржаўных сялян Полацкага намесніцтва лічылася "секвестраваных, якімі карыстаюцца крэдыторы да вяртання імі грошай, пазычаных у іх ранейшымі ўладальнікамі", 7162 і "секвестраваных пасля паўстання 1794 года" 126 рэвізскіх душ[30]. Як сведчыў сучаснік, які праходзіў у 1794 г. праз Магілёўскае намесніцтва, нягледзячы на раздачы рускім памешчыкам, большая частка маёнткаў, канфіскаваных яшчэ пасля

першага падзелу ў князя Радзівіла і гетмана Агінскага, заставалася ў казне[31]. У крыніцы за 1801 г. па Мінскай губерні ўпамінаюцца секвестраваныя маёнткі сямі асоб[32]. Паводле падлікаў П. Р. Казлоўскага, зробленых, відаць, па няпоўным пераліку Я. Івашкевіча, усяго за часы падзелаў Рэчы Паспалітай, да 1800 г., на тэрыторыі Беларусі ў яе сучасных межах, а таксама Себежскага і Невельскага паветаў Віцебскай губерні былі канчаткова канфіскаваны 26 маёнткаў з 36 080 сялянскімі душамі мужчынскага полу[33].

Прычыны непаслядоўнасці канфіскацыйнай палітыкі царызму ў канцы XVIII ст. трэба бачыць не толькі ў праяўленні агульнай яго сімпатыі да пануючага саслоўя, сацыяльныя інтарэсы якога ён павінен быў адстойваць. Вядома, які вялікі ўплыў на расійскую палітыку аказвала французская буржуазная рэвалюцыя. Аб'явіўшы сябе ў авангардзе барацьбы з "якабінскай заразай", царскі ўрад, зразумела, не мог дапускаць узнікнення ў еўрапейскіх феадальных колах непрыемных паралеляў, звязаных з нацыяналізацыяй маёнткаў дваран-эмігрантаў і экспрапрыяцыяй царкоўных маёмасцей французскімі рэвалюцыйнымі ўладамі.

Што да сялян, то яны звычайна былі рады пазбавіцца ад прыватных уладальнікаў, тым больш, што становішча іх, прынамсі прававое, пад апекай казны, хоць у большасці выпадкаў і часовай, паляпшалася. Імкнучыся ізаляваць паўстанне ад сялянскіх мас, царскія генералы дапускалі рэверансы ў адносінах да сялян аж да адабрэння выступленняў супраць памешчыкаў, "прыстаўшых да бунту", і да абяцанняў перадаць у іх карыстанне секвестраваныя маёнткі. Туталмін атрымаў распараджэнне "...у вёсках, якія ў казённае кіраванне ўзяты быць могуць", адхіляць "пасялянам ненавісных цяперашніх адміністратараў", як людзей палітычна ненадзейных. 19 красавіка 1794 г. Кацярына II прадпісвала "да маёнткаў гэтых прыставіць верных і чэсных наглядчыкаў, аблягчаючы жыхароў наколькі магчыма ў павіннасцях, чым сэрцы народныя цалкам да сябе схіліць можна, для ўстаранення здраднікаў і запальшчыкаў непарадкаў"[34]. Зрэшты, гэтыя крокі мелі не столькі практычны, колькі рэкламны, прапагандысцкі характар; яны спыняліся і аддаваліся забыццю па меры змяншэння паўстанцкай небяспекі.

Для асноўнай масы сялян секвестр і канфіскацыі 1772 – 1795 гг. у канчатковым выніку зваліся самае большае да замены ўладальнікаў без істотных змен у іх сацыяльна-эканамічным жыцці. Нават і

той невялікай частцы сялян, якой пашанцавала затрымацца ў складзе казённых і надалей, у XIX ст. наканавана было ва ўмовах запанаваўшай тады арэнднай сістэмы эксплуатацыі дзяржаўнай вёскі чакаць рэальнага паляпшэння свайго стану аж да 40 – 50-х гг. (так званай рэформы П. Дз. Кісялёва). У любым выпадку сапраўдныя сялянскія надзеі аказваліся няспраўджанымі.

Моцнае браджэнне ў шляхецкім асяроддзі выклікалі расійска-французскія адносіны напярэдадні і ў перыяд вайны 1812 г. Імператар Напалеон стварыў так званае Княства Варшаўскае і абяцаў аднавіць ранейшую дзяржаўнасць на ўсёй тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. За падзеямі, якія там адбываліся, уважліва сачыла вышэйшае саслоўе заходніх губерняў Расійскай імперыі. Многія памешчыкі рушылі праз граніцу, разлічваючы на атрыманне дзяржаўных пасад. Узмацніўся прыток у польскія войскі шляхецкай моладзі з Беларусі і Літвы.

Занепакоены гэтым царскі ўрад выдаў шэраг указаў аб узяцці ў секвестр маёнткаў у асоб, якія самавольна выехалі за мяжу[35]. Рэальная магчымасць згубіць свае зямельныя ўладанні прымушала ўцекачоў вяртацца, каб прадаць ці закласці іх, а атрыманыя за гэта грошы вывезці  за мяжу. У адказ Камітэт міністраў зрабіў наступны крок: забараніў продаж і заклад такіх маёнткаў тэрмінам да двух гадоў[36]. У цэлым адзначаныя меры прымаліся ўладамі стрымана і асцярожна, каб не выклікаць азлобленасць пануючага саслоўя, і накіроўваліся пераважна на тое, каб не выкарыстоўваліся сродкі з маёнткаў для арганізацыі замежных атрадаў[37]. Камітэт міністраў на пасяджэнні 29 верасня 1809 г. адхіліў прапанову міністра ўнутраных спраў аб продажы канфіскаваных маёнткаў і вырашыў перадаваць іх у казённае ведамства, матывуючы тым, што нехта з былых уладальнікаў можа апраўдацца, і тады трэба будзе з вялікімі для казны выдаткамі задаволіць яго[38]. Аляксандр І разлічваў адцягнуць памешчыкаў заходніх губерняў ад французскага імператара перш за ўсё палітычнымі контркрокамі ў “польскім пытанні”. Аднак гэтая дэмагагічная палітыка не мела поспеху. Значная частка шляхты пайшла за Напалеонам і склала марыянетачны адміністрацыйны апарат, арганізаваны французамі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

З набліжэннем расійскіх войскаў многія памагатыя Напалеона спынялі супраціўленне, “каб рэштку свайго маёнтка ўратаваць”[39].

Аляксандр І, кіруючыся ваенна-стратэгічнымі і палітычнымі меркаваннямі, схіляўся “к забвению прощедших заблуждений”[40]. Маніфестам 12 снежня 1812 г. аб'яўлялася дараванне тым, хто вернецца з-за мяжы ў двухмесячны тэрмін, толькі па сканчэнні якога іх маёнткі канфіскоўваліся[41]. Аднак тады “ўваскрашальнік” Польшчы і Вялікага Княства яшчэ не быў канчаткова пераможаны, і немалая колькасць буйных і дробных землеўладальнікаў па-ранейшаму звязвала свае надзеі з яго спробамі павярнуць назад ход ваенных дзеянняў. У выніку, напрыклад, па Мінскай губерні поўнай ці частковай канфіскацыі падлягала каля 84 тыс. сялян мужчынскага полу, з іх 54 187 належалі з'ехаўшаму ў Францыю актыўнаму прыхільніку Напалеона князю Дамініку Радзівілу. Па Гродзенскай і Магілёўскай губернях было вызначана да перадачы ў казну адпаведна 46 370 і 23 378 рэвізскіх душ[42].

Правіламі, складзенымі міністрам фінансаў, прадпісвалася (§ 11): “Сабраўшы сялян па вёсках, аб'явіць ім пры земскай паліцыі, што яны назаўсёды паступаюць у кароннае ведамства і што ва ўсіх выпадках будуць абараняемы нароўні з іншымі казёнными сялянамі”[43]. Маёнткі належыла аддаць у адміністрацыйнае кіраванне, а потым у арэнду, папярэдне выправіўшы інвентары і зменшыўшы павіннасці там, дзе яны вышэй, чым у казённых сялян. Увод у дзеянне правіл усклалі на губернскія камісіі, створаныя яшчэ да вайны для продажу часткі казённых маёмасцей[44]. Між тым маёнткі многіх памешчыкаў вызваляліся ад секвестру асобнымі загадамі. Міністэрства паліцыі ў сакрэтным прадпісанні ад 6 сакавіка 1814 г. забараніла агалошваць § 11 канфіскацыйных правіл, баючыся, што гэта выкліча “непадпарадкаванне ўладальніку, а значыць, цяжкасць і непрыемнасці для ўрада”[45]. Прабыўшы ў складзе дзяржаўных каля года, канфіскаваныя сяляне былі вернуты ранейшым уладальнікам маніфестам ад 30 жніўня 1814 г.[46] “Усяміласцівейшае дараванне” шляхце не скарыстаў Дамінік Радзівіл, бо памёр у Парыжы. На многія з пакінутых ім маёнткаў былі прадстаўлены фальшывыя ці падложныя акты[47]. Абцяжараная даўгамі маёмасць магната стала прадметам заняткаў спецыяльна створанай Радзівілаўскай камісіі і ў асноўным перайшла праз шлюб дачкі Стэфаніі да Вітгенштэйнаў, якія сталі ў XIX ст. самымі буйнымі землеўладальнікамі на Беларусі.

Новая хваля канфіскацый прайшла ў сувязі з паўстаннем 1830 – 1831 гг. Ужо ў ходзе паўстання царскі ўрад нанёс удар па актыўных яго

ўдзельніках шляхам канфіскацыі маёнткаў. Мікалай I ва ўказе Сенату ад 22 сакавіка 1831 г. прадпісваў "недвижимые имения сих преступников брать в казну"[48]. 17 ліпеня 1831 г. зацверджаны "Правілы аб секвестры і канфіскацыі маёнткаў мяцежнікаў", якія былі развіты ў цэлай серыі наступных указаў і распараджэнняў[49]. Сваіх маёнткаў пазбавіліся прадстаўнікі фамілій, якія валодалі тысячамі прыгонных: Агінскія, Плятэры, Праздзецкія, Радзівілы, Сапегі, Чартарыйскія і іншыя. Некаторая частка ўладальнікаў вярнула свае маёнткі паводле указа 4 чэрвеня 1831 г. аб тых, хто з'явіўся з раскайваннем. "Дараванне" атрымалі 43 удзельнікі паўстання ў Літве і заходняй частцы Беларусі, за якіх хадайнічаў віленскі генерал-губернатар кн. М. А. Далгарукаў. Гэтыя "міласці" не распаўсюджваліся на галоўных кіраўнікоў паўстання і асоб, што засталіся за мяжой[50]. На тэрыторыі Беларусі (у цяперашніх межах) у 1837 г. лічыліся канфіскаванымі 115 маёнткаў з 38 544 душамі мужчынскага полу[51]. Больш за ўсё іх было ў Гродзенскай і Віленскай губернях, значна менш – на ўсходзе, дзе паўстанне не атрымала развіцця.

У далейшым выйшаў шэраг указаў аб канфіскацыі маёнткаў у асоб, што былі замешаны па справах эмісараў, якіх засылала ў заходнія губерні шляхецкая эміграцыя. Найбольш вядомым быў пасланы правадыром левага крыла Іаахімам Ляляверем рэвалюцыянер Шыман Канарскі, які нелегальна працаваў тут з 1835 па 1838 г. 30 верасня 1838 г. выйшаў указ аб накладанні секвестру на маёнткі памешчыкаў, звязаных са "справай" Канарскага. Сенат распарадзіўся ўзяць на час следства ў казённы нагляд іх маёнткі[52]. Секвестр быў накладзены на шэраг маёнткаў у Гродзенскай і Мінскай губернях, аднак у ходзе следства выявілася непрыналежнасць гэтых памешчыкаў "да змовы" і таму маёнткі былі ім вернуты[53]. Такое ж секвестраванне маёнткаў ажыццяўлялася і ў 1847 г. у час следства па "справе" эмісара Рэра[54].

У сувязі з паўстаннем 1846 г. у г. Кракаве, які знаходзіўся ў складзе Аўстрыйскай імперыі, для магчымай канфіскацыі былі сабраны звесткі аб маёнтках двайных падданых[55]. Прымаючы папераджальныя меры ў сувязі з рэвалюцыяй 1848 г. у Еўропе, Мікалай I прадпісваў генерал-губернатарам так званага Заходняга краю прыняць "усе неабходныя для захавання грамадскай бяспекі меры", уключаючы неадкладную канфіскацыю маёнткаў у выпадку актыўных дзеянняў шляхты супраць урада[56]. Аднак новага паўстання тут не адбылося,

а маёнткаў удзельнікаў выступленняў у аўстрыйскіх межах, як даносіла ў Пецярбург гродзенскае губернскае праўленне, не выявілася[57].

Адсутнасць значных канфіскацый у перыяд пасля паўстання 1830 – 1831 гг. тлумачыцца зменай ідэйнага зместу і саслоўнага складу грамадскага руху на Беларусі. Чым больш нацыянальная барацьба набывала аграрны характар, тым далей ад яе адыходзілі арыстакраты. "Разважлівейшыя з жыхароў, – адзначалася ў аглядзе III Аддзялення імператарскай канцылярыі і корпуса жандараў па заходніх губернях за 30 – 40-я гг., – ... вядуць сябе асцярожна, не прымаюць удзелу ў зламыснасцях і не даюць ім яўнага ўхвалення; галоўнейшыя ж удзельнікі і кіраўнікі ў змовах ёсць: маладыя дваране, аканомы, дробныя чыноўнікі і іншыя ніжэйшага класа людзі, якія ці яшчэ не ўмеюць цаніць выгад спакойнага жыцця, ці гэтак мала маюць уласнага багацця, што ў выпадку непарадкаў хутчэй могуць набыць, чым згубіць"[58].

У канфіскаваных маёнтках, перайшоўшых у казённае ведамства, захоўваліся ранейшыя арэндныя кантракты. У маёнтках, што знаходзіліся ў агульным уладанні казны і памешчыкаў, па-ранейшаму распараджаліся памешчыкі на вотчынным праве. Адміністратарамі і аканомамі часта прызначаліся сваякі тых асоб, якім маёнткі належалі да канфіскацыі, што выклікала пратэсты сялян[59].

Нявызначанасць становішча, разнароднасць кіравання, паборы ў перыяд ваенных дзеянняў парадзілі гаспадарчы крызіс канфіскаваных маёнткаў. У адносінах Дэпартамента дзяржаўных маёмасцей да віленскага генерал-губернатара 13 лютага 1835 г. указвалася, "што на кіраванне канфіскаванымі маёнткамі ўзніклі скаргі, так як адміністратары, не ведаючы, ці доўга яны прабудуць на сваім месцы, лягчэй папускаюцца на злоўжыванні, маюць менш апекі аб сялянах і павялічваюць выдаткі па кіраванні"[60]. Чыноўнік Львоў, у 1837 г. рэвізаваўшы канфіскаваныя маёнткі Віленскай губерні, убачыў у арандатарах "дзелавітых сельскіх гаспадароў, здабываючых з арэнды сродкі для існавання"[61]. Урад прадпісваў рабіць асобныя захады супраць злоўжыванняў, якія вялі да падзення прыбытковасці канфіскаваных маёнткаў[62]. Важнейшым мерапрыемствам было правядзенне ў канфіскаваных маёнтках люстрацыі, што прадугледжвалася як узор і прыклад для наступнага пераўтварэння дзяржаўнай і памешчыцкай вёскі заходніх губерняў. Практыка яе правядзення ўключала меранне зямель, каб

ліквідаваць цераспалосіцу фальварковых і сялянскіх угоддзяў, улік усіх даходаў маёнткаў, надзяленне зямлёй малазямельных сялян, праверку інвентароў і ўстанаўленне "памяркоўных" павіннасцей. Аднак у выніку люстрацыя не прывяла да істотнага паляпшэння становішча сялян[63].

У заходніх губернях Расійскай імперыі канфіскаваныя маёнткі меркавалася выкарыстаць для ўзмацнення пазіцый царызму ў краі і аслаблення шляхецкага руху. 23 лістапада 1831 г. гродзенскі губернатар М. М. Мураўёў падаў запіску М. А. Далгарукаву, у якой адзначаў, што "рэвалюцыйнасць" шляхты паходзіць ад іх малазямелля і беднасці. "Трываласць манаршага самастойнага кіравання, адзіна карыснага і магчымага ў Расіі, – падкрэсліваў Мураўёў, – немінуча патрабуе некаторага ўмеркаванага ўзвышэння саслоўя дваранства і паставы цвёрдай перашкоды да канчатковага яго збяднення". З гэтай мэтай ён прапаноўваў на аснове населеных канфіскаваных і нават казённых маёнткаў ствараць маяраты і аддаваць іх дваранам на ленным праве[64]. У вышэйшых урадавых колах актыўна выпрацоўваўся такі праект з той толькі розніцай, што гэтыя маяраты павінны былі перадавацца асобам выключна рускага паходжання для складвання надзейнай палітычнай апоры царызму ў краі. 5 сакавіка 1832 г. Камітэт па справах заходніх губерняў прыняў зацверджанае пасля імператарам "Палажэнне аб аддачы канфіскаваных у заходніх губернях маёнткаў расійскім дваранам у стогадовае арэнднае ўладанне ці спадчыннае"[65]. Яны павінны былі аддавацца фальваркамі ці гаспадаркамі з колькасцю сялян ад 300 да 800 душ "для ўзмацнення ліку прыродных расійскіх памешчыкаў".

Аднак рэалізацыя закону аб ленных маяратах, адкладзеная да завяршэння люстрацыі, сутыкнулася з новымі тэндэнцыямі ў сялянскім пытанні. Мікалай I, вымушаны ім займацца, 27 снежня 1837 г. заснаваў асобае Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Міністрам быў прызначаны начальнік V Аддзялення імператарскай канцылярыі ("штаба па сялянскай частцы") генерал-ад'ютант Павел Дзмітрыевіч Кісялёў – прыхільнік абмежавання і лібералізацыі феадальна-прыгонніцкіх адносін, тонкі палітык, які добра разумеў сітуацыю ў так званым Заходнім краі (меў уласны маёнтак на Правабярэжнай Украіне). У запісцы цару "Аб палітычным становішчы паўднёва-заходніх губерняў" (1835) ён сцвярджаў ідэю "апоры на сялян" з мэтай ізаляцыі шляхецкага апазіцыйнага руху, чым кіраваўся ў сваёй практычнай дзейнасці

адносна Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны. Кісялёў разглядаў стварэнне маяратаў у заходніх губернях праз прызму плануемай ім "двуадзінай рэформы" прыгонніцкіх адносін у дзяржаўнай і памешчыцкай вёсцы[66].

Урад не мог не бачыць сялянскія бунты, што ўзрасталі з кожным дзесяцігоддзем перад вызваленнем ад прыгонніцтва. На глебе злоўжыванняў часовых уладальнікаў і адміністрацыі ў канфіскаваных вёсках узнікалі хваляванні. Найбольш значным было выступленне сялян маёнтка Смаргонь Ашмянскага павета (1842 – 1847), канфіскаванага ў графа Праздзецкага. Размах і ўпарты характар іх барацьбы вымушалі ўлады часта ўводзіць воінскія каманды і ажыццяўляць экзекуцыі ў маёнтку. Сюды выязджалі вышэйшыя чыны губернскай адміністрацыі і Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У красавіку 1847 г. у маёнтку было распаўсюджана пісьмо з заклікам да сялян сумесна з мяшчанамі і ніжэйшымі чынамі знішчаць афіцэраў раскватараваных воінскіх часцей, выразаць усіх памешчыкаў і ўпраўляючых, як зрабілі сяляне Галіцыі ў 1846 г., каб здабыць сабе свабоду[67]. Распаўсюджванне заклiку вымусіла многіх памешчыкаў Ашмянскага, Вілейскага і Дзісенскага паветаў спешна выехаць у Вільню. Пад уплывам падзей у Смаргоні адбыліся хваляванні дзяржаўных і памешчыцкіх сялян. Уводам войскаў закончылася выступленне ў канфіскаваным маёнтку Войстам Свянцянскага павета. У тым жа павеце была забіта сялянамі памешчыца Зейферт. Губернскія ўлады прыбеглі да надзвычайных мер, каб справіцца з сітуацыяй. Аўтарам "возмутительного воззвания" аказаўся дробны чыноўнік шляхціц Юльян Бакшанскі. Як паказала следства, ён адначасова пасылаў лісты ў некалькі паветаў, збіраўся даць смаргонскім сялянам значную суму грошай для зброі і пашырыць сялянскі рух аж да Вільні з мэтай забойства губернатара і генерал-губернатара[68]. У выніку смаргонскага выступлення памешчыкі ўбачылі для сябе небяспеку знішчэння ад рук уласных прыгонных, а царызм апынуўся перад пагрозай зліцця сялянскай барацьбы з агульнадэмакратычным рухам у краі.

У 1837 – 1839 гг. Кісялёў, даследаваўшы становішча канфіскаваных маёнткаў, прыйшоў да высновы, што план стварэння маяратаў не можа быць паспяхова ажыццёўлены па прычыне раздробленасці ўладанняў. Ён прыняў энергічныя меры да адмены гэтага плана. Супраць курсу Кісялёва рашуча выступілі кіеўскі Дз. Г. Бібікаў і віленскі Ф. Я. Міркавіч генерал-губернатары, якія патрабавалі не-

адкладнай перадачы канфіскаваных і нават усіх арэндных казённых маёнткаў “карэнным рускім дваранам у выглядзе маяратаў”. Ажыццяўленне гэтых патрабаванняў прывяло б да ліквідацыі дзяржаўных сялян у заходніх губернях за кошт паглынання іх памешчыцкай вёскай. У ходзе разгорнутай палемікі Кісялёў пераканаў Мікалая I, што стварэнне маяратаў, акрамя выдаткаў казны, выкліча ўсеагульнае абурэнне сялян і падарве іх “прывязанасць да ўрада”[69]. Указ 23 чэрвеня 1846 г. залічваў у склад дзяржаўных маёмасцей усе канфіскаваныя маёнткі, у тым ліку і тыя, што адводзіліся пад маяраты і паступалі з пажыццёвага, застаўнога і непадзельнага ўладання. Сяляне канфіскаваных маёнткаў, па меры паступлення ў казну, пераводзіліся на аброк “з распаўсюджваннем на іх існуючых у Зводзе законаў пастаноў аб дзяржаўных сялянах ва ўсёй іх сіле”[70].

Многія канфіскаваныя маёнткі былі абцяжараны значнымі даўгамі, што зрабілі іх ранейшыя ўладальнікі. На аснове зацверджаных 28 чэрвеня 1832 г. правіл ліквідацыі даўгоў канфіскаваных маёнткаў у губернях ствараліся спецыяльныя ліквідацыйныя камісіі[71]. Гэтая аперацыя зацягнулася на цэлае трыццацігоддзе, даўгі ўплочваліся з даходаў канфіскаваных маёнткаў і, значыць, усім сваім цяжарам кладліся на сялян[72].

У 30 – 50-х гг. урад праводзіў аперацыю па выдзяленні ў казну маёнткаў і сялян, што знаходзіліся ў агульным уладанні з памешчыкамі. Гэтымі справамі займаліся ліквідацыйныя камісіі і земскія суды, прымаліся розныя пастановы, але ў цэлым былі зроблены значныя ўступкі прыватным уладальнікам, якія імкнуліся пакінуць сабе лепшыя землі і пабольш сялян[73]. 7 снежня 1844 г. Кісялёў, звяртаючыся да Міркавіча, прадпісваў старацца купляць у памешчыкаў пры раздзеле невялікія часткі маёнткаў, але гэта аказалася цяжкай задачай, і выдзяленне ішло паволі, што выклікала незадавальненне сялян, зацікаўленых хутчэй перайсці ў казённае ведамства. На 18 лютага 1845 г. аказалася, што з нераздзеленых маёнткаў па Віленскай губерні выдзелена душ мужчынскага полу 563, у часовым уладанні памешчыкаў заставалася 1150. Па Мінскай губерні выдзелена 731 і заставалася 1548, па Гродзенскай – адпаведна 1285 і 2321[74]. Разбор спраў аб выдзеле гэтых сялян зацягнуўся да 1861 г.

Пастаянны рэзерв змяншэння прыватнаўласніцкіх сялян склалі прыгонныя маёнткаў, што знаходзіліся ў пажыццёвым уладанні бацьк-

коў, чые дзеці ўдзельнічалі ў паўстанні. Апошнія пазбаўляліся спадчыны шляхам накладання казённых забарон на маёнткі ці часткі іх. Такіх "мяцежнікаў" толькі ў адной Гродзенскай губерні лічылася 76 чалавек[75]. Перавод маёмасцей паўстанцаў у склад дзяржаўных быў спынены паводле ўказа Сената 6 снежня 1862 г. "Аб вызваленні ад канфіскацыі не паступіўшых да гэтага часу ў казну маёнткаў і капіталаў, належаўшых асобам, асуджаным за палітычныя злачынствы"[76].

Падводзячы вынік вышэйпададзенаму, трэба адзначыць, што калі ў 30-х гг. кіруючыя колы, у тым ліку і Кісялёў, праводзілі прадваранскую лінію, плануючы такія мерапрыемствы, як устанаўленне маяратаў, продаж канфіскаваных маёнткаў для пагашэння даўгоў, продаж асобных сялян суспадчыннікам[77], то ў 40 – 50-х гг., пры практычным ажыццяўленні пераводу канфіскаваных маёмасцей у склад дзяржаўных, пазіцыя ўрада значна радыкалізавалася. Прычына такой эвалюцыі – колькасны і якасны рост сялянскага і грамадска-палітычнага руху.

Скарачэнне зямельнай уласнасці шляхты на Беларусі адбывалася не толькі з прычыны іх актыўнага ўдзелу ў антыцарскім грамадска-палітычным руху, але і ў сувязі з нарастаннем, ужо ў маштабах усёй імперыі, тэндэнцыі да захавання і пашырэння казённых маёнткаў. Гэтая тэндэнцыя адпавядала інтарэсам казны як уласніка і свядома насаджалася Міністэрствам дзяржаўных маёмасцей, сур'ёзна зацікаўленым у пашырэнні сферы прымянення рэформы П. Дз. Кісялёва. У 30 – 50 гг. XIX ст. у пэўных урадавых колах нават выношвалася ідэя пераводу ўсіх прыватнаўласніцкіх прыгонных у казённае ведамства як шлях вырашэння сялянскага пытання[78]. Ва ўсякім разе, Міністэрства дзяржаўных маёмасцей трымала пад кантролем усе магчымасці і крыніцы папаўнення гэтых маёмасцей (адпісанне ў казну памешчыцкіх маёнткаў за даўгі, з-за адсутнасці спадчыннікаў ці шляхам куплі).

Несумненна, канфіскацыі ці пазбаўленне іншымі шляхамі ўладальнікаў ад маёнткаў падрывалі эканамічную, а ў выніку і палітычную магутнасць шляхты на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Як канстатаваў мемуарыст Эдвард Паўловіч, "закрыццё універсітэта ў Вільні, брак тэхнічных школаў, канфіскацыя вялікай колькасці маёнткаў за ўдзел у паўстанні спустошылі Літву духова і матэрыяльна"[79]. Аднак у цэлым памешчыцкія сяляне, нягледзячы на зніжэнне ўдзель-

най вагі (з 1796 па 1851 г. на 11,3 %), не страцілі сваёй абсалютнай дамінацыі ў саслоўнай структуры сялянства Беларусі, перавышаючы ўсе астатнія разам узятыя разрады больш чым у 3 разы (гл. табл. 1).

*Табліца 1*[80]

**Колькасць і ўдзельная вага асноўных груповак сялян на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.**

| Разрад сялян | V рэвізія (1794 –1808) | | VII рэвізія (1815 – 1825) | | VIII рэвізія (1833 – 1835 – 1851) | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | душ м. п. | % | душ м. п. | % | душ м. п. | % |
| Памешчыцкія | 974 862 | 87,0 | 841 365 | 80,9 | 994 793 | 75,7 |
| Дзяржаўныя | 83 502 | 7,5 | 122 426 | 11,8 | 270 990 | 20,6 |
| Царкоўныя і манастырскія | 38 668 | 3,5 | 56 314 | 5,4 | 5082 | 0,4 |
| Вольныя | 22 935 | 2,0 | 9131 | 0,9 | 32 127 | 2,5 |
| Іншыя | - | - | 10 184 | 1,0 | 10 847 | 0,8 |
| *Усяго* | 1 119 967 | 100 | 1 039 420 | 100 | 1 313 839 | 100 |

* * *

У саслоўна-сацыяльных адносінах памешчыцкія (панскія) сяляне заставаліся найбольш бяспраўнай часткай сельскага насельніцтва. Іх асоба, праца, маёмасць – усё належала ўладальнікам, якія самі ці пры дапамозе арандатараў і адміністратараў чынілі над імі суд і расправу. Прыгонных прадавалі і закладвалі, дарылі і абменьвалі на любую рэч, ссылалі без суда на катаргу, білі розгамі. Архівы захавалі нямала актаў аб продажы людзей паасобку і сем'ямі, дарослых і дзяцей, мужчын і жанчын, з зямлёй і без зямлі[81]. Самавольства памешчыкаў практычна нічым не абмяжоўвалася, бо сялянам забаранялася падаваць на іх скаргі царскай адміністрацыі. Нават прадстаўнікі гэтай адміністрацыі прызнавалі, што пераважная маса памешчыкаў "прымае селяніна як рэчавы пачатак да набыцця магчыма большых выгод"[82]. Таму асноўным абавязкам прыгонных было выкананне на карысць памешчыка розных павіннасцей, замацаваных у інвентарах, якія складаліся і рэгулярна пераглядаліся самімі

ўладальнікамі. Акрамя таго, на плечы сялян кладіся дзяржаўныя падаткі, рэкруцтва і розныя грамадскія работы.

Панскае самаўладства, якое даводзіла сялян да апошняй рысы беднасці і бяспраўя, сялянскі рух у адказ вымушалі царскі ўрад прымаць захады, каб змякчыць адносіны паміж сялянамі і іх уладальнікамі ў рамках феадальна-прыгонніцкай сістэмы. 23 сакавіка 1818 г. выйшаў указ па выніках праверкі становішча сялян Мазырскага павета, які распаўсюджваўся "на ўсю Мінскую і на іншыя ад Польшчы здабытыя губерні". Указ абавязваў памешчыкаў і адміністратараў наглядаць за станам гаспадаркі сялян і не патрабаваць ад іх выканання павіннасцей звыш вызначаных інвентарамі. Забаранялася прымяняць "жорсткія пакаранні", скасоўваліся абмежаванні продажу сялянамі прадуктаў сваёй гаспадаркі, абмяжоўвалася іх залежнасць ад ліхвяроў-карчмароў[83]. Асаблівая ўвага ў заканадаўстве звярталася на Віцебскую і Магілёўскую губерні, дзе больш востра стаяла пытанне аб сялянскім харчаванні і нядоімках казённых плацяжоў[84]. 29 мая 1835 г. цар зацвердзіў рашэнне Дзяржаўнага савета "Аб аддачы беларускімі памешчыкамі сялян іх па найме ў земляныя і іншыя чорныя работы"[85]. У ім абмяжоўваліся магчымасці памешчыкаў здаваць сялян па найме (не больш паловы работнікаў, узрост ад 20 да 48 гадоў), агаворваліся ўмовы (заключэнне кантракту з вызначэннем аплаты як памешчыку, так і сялянам; колькасць рабочых дзён і іх працягласць; быт і харчаванне працуючых). Аднак на практыцы ўсе гэтыя ўрадавыя распараджэнні былі малаэфектыўнымі.

Найбольш радыкальным крокам царскага ўрада ў памешчыцкай вёсцы з'явілася правядзенне так званай інвентарнай рэформы. Традыцыя складання інвентароў – вопісаў феадальных уладанняў – існавала на Беларусі яшчэ з XVI ст. У інвентары ўладальнікі ўносілі звесткі аб межах маёнтка, даходах насельніцтва, фіксавалі памеры сялянскіх надзелаў і павіннасцей.

Інвентарная рэформа пачала ажыццяўляцца на падставе закона ад 15 красавіка 1844 г. Яе сутнасць зводзілася да рэгулявання памераў надзелаў і павіннасцей памешчыцкіх сялян і да замацавання іх гранічных узроўняў у абавязковых не толькі для сялян, але і для памешчыкаў інвентарах. Гэтым практычна займаліся губернскія інвентарныя камітэты, што складаліся з царскіх чыноўнікаў і прадстаўнікоў мясцовага

дваранства. Абавязковыя інвентары былі ўведзены ва ўсіх памешчыцкіх маёнтках заходняга і цэнтральнага рэгіёнаў Беларусі і ў частцы маёнткаў на ўсходзе Беларусі. Фактычна была нададзена сіла закона тым павіннасным адносінам, якія рэальна склаліся. Рэформа выклікала супраціўленне памешчыкаў і нараканні сялян там, дзе павіннасці аказаліся завышанымі. Таму ўрад некалькі разоў мяняў падыходы да яе правядзення. Перагляд і выпраўленне інвентароў цягнуліся да 1857 г., калі пачалася падрыхтоўка да адмены прыгоннага права. Нягледзячы на прыгонніцкую абмежаванасць інвентарнай рэформы, яе непаслядоўнасць і незавершанасць, абавязковыя інвентары афіцыйна ставілі мяжу памешчыцкай уладзе і адкрывалі некаторыя легальныя магчымасці для адстойвання сялянамі сваіх інтарэсаў[86].

Разам з тым дзяржаўная вёска ў выніку пераўтварэнняў, праведзеных у 1840 – 1856 гг. П. Дз. Кісялёвым, прываблівала прыватнаўласніцкіх сялян лягчэйшымі павіннасцямі і шырэйшымі правамі. Сучаснікі адзначалі вялікі ўплыў на сацыяльна-палітычную абстаноўку ў вёсцы самога факта заснавання Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У гэтым "прыватнаўласніцкія сяляне бачылі ... жаданне ўрада збавіць іх ад улады памешчыкаў"[87]. "...Прыгонныя сяляне, – паведамляў міністр Кісялёў цару Мікалаю I, – маючы перад вачыма здавальняючае становішча старосцінскіх сялян і адчуваючы нядобразычлівасць да памешчыкаў, не перастаюць думаць і спадзявацца на далучэнне іх да масы дзяржаўных сялян..."[88]

Барацьба прыватнаўласніцкіх сялян за пераход у разрад дзяржаўных, якая ў адрозненне ад Расіі не мела на Беларусі вялікага значэння аж да канца 30-х гг. XIX ст., набыла актыўнасць з пачаткам правядзення рэформы дзяржаўнай вёскі. Сталі частымі хадайніцтвы аб вызваленні ад "незаконнага" завалодання памешчыкамі. Выступленні з патрабаваннямі пераводу ў казённае ведамства адбыліся ў маёнтку Вышадкі Суражскага павета (1832 – 1835), сяле Вайткевічы Ваўкавыскага (1841 – 1845), весцы Стайкі Быхаўскага (1845), мястэчку Дрыбін Чавускага (1845 – 1847), маёнтку Мохава Быхаўскага (1852), вёсцы Кацельня Брэсцкага (1851 – 1854) паветаў. Найбольш значнымі былі хваляванні прыгонных графаў Патоцкіх у маёнтку Быцень Слонімскага павета (1856 – 1858).

На парозе адмены прыгоннага стану сяляне пераходзілі ад усепадданейшых просьбаў да прамых і рашучых патрабаванняў. Як даносіў

14 студзеня 1857 г. міністру ўнутраных спраў мінскі губернатар, сяляне маёнтка Капцэвічы Мазырскага павета заявілі земскаму спраўніку і дваранскаму прадвадзіцелю, "што не хочуць быць памешчыцкімі.., а жадаюць быць царскімі" на той падставе, "што ўлада памешчыцкая ў цяперашні час мізэрная і што яны маюць права адмовіцца ад такой і шукаць сабе іншага ўладальніка"[89]. Для ўціхамірвання сялян запатрабавалася ўмяшанне інваліднай каманды ў складзе 30 салдат і двух афіцэраў[90]. Праз паўгода падобную каманду з 5 афіцэраў і 50 салдат прыйшлося паслаць барысаўскім павятовым уладам у маёнтак Глівін памешчыкаў Свідаў, сяляне якіх заявілі, "што памешчыцкімі не будуць, а разлічваюць быць казёнымі"[91]. У 1860 г. абвясцілі, што жадаюць быць казёнымі і адмовіліся выконваць паншчыну прыгонныя графа Мастоўскага ў Вілейскім павеце. Прычыны – самавольныя перасяленчыя мерапрыемствы і непрытрымліванне інвентарных павіннасных нормаў. У маёнтак быў уведзены воінскі пастой, "падбухторшчыкі" аднадворац Тулайкоўскі і двое сялян арыштаваны[92]. Двойчы даводзілі Аляксандру II сваё старосцінскае паходжанне сяляне вёскі Кульбакі Лідскага павета, паколькі лічылі далей немагчымым жыць пад уладай памешчыка Падгурскага[93]. "Не хочам больш пана, хочам казёншчыны!" патрабавалі, узяўшыся за тапары супраць мясцовых улад, прыгонныя Вайніловіча ў Копыскім павеце[94]. Аднак у канцы 50 – пачатку 60-х гг. выступленні памешчыцкіх сялян за перавод у дзяржаўныя ў асноўным спыняюцца. Сам стан апошніх, падарваны новымі пераўтварэннямі міністра М. М. Мураўёва, ужо не адпавядаў тым ідэалам свабоды, якія выпрацаваў сялянскі і грамадскі рух часоў адмены прыгоннага права. Рэформа 1861 г. у памешчыцкай вёсцы, з аднаго боку, і контррэформа 1857 – 1862 гг. у дзяржаўнай – з другога, ліквідавалі рух памешчыцкіх сялян на Беларусі за пераход у казну.

Рух прыватнаўласніцкіх сялян за пераход у разрад дзяржаўных не быў накіраваны супраць феадальнага ладу, а толькі ставіў задачу палепшыць іх становішча ў існуючых рамках. Разам з тым у сістэме "дзяржаўнага феадалізму" пасля рэформы Кісялёва былі створаны лепшыя ўмовы для развіцця таварна-грашовых адносін і разгортвання гаспадарчай ініцыятывы сялянства. Значыць, пераход пад уладу казны, за які змагаліся прыгонныя памешчыцкіх і духоўных вотчын, адлюстроўваў прагрэсіўную тэндэнцыю ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай вёскі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

[1] Дворянская империя XVIII века (основные законодательные акты). М., 1960. С. 155 – 156.

[2] Гл.: НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 549, арк. 2; Свод законов гражданских и межевых. Спб., 1842. Ч. 1. С. 86.

[3] Гл.: РДАСА, ф. 248, воп. 65, спр. 5742, арк. 677; Статут Великого княжества Литовского. Спб., 1811. С. 11 – 18, 142 – 144.

[4] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 32.

[5] РДАСА, ф. 12, спр. 160, арк. 105.

[6] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 41 – 43.

[7] *Ючас М. А.* Литовская шляхта и царизм в XVIII в. // Феодальная Россия во всемирно-историческом процессе. М., 1972. С. 410.

[8] *Цеханавецкі А.* Міхал Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме. Мн., 1993. С. 47.

[9] *Дашкова Е. Р.* Записки // Литературные сочинения. М., 1990. С. 182.

[10] Сборник императорского Русского исторического общества (далей – Сб. РИО). Спб., 1875. Т. 16. С. 286.

[11] Русский архив. 1873. Кн. 2. Стб. 2288.

[12] *Рябинин И. С.* Некоторые данные для характеристики настроения белорусского общества в эпоху Четырехлетнего сейма 1788 – 1792 гг. // Чтения в императорском Обществе истории и древностей российских (далей – ЧОИДР). 1913. Кн. 2. Отд. 5. С. 37.

[13] Сб. РИО. Спб., 1904. Т. 118. С. XXX, 406 – 407.

[14] Архив Виленского генерал-губернаторства, издаваемый Андреем Энгелем. Вильна, 1870. Стб. 103.

[15] Воспоминания князя Станислава Понятовского // Русская старина. 1898. Т. 95. № 9. С. 577.

[16] Архив Государственного совета. Спб., 1869. Т. 1. Стб. 980.

[17] Гл.: ПСЗ-І. Т. 23, № 17329.

[18] Сб. РИО. Т. 16. С. 190.

[19] РДАСА, ф. 16, спр. 244, арк. 38 – 38 адв., 169 адв. – 170 адв.

[20] Падлічана па даных: ДГА Літвы, ф. 1219, воп. 1, спр. 38, арк. 97 – 100; спр. 408, арк. 3, 10, 23. Населенасць сельскага дыма складала ў сярэднім 7 чалавек абодвух полаў (*Карпачев А. М., Козловский П. Г.* Динамика численности населения Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1968 г. Л., 1972. С. 84).

[21] Русский архив. 1873. Кн. 2. Стб. 2297 – 2298.

[22] Политический журнал. 1795. Ч. 3. Кн. 3. С. 123.

[23] *Татищев С. С.* Князь Адам Чарторыйский // Из прошлого русской дипломатии. Спб., 1890. С. 162 – 183.

[24] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 37.

[25] ПСЗ-І. Т. 23. № 17199.

[26] Собрание трактатов и конвенций, заключенных Россией с иностранными державами. Спб., 1875. Т. 2. С. 297 – 298.

[27] *Жукович П. Н.* Сословный состав населения... // Журнал Министерства народного просвещения. 1915. № 5. С. 137 – 140.

[28] ПСЗ-І. Т. 24. № 17585.

[29] ЦДГА Украіны ў Кіеве, ф. 533, воп. 1, спр. 1560, арк. 1 – 3; Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 114 – 115.

[30] РДГА, ф. 1374, воп. 1, спр. 352, арк. 3 – 3 адв.

[31] *Немцевич Ю.* Заметки о моем заключении в Санкт-Петербурге в 1794, 1795 и 1796 гг. // Русский вестник. 1895. Т. 240. № 9. С. 120.

[32] ЦДГА Украіны ў Кіеве, ф. 533, воп. 1, спр. 1553, арк. 48 – 51.

[33] *Козловский П. Г.* Землевладение и землепользование... С. 115.

[34] Русский архив. 1873. Кн. 2. Стб. 2289 – 2290.

[35] ПСЗ-І. Т. 30. № 23806, 23893, 24035; Т. 31. № 24105.

[36] Журналы Комитета министров. 1810 – 1812 гг. Спб., 1891. Т. 2. С. 43.

[37] Журналы Комитета министров. 1802 – 1810 гг. Спб., 1888. Т. 1. С. 408.

[38] РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 104, арк. 64 – 64 адв.; ф. 1263, воп. 1, спр. 14, арк. 206 адв.

[39] Письма главнейших деятелей в царствование императора Александра I. Спб., 1883. С. 71.

[40] Сборник исторических материалов, извлеченных из Архива собственной е. и. в. канцелярии (далей – Сб. ИМ). Спб., 1889. Вып. 2. С. 188.

[41] ПСЗ-І. Т. 32. № 25289; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 1, спр. 273.

[42] Падлічана па даных: РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 104, арк. 200, 261 – 272; ДГА Літвы, ф. 378, 1813 г., спр. 52, ч. 1, арк. 303 – 321.

[43] РДГА, ф. 1263, воп. 1, спр. 45, арк. 112 адв. – 113; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 1, спр. 206, арк. 5.

[44] ПСЗ-І. Т. 32. № 25470.

[45] ДГА Літвы, ф. 378, 1813 г., спр. 52а, ч. 2, арк. 718.

[46] РДГА, ф. 384, воп. 1, спр. 203, арк. 71; ПСЗ-І. Т. 32. № 25481, 25671.

[47] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 1, спр. 269; Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года. Спб., 1912. Т. 3: Белоруссия в 1812 году. С. 82 – 84.

[48] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 4. С. 88 – 89.

[49] ПСЗ-ІІ. Т. 6. № 4711; Постановления, относящиеся до конфискации имений польских мятежников (1831). Спб., 1868.

[50] ПСЗ-ІІ. Т. 6. № 4624, 4848; Т. 7. № 5637; Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 362 – 363; ЧОИДР. 1864. Кн. 1. С. 179 – 180.

[51] Падлічана па даных: РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 2043, арк. 9 – 17; ДГА Літвы, ф. 378, 1830 г., спр. 598, арк. 328.

[52] ДАРФ, ф. 109, воп. 3, спр. 533, арк. 41 – 42; ПСЗ-ІІ. Т. 13. № 11572; Т. 14. № 12964; Государственные преступления в XIX в. в России. Б.м., 1906. С. 103.

[53] НГА Беларусі ў Мінску, ф. 333, воп. 24, спр. 204; воп. 25, спр. 95; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 31, воп. 2, спр. 175.

[54] ДАРФ, ф. 109, 1 экспедыцыя, 1846 г., спр. 2, ч. 1, арк. 1 – 6, 74, 82 – 84; воп. 223, спр. 11, арк. 7а, 114, 122 – 123; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 21, спр. 411.

[55] ДГА Літвы, ф. 378, 1846 г., спр. 2040.

[56] Русская старина. 1884. № 1. С. 154 – 159; Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 4. С. 139 – 141.

[57] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 31, воп. 2, спр. 666, арк. 1 – 2, 29.

[58] ДАРФ, ф. 109, воп. 3, спр. 533, арк. 38 – 38 адв.

[59] Гл.: *Неупокоев В. И.* Крестьянский вопрос в Литве во второй трети XIX в. М., 1976. С. 36; ДГА Літвы, ф. 378, 1831 г., спр. 167, арк. 194 – 195; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 796.

[60] ДГА Літвы, ф. 378, 1830 г., спр. 598, арк. 251.

[61] Русский архив. 1885. № 1. С. 48.

[62] НГА Беларусі ў Мінску, ф. 1297, воп. 1, спр. 5445; спр. 7525, арк. 2 – 3, 10; ДГА Літвы, ф. 378, 1831 г., спр. 167, арк. 192; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 739.

[63] Гл.: *Неупокоев В. И.* Новые данные о Секретном комитете 1835 года "О новом устройстве управления казенных крестьян" // Материалы по истории сельского хозяйства и крестьянства СССР. М., 1980. Сб. 9. С. 184 – 198.

[64] ДГА Літвы, ф. 378, п/а (палітычны аддзел), 1832 г., спр. 19, арк. 1 – 6.

[65] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 350 – 353.

[66] *Неупокоев В. И.* Позиция П. Д. Киселева... // Из истории экономической и общественной жизни России. М., 1976. С. 71.

[67] *Чепко В. В.* Общественно-политическое движение в Белоруссии в 40-е гг. XIX в. // Тр. Ин-та истории АН БССР. Мн., 1958. Вып. 3. С. 123 – 124.

[68] *Конохова Т. А.* Крестьянское движение в государственной деревне Виленской и Ковенской губерний в период реформы П. Д. Киселева // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1966 г. Таллин, 1971. С. 415 – 418.

[69] *Неупокоев В. И.* Позиция П. Д. Киселева... С. 61 – 71.

[70] ДГА Літвы, ф. 378, 1846 г., спр. 2000, арк. 1 – 3.

[71] ПСЗ-II. Т. 7. № 5468; ДГА Літвы, ф. 378, 1830 г., спр. 598, арк. 42 – 49.

[72] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 5, воп. 1, спр. 2, арк. 2; спр. 61; ф. 31, воп. 8, спр. 6.

[73] *Неупокоев В. И.* Крестьянский вопрос в Литве... С. 80 – 83.

[74] ДГА Літвы, ф. 378, 1844 г., спр. 1527, арк. 1 – 2, 29.

[75] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 31, воп. 2, спр. 123, арк. 1 – 3, 70, 184, 223, 276 – 281; ДГА Літвы, ф. 378, 1831 г., спр. 434, арк. 2.

[76] Журнал Министерства государственных имуществ. 1862. № 12. С. 165 – 166.

[77] Гл.: *Неупокоев В. И.* Крестьянский вопрос в Литве... С. 63 – 64, 77, 80.

[78] Гл.: *Семевский В. И.* Крестьянский вопрос в России в XVIII и первой половине XIX века. Спб., 1888. Т. 2. С. 445 – 446, 449 – 450, 460; *Богословский М. М.* Государственные крестьяне при Николае I // История России в XIX веке. Спб., 1907. Т. 1. С. 255.

[79] *Паўловіч Э.* Наваградак у першай палове XIX стагодзьдзя // Спадчына. 1994. № 6. С. 121.

[80] *Королева Е. Г.* Численность и структура сельского населения Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. // Сельское хозяйство и крестьянство Беларуси (Материалы науч. конф., 27 – 29 окт. 1989 г., г. Гомель). Мн., 1991. С. 123 – 124; Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Мн., 1997. Т. 1. С. 275 – 276.

[81] Гл.: *Сушынскі Я.* Аб гандлі людзьмі на Магілёўшчыне // Магілёўшчына. Магілёў, 1927. Т. 1. С. 35 – 43.

[82] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 247.

[83] ПСЗ-І. Т. 35. № 27316.

[84] ПСЗ-І. Т. 37. № 28778; Т. 38. № 29232, 29418; Т. 39. № 29858, 30086 і інш.

[85] ПСЗ-ІІ. Т. 10. № 8187.

[86] Гл.: *Улащик Н. Н.* Введение обязательных инвентарей в Белоруссии и Литве // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1958 г. Таллин, 1959. С. 256 – 277.

[87] Эпоха Николая І. М., 1911. С. 161.

[88] *Заблоцкий-Десятовский А. П.* Граф П. Д. Киселев и его время. Спб., 1882. Т. 4. С. 158.

[89] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 4. С. 257.

[90] РДВГА, ф. 395, воп. 293, 1857 г., спр. 170, арк. 37 – 37 адв.

[91] *Тамсама,* арк. 219 – 219 адв.; Крестьянское движение в России в 1857 – мае 1861 гг.: Сб. документов. М., 1963. С. 61 – 63, 105 – 106.

[92] ДАРФ, ф. 109, 4 эксп., 1860 г., спр. 230, арк. 2.

[93] Крестьянское движение в России в 1857 – мае 1861 гг. С. 259 – 261, 538.

[94] ДАРФ, ф. 109, воп. 3, спр. 1923, арк. 8, 12.

# Глава 2

## РАЗДАЧЫ І ПАПАЎНЕННІ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВЁСКІ

Дзяржаўныя сяляне вядомы на Беларусі яшчэ з часоў Вялікага княства Літоўскага. Аграрная рэформа Жыгімонта II Аўгуста (так званая валочная памера), што ажыццяўлялася з сярэдзіны XVI ст., прывяла да канчатковага замацавання ў якасці дзяржаўных прыгонных самых разнастайных катэгорый (былых вольных сялян-абшчыннікаў, чэлядзі нявольнай, сялян-слуг), якія пражывалі на землях, што належалі вялікаму князю як носьбіту дзяржаўнай улады. У 1590 г. велікакняжацкі дамен быў падзелены на староствы і эканоміі. Эканоміі – буйныя феадальныя гаспадаркі – прызначаліся для задавальнення патрэб двара (стала) і знаходзіліся пад непасрэдным кіраваннем каралеўскай адміністрацыі. Маса пераважна драбнейшых гаспадарак – старостваў, што заставаліся ў казённым ведамстве, аддаваліся ва ўтрыманне шляхціцам, радзей – здаваліся ў арэнду. Уласнасць тых і другіх маёнткаў пры гэтым захоўвалася за дзяржавай.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай расійскі ўрад асцярожна праводзіць цэнтралісцкую аб'яднальную палітыку, імкнучыся на занятых землях да ўстанаўлення адзінай з усёй імперыяй структуры грамадства. У "высочайше" зацверджаным 13 верасня 1772 г. дакладзе беларускага генерал-губернатара графа З. Чарнышова вызначалася: "Вёскі, якія належаць каралю, прылічыць да дварцовых валасцей; царкоўныя, што адыходзяць ад уладання тых, якія за граніцай застаюцца і... ў казённае ведамства ўступаюць, да эканамічных, а іншыя староствы пакінуць пад іх назвай"[1]. Казённым палатам, што былі створаны згодна з "Учреждением для управления губерний" 1775 г., даручалася весці нагляд за маёнткамі з дзяржаўнымі сялянамі. У першай трэці XIX ст. іх галоўным начальнікам з'яўляўся міністр фінансаў.

Самым буйным феадальным уладаннем на тэрыторыі першага падзелу была ўтвораная ў 1589 г. Магілёўская эканомія. Яна знаходзілася пераважна ў загадванні каралеўскай адміністрацыі (Магілёўскага замка). У склад эканоміі ўваходзілі тры гарады (Магілёў, Чавусы, Чэрыкаў) і больш двухсот вёсак. Паводле даных на 1772 г., сялян у эканоміі налічвалася 25 063 душы мужчынскага полу. Полацкая і Віцебская эканоміі, якія да гэтага часу аддаваліся ваяводам у якасці

кармлення, былі значна меншыя па памерах, колькасць сялянскага насельніцтва ў іх была адпаведна 8875 і 1396 душ мужчынскага полу[2].

У былых каралеўскіх эканоміях быў праведзены перапіс насельніцтва. Яны ўвайшлі ў склад дварцовых (удзельных з 1797 г.) маёнткаў, што належалі непасрэдна імператарскай фаміліі. Да дварцовых далучылі і самае буйное са староства – Крычаўскае[3], у якім налічвалася 146 вёсак і 11 717 душ сялян мужчынскага полу.

Сярод староства, што засталіся ў складзе дзяржаўных уладанняў, выдзялялася некалькі буйных, у кожным з якіх налічвалася звыш 3500 душ сялян мужчынскага полу. Гэта Веліжскае, Гомельскае, Езярыцкае, Усвяцкае, Прапойскае, Чачэрскае староствы. Найбольшая колькасць старостваў знаходзілася ў Мсціслаўскай правінцыі, а старосцінскіх вёсак і сялян – у Віцебскай. Усяго ў 117 старостваў усходняй часткі Беларусі (уключна з Крычаўскім) мелася 2503 вёскі, у якіх у 1773 г. пражывала 103 915 сялян мужчынскага полу[4].

Па другім падзеле Рэчы Паспалітай у склад Расіі ўвайшла цэнтральная частка Беларусі. Камандуючаму расійскімі войскамі генералу П. Крачэтнікаву царскім указам ад 8 снежня 1792 г. было аб'яўлена: "Каронны даход польскі ідзе ў казну нашу. Вы падзяліце памешчыцкія вёскі на два разрады: 1) спадчынныя, 2) пажыццёва ці за кіраванне на чыны дадзеныя, як то староствы і іншыя таму падобныя, якога б звання ні былі"[5].

На тэрыторыі Мінскай губерні мелася 37 335 мужчынскага і 35 718 жаночага полу старосцінскіх сялян, а на тэрыторыях, якія былі ўключаны ў склад суседніх губерняў, адпаведна 4380 і 4166[6]. У лік старосцінскіх маёнткаў увайшла і Пінская каралеўская эканомія (3995 душ мужчынскага полу), часовы ўладальнік якой вялікі гетман ВКЛ Міхал Агінскі заставаўся за мяжой. Буйнейшымі староствамі, у якіх налічвалася больш 250 дымоў, былі Бабруйскае, Барысаўскае, Любоніцкае, Мазырскае, Радашковіцкае, Рэчыцкае, Рагачоўскае, Якімовіцкае. Аднак большая частка дзяржаўных сялян пражывала ў раскіданых па ўсёй тэрыторыі Мінскай губерні невялікіх староствах, якія рэдка перавышалі 50 дымоў[7].

На тэрыторыі заходняй часткі Беларусі знаходзіліся буйныя сталовыя эканоміі, што ўваходзілі ў адміністрацыйнае і гаспадарчае ўпраўленне каралеўскага скарбу. Гэта Брэсцка-Кобрынская эканомія, якая размяшчалася на 5744 валоках зямлі з насельніцтвам 24 016 асоб муж-

чынскага полу і 22 016 жаночага полу, і Гродзенская, якая мела 7294 валокі зямлі, 22 538 асоб мужчынскага полу і 19 842 асобы жаночага полу[8]. Гэтыя эканоміі ўяўлялі сабой складаны гаспадарчы арганізм, які дзяліўся на ключы (ключ – частка буйнога ўладання, якая складала асобную гаспадарчую адзінку), войтаўствы, фальваркі, лясніцтвы, уключаў мноства вёсак, шэраг гарадоў і мястэчак. Невялікія Лідская і Слонімская эканоміі да гэтага часу знаходзіліся ў становішчы старостваў.

Сярод староставаў тут выдзяляліся Барцянскае, Васіжышскае, Валпеніцкае, Даўгелійскае, Камянец-Літоўскае, Сакалоўскае і Здзітаўскае, Шарашэўскае, Ялоўскае, войтаўства Дрэйскае, Заснудскае і Перабродскае, у якіх пражывала большая частка старосцінскіх сялян. У цэлым жа і тут пераважалі сярэднія і дробныя староствы і дзяржавы (дзяржава – невялікае дзяржаўнае ўладанне ці яго частка, здадзенае ў часовае трыманне), асноўная маса якіх размяшчалася ў Лідскім, Ашмянскім і Слонімскім паветах.

Указам ад 30 кастрычніка 1794 г. дзяржаўныя сяляне ў заходняй частцы Беларусі былі перададзены ў распараджэнне Вярхоўнага праўлення, устаноўленага ў Гродне. "Казённае аддзяленне, – гаварылася ва ўказе, – утрымлівае ў ведамстве сваім усе каронныя і іншага звання маёнткі, прыналежныя да казны, з якіх збірае падаткі і іншыя даходы па-ранейшаму Рэспублікі Польскай палажэнню"[9].

Паводле даных праведзенай неўзабаве пасля трэцяга падзелу V рэвізіі, у Слонімскай губерні лічылася 19 906 мужчынскага і 18 883 жаночага полу эканамічных сялян і адпаведна 22 867 і 21 626 старосцінскіх[10]. Рэзкае змяншэнне колькаснага складу эканомій у параўнанні з папярэднімі паказчыкамі адбылося перш за ўсё за кошт частковага адыходу іх да Прусіі, а таксама распачатай раздачы рускім памешчыкам. У Ашмянскім і Завілейскім паветах Віленскай губерні, згодна са спісам староставаў 1798 г., пражывала 5150 мужчынскага і 4984 жаночага полу сялян[11]. Але трэба мець на ўвазе, што да гэтага часу на тэрыторыі Ашмянскага павета былі падараваны ў вотчыннае ўладанне Дудскае і Якунскае староствы з агульным лікам 898 душ мужчынскага і 846 душ жаночага полу[12].

Падагульняючы прыведзеныя даныя, можна сцвярджаць, што на тэрыторыі Беларусі, адышоўшай да Расіі паводле трох разбораў Рэчы Паспалітай, у склад казённых сялян увайшло звыш 180 тыс. і ў склад

дварцовых – да 50 тыс. душ мужчынскага полу былых каралеўскіх эканомій і староステваў, што склала прыблізна 1/6 насельніцтва, зафіксаванага V рэвізіяй. Звяртае на сябе ўвагу факт размеркавання каралеўскіх эканомій і буйнейшых староステваў паблізу межаў ВКЛ. Гэта было выклікана абарончымі меркаваннямі перыяду фарміравання буйнога землеўладання (XIV – XV ст.), паколькі на дзяржаўных землях дыслацыраваліся і пераважна за іх кошт утрымліваліся войскі[13].

У перыяд падзелаў Рэчы Паспалітай царскі ўрад падвяргаў секвестру і прымаў у казну таксама маёнткі памешчыкаў (гл. главу 1) і духавенства (гл. главу 3), якія заставаліся за мяжой ці выступілі супраць новай улады. Пасля частку маёнткаў вярнулі іх уладальнікам, астатнія раздавалі разам са староствамі і эканоміямі ва ўласнасць іншым памешчыкам і чыноўнікам. Таму адначасова з папаўненнем колькасці дзяржаўных сялян адбываўся яшчэ больш інтэнсіўны працэс іх змяншэння.

Пашырэнне і ўмацаванне памеснага прыгоннага права здавалася расійскаму ўраду лепшым гарантам супраць паўтарэння "пугачоўшчыны" і распаўсюджвання "якабінства". Прычым у "падараваннях" Кацярыны II вядучымі з'яўляліся прычыны палітычныя. На занятых Расійскай імперыяй землях з яе рук новыя памесці атрымоўвалі, як правіла, памешчыкі рускага паходжання. Пад уплывам бурных знешніх і ўнутраных падзей апошніх гадоў царавання імператрыца, як сведчыў статс-сакратар А. В. Храпавіцкі, "у коле сваіх прыбліжаных не раз гаварыла, што *трэба ўсімі мерамі імкнуцца, каб усе маёнткі ў тых абводах знаходзіліся ва ўладанні рускіх памешчыкаў*"[14]. Хоць з раней пададзенага вядома, што гэтае палажэнне значна трансфармавалася ў практыку "перавыхавання" мясцовых дваран, тым не менш яе стараннямі ва ўсходняй частцы Беларусі (Полацкая і Магілёўская губерні), якая раней трапіла ў склад імперыі і на якую прыйшлося найбольш "падараванняў", у руках 155 новых уладальнікаў сканцэнтравалася 32 % усіх памешчыцкіх прыгонных[15]. Тут іншы раз дапускалася нават купля маёнткаў пад падараванні. Вядома, напрыклад, што ў 1777 г. улюбёнец Кацярыны II Сямён Зорыч атрымаў мястэчка Шклоў, купленае для яго ў Адама Чартарыйскага, а князь Вяземскі тады ж атрымаў 25 тыс. рублёў на куплю маёнткаў у Полацкай губерні ў таго ж князя Чартарыйскага[16]. У той жа час у самой Расіі Кацярына II ахоўвала дзяржаўных сялян ад квапнасці арыстакратаў.

Нейкі час у адносінах да дзяржаўных сялян наогул такой жа думкі прытрымліваўся і Павел I, які лічыў неабходным абмежаваць "гасударавы падараванні" толькі дварцовымі (удзельнымі) вёскамі[17]. Аднак у практыцы яго царавання гэта не праявілася. Наадварот, раздачы сялян сталі яшчэ больш інтэнсіўнымі і масавымі. У адной прыватнай размове ён па-фарысейску заявіў: "Па-мойму лепш бы і ўсіх казённых сялян раздаць памешчыкам. Жывучы ў Гатчыне, я нагледзеўся на іх кіраванне; памешчыкі лепш клапоцяцца аб сваіх сялянах, у іх свая бацькоўская паліцыя"[18]. Сучаснікі ж тлумачылі масавыя раздачы сялян Паўлам I не столькі яго шчодрасцю, колькі страхам перад небяспечнасцю народных хваляванняў. У адрозненне ад Кацярыны, Павел праводзіў падараванні ў асноўным на тэрыторыі Расіі. У беларускіх губернях ён раздаў менш за 30 тыс. сялян. Гэта тлумачыцца не толькі вычарпаннем прыдатнага фонду, але і адпадзеннем прычын чыста палітычнага характару. Пры ім "узнагароджваліся" не толькі рускія, але і польскія ці апалячаныя прадстаўнікі адзінага пануючага саслоўя.

Нагод для падараванняў было больш чым дастаткова: "в награждение ревностной службы и трудов", "в воздаяние усердия и преданности к империи нашей", "в замене отошедшего в прусское владение староства", "за знаменитые победы над неприятелем", "за воспитание будущего императора", у дзень каранацыі, "за заслуги против польских конфедератов", "из монаршей щедроты своей" і проста "по его просьбе", ператварэнне арэнд дзяржаўных маёнткаў у спадчыннае ўладанне і да т. п.[19] Умовы падараванняў сялян былі надзвычай выгаднымі для удастоеных. Пры нязначным зборы ў казну яны атрымлівалі "эканамічную наяўнасць" маёнткаў, фальваркі і ўсё, што было неабходна для вядзення панскай гаспадаркі. Атрыманыя новымі ўладальнікамі маёнткі прызнаваліся за імі як саманабытыя. Законам было вызначана: "Вёскі, ненаселеныя землі і ўгоддзі, падараваныя ў вечнае і спадчыннае ўладанне, складаюць поўную ўласнасць першага набытчыка і яго наступнікаў"[20].

Тысячы і нават дзесяткі тысяч сялян даставаліся перш-наперш "прыдворным лізаблюдам", сярод якіх ішла барацьба за колькасць і якасць царскіх падачак. Да прыкладу, у 1793 – 1795 гг. толькі на тэрыторыі Мінскай губерні маёнткі атрымалі 16 генералаў, 3 старшыя афіцэры, 6 відных дзяржаўных грамадзянскіх саноўнікаў, 7 грамадзянскіх чыноўнікаў і 5 афіцэрскіх удоў[21]. Па колькасці падараваных

душ можна вызначыць уплыў пры двары і блізкасць да прастола тых ці іншых асоб. Да 15 тыс. сялян (душ мужчынскага полу) атрымаў фаварыт імператрыцы Р. А. Пацёмкін (Крычаўскае староства), амаль 17 тыс. – генерал-фельдмаршал П. А. Румянцаў-Задунайскі (Гомельскае староства і Пружанская воласць Брэсцкай эканоміі), 12 тыс. – буйны саноўнік С. Р. Зорыч (мястэчка Шклоў), да 7 тыс. – генерал-фельдмаршал А. В. Сувораў (Кобрынская воласць Брэсцкай эканоміі), каля 5 тыс. – літоўскі генерал-губернатар М. В. Рапнін (Пінская эканомія). Па адной-дзве тысячы душ было падаравана князю Дандукову, удаве генерала Бібікава, сенатару Пастухову, генерал-маёру Ланскому, генерал-дырэктару поштаў Дзюку дэ Паліньяку і інш. Адпаведна высокімі былі і тэмпы падараванняў, асабліва напачатку. У 1773 г. на тэрыторыі двух беларускіх губерняў населеныя маёнткі атрымалі 16 чалавек, а ў 1774 і 1775 – па 37[22].

Цяжка было задаволіць запатрабаванні ўсіх жадаючых, тым больш, што магчымасці падараванняў абмяжоўваліся фондам паступіўшых у казну маёнткаў, на якія часта не скончыліся яшчэ розныя правы ранейшага іх трымання ці арэнды. Таму пецярбургскія дзяржаўныя саноўнікі нават пад выглядам спачування сялянам настойліва выстаўлялі планы неадкладнага адабрання ўсіх старостваў у казённае кіраванне. Так, пасля інспекцыйнай паездкі на Беларусь у 1800 г. паэт і сенатар Г. Р. Дзяржавін у сваіх запісках "прыкмячаў сухасць" Паўла I, "таму што не адабрана ў казну ніводнага староства, чаго, здаецца, вельмі хацелася: бо за раздачай хуткачасова і безразважна, каму ні папала, няма чым ужо амаль было ўзнагароджваць сапраўдных заслуг і прамых вартасцяў"[23].

У цэлым у Беларусі з 1772 да 1801 г. у прыватнае спадчыннае ўладанне было падаравана 208 720 рэвізскіх душ, у тым ліку больш 140 тыс. – па ўсходніх губернях[24]. Практычна поўнасцю былі раздадзены былыя каралеўскія эканоміі. Да 1801 г. у Беларускай губерні засталося толькі 905 рэвізскіх душ удзельных сялян[25]. У складзе дзяржаўных захаваліся толькі тыя канфіскаваныя і пераважна старасцінскія вёскі, на якія яшчэ не мінулі розныя правы ранейшага іх уладання і трымання. Практыка раздач прывяла да рэзкага скарачэння колькасці і ўдзельнай вагі казённых сялян, асабліва ва ўсходняй частцы Беларусі, на якую прыходзілася больш 2/3 падараванняў. Аднак дзяржаўныя сяляне захавалі значэнне другога па колькасці (пасля паме-

шчыцкіх сялян) разраду сельскага насельніцтва. Па даных V рэвізіі (гл. табл. 1), іх засталося 83 502 душы мужчынскага полу, што складала 7,5 % усяго насельніцтва.

Да пачатку XIX ст. ва ўсёй паўнаце праявіліся вынікі і наступствы паспешлівых раздач. Пашыраючы памешчыцкае землеўладанне за кошт дзяржаўных маёнткаў, царызм непазбежна асуджаў сялян на пагаршэнне іх прававога і эканамічнага стану. Новыя ўладальнікі маглі іх прадаць, падараваць, перасяліць у іншае месца, сяляне ж не мелі права скардзіцца на паноў, маёмасць іх не была абароненая. Так, сяляне Крычаўскага староства, што знаходзілася на працягу 10 гадоў у спадчынным уладанні князя Пацёмкіна, "ні работ сваіх спраўляць, ні сябе і коней сваіх карміць не могуць"[26]. Становішча як тых, хто падвергся падараванням, так і тых, хто заставаўся ў казне сялян, ускладнялася размежаваннем зямель, якое праводзілася звычайна на карысць новых уплывовых памешчыкаў. Нярэдкі пераход з рук у рукі шляхам продажу, перадачы ў арэнду, вяртанняў раней канфіскаваных маёнткаў былым уладальнікам, замен і дабаўлення да падараванняў мардавалі сялян і спараджалі злоўжыванні. Такую блытаніну ўмела скарыстоўвалі ўладальнікі, каб згубіць ці перарабіць у бок павышэння сялянскіх павіннасцей інвентары.

Аказаліся недасягнутымі, ці інакш, сарванымі, планы ўсталявання тут моцнага рускага землеўладання. Нестабільнасць палітычнага становішча ў "Заходнім краі", асаблівасці гаспадарчага ўкладу, нізкая прыбытковасць спустошаных маёнткаў – усё гэта не садзейнічала прыцягненню сюды рускіх дваран. Да таго ж першапачаткова не было прадугледжана ніякіх мер для захавання падараваных маёнткаў у руках рускіх памешчыкаў. Прадстаўнікі прыдворных колаў, атрымаўшы асноўную частку "падараваных сялян", не пажадалі пакінуць сталіцу, а палічылі за лепшае свае вёскі прадаць ці перадаць у арэнду мясцовым панам, якія ўсімі сіламі імкнуліся не дапусціць зніжэння свайго эканамічнага, а значыць, і палітычнага ўплыву ў краі. У цэлым апошнія не толькі захавалі, але часам і ўзмацнілі свае, здавалася б, пахіснутыя пазіцыі. Новыя памешчыкі ў сваіх маёнтках амаль не паказваліся, а калі і прыязджалі, то вялі пераважна бяздзейнае жыццё, даручаючы кіраванне незнаёмай ім гаспадаркай мясцовым шляхціцам. "Абцяжарваючы з году ў год маёнтак неаплатнымі даўгамі і эксплуатуючы, такім чынам, сваіх davернікаў,

гэтыя адміністратары, канторшчыкі і акономы карысталіся самі большаю часткай даходаў з маёнткаў і, калі даводзілі справы па маёнтку да таго, што ён паступаў у продаж, – з'яўляліся пакупнікамі і, у сваю чаргу, станавіліся важнымі панамі краю"[27]. Сяляне маёнтка Вярэчча Суражскага павета скардзіліся ў 1797 г. цару, што "беднасць" яны церпяць "не ад пана нашага яго сіяцельства графа Безбародкі, а ад прысланага ім адміністратара"[28]. Магчымасць нажывы не прапусцілі выкарыстаць нават замежныя прадпрымальнікі. Так, англійскія лесапрамыслоўцы скупілі ўладанні генерала Селягіна і маёнтак Тураў. Павел I спыніў далёка сягаючыя планы вынішчэння прыродных багаццяў беларускага Палесся, распарадзіўшыся вярнуць англічанам грошы, але трохгадовае іх гаспадаранне надоўга падарвала эканоміку маёнтка[29].

Усё гэта прывяло ў канцы XVIII ст. да ўздыму барацьбы памешчыцкага сялянства "нядаўняга запрыгонення" за вяртанне ў ранейшы юрыдычны статус. Буйнейшым у гэтым плане было выступленне сялян Полацкага намесніцтва ў 1797 г., у якім на фоне агульнага пратэсту супраць "падараванняў" і ўзмацнення павіннаснага прыгнёту ясна вырысоўвалася канкрэтная мэта – дабіцца пераводу ў казённае ведамства. Непасрэднай зачэпкай для хвалявання з'явіўся факт прынясення прысягі новаму імператару Паўлу I. Сяляне ўпершыню прыводзіліся да прысягі, і ў сувязі з гэтым сярод іх распаўсюдзілася пагалоска, "каб надалей быць не за памешчыкамі"[30]. "Каб ясней у тым упэўніцца", сяляне многіх маёнткаў адправілі да цара хадакоў. Большасць з іх была арыштавана па дарозе, але некаторыя ўсё ж змаглі дабрацца да Гатчыны, Паўлаўска і Пецярбурга, дзе "дерзнули подать жалобы на высочайшее имя"[31]. Рух пачаўся 13 студзеня 1797 г. у в. Прыбыткі Суражскага павета, падараванай Кацярынай II генерал-аншэфу Пятру Тэкелі, пасля смерці якога ўладальнікам маёнтка стаў яго брат Лазар. Аднак "сяляне таго маёнтка падступіліся да яго, кажучы, што яны падпарадкоўвацца яму не будуць, а жадаюць запісацца ў казённыя"[32]. Яны пайшлі ў царкву і ў прысутнасці святара далі прысягу трымацца цвёрда аж да вяртання хадакоў. Напалоханы памешчык уцёк у суседнюю вотчыну і адтуль папрасіў дапамогі ў павятовых улад. Прыбыўшым з Суражу чыноўнікам уціхамірыць сялян не ўдалося. Апошнія выгналі іх і папярэдзілі, што "хаця б тры палкі з ружжамі і гарматамі было, то ўсіх да смерці паб'юць"[33]. Следам за імі

падняліся сяляне маёнтка Загараны Езярышчанскага староства. Узброіўшыся каламі, дубінамі і віламі, натоўп больш за 50 чалавек уварваўся ў дом памешчыка Дрэвіча і адхіліў яго і адміністратара ад вядзення гаспадарчых спраў.

Падзеі ў маёнтках Прыбыткова і Загараны паслужылі сігналам да масавай смуты "падараваных" сялян. "Расстройка кіравання сялян Езярышчанскага староства, – рапартаваў у Пецярбург губернскі пракурор А. Любашчынскі, – да няшчасця разлілася і па іншых месцах у Гарадоцкім, Невельскім, Себежскім і Суражскім паветах. Сяляне многім памешчыкам зрабіліся непаслухмянымі..."[34] Усяго ў Полацкім намесніцтве ўдзельнічала ў выступленнях да 14 тыс. душ[35].

На падаўленне сялянскіх хваляванняў Павел I рушыў армію. Сяляне, узброеныя каламі, палкамі, віламі і косамі, аказвалі супраціўленне ваеннай сіле, але, аслепленыя царысцкімі ілюзіямі, хварэлі на раз'яднанасць і адсутнасць агульнай арганізацыі. Таму ўжо да пачатку сакавіка іх супраціўленне было зломлена, і пачаліся жорсткія расправы.

Выступленне ў Полацкім намесніцтве па часе супала з самым масавым рухам рускіх сялян за пераход у казну, падаўленне якога каштавала ўраду немалых намаганняў, а таксама выклікала вялікі неспакой сярод пануючага саслоўя. Асобныя, найбольш дальнабачныя яго прадстаўнікі разумелі небяспеку далейшага пашырэння прыгонніцтва. Так, у студзені 1797 г. ананімны аўтар пісьма, уладальнік 30 душ сялян, перасцерагаў вышэйшую царскую адміністрацыю аб наступствах разбазарвання казённых зямель і звязанага з гэтым пагаршэння становішча дзяржаўных сялян[36].

Факты масавых сялянскіх выступленняў былі добра вядомы і імператару Аляксандру I. На пасяджэнні Негалоснага камітэта ў 1803 г. манарх заявіў: "Трэба, каб масы былі задаволены. Калі яны як-небудзь пачнуць крычаць і адчуюць сваю сілу, гэта будзе небяспечна"[37]. Ён усведамляў, што працяг адкрытых раздач сялян у XIX ст. уяўляў небяспеку для захавання ўсяго феадальна-манархічнага рэжыму. Напэўна, таму ўжо ў самым пачатку свайго царавання Аляксандр I "даў зарок не павялічваць колькасці гэтых няшчасных і прыняў за правіла не даваць нікому ва ўласнасць сялян", а таксама запэўніў, "што ў гэтых адносінах ён не адступіць ад прынятага ім намеру"[38].

Да таго ж самі раздачы сялян даўно сталі анахранізмам. Княжацкія і царскія падараванні зямель за службу, якія вялі ў перыяд ранняга феадалізму да пашырэння і ўмацавання апошняга, цяпер ператварыліся ў простае пераразмеркаванне феадальнай уласнасці паміж рознымі групамі ўладальнікаў. А кожны ўласнік, у тым ліку і першы памешчык – цар, а таксама абсалютысцкая дзяржава былі зацікаўлены ў захаванні і павелічэнні сваіх даходаў па меры нарастання буржуазных тэндэнцый у грамадстве.

Хоць запэўніванні ліберальна пачынаючага імператара, як убачым ніжэй, аказаліся не такімі ўжо цвёрдымі, замест прамых "падараванняў" атрымалі развіццё ўсялякага роду доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя арэнды дзяржаўных маёнткаў, але гэта зняло вастрыню пытання. Прычым у першай трэці XIX ст. амаль спыняецца рух прыватнаўласніцкіх прыгонных за пераход у казну, бо перспектыва апынуцца ва ўладзе арандатараў іх таксама не задавальняла. Адсюль – затуханне барацьбы "падараваных" сялян за вяртанне ў казённае ведамства, якая звялася толькі да адстойвання былых "правоў і прывілеяў". Каб у сялян не заставалася ілюзій наконт магчымасцей вяртання ў ранейшы статус, з'явіўся ўказ Сената ад 10 лютага 1802 г., паводле якога "ўсіх ... па ўсяміласцівейшаму падараванню паступіўшых з казённага ведамства ў вечнае і спадчыннае ўладанне да розных памешчыкаў... у абводах ад Польшчы далучаных... пакінуць нароўні з іншымі сялянамі ў поўным падпарадкаванні памешчыкам"[39].

Аляксандр I вельмі асцярожна вёў сябе з дваранствам заходніх губерняў, спадзеючыся мець у іх асобе не толькі сацыяльную, але і палітычную апору. Расійскі імператар дэмагагічна падтрымліваў надзеі шляхты на адраджэнне пад яго скіпетрам старых палітычных утварэнняў (Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай). Трэба меркаваць, што гэтая акалічнасць не толькі садзейнічала спыненню "падараванняў", але і ў многім вызначала кансервацыю землеўладання і ўсіх сацыяльна-эканамічных адносін у заходнім рэгіёне імперыі, так як у процілеглым выпадку "польскім" планам Аляксандра, шырока рэкламуемым у суперніцтве з французскім імператарам Напалеонам, ніхто б не паверыў. Адсюль – адсутнасць кардынальных пераўтварэнняў у складзе і размеркаванні сялянскіх разрадаў на Беларусі ў першай чвэрці XIX ст. (гл. табл. 1, V і VII рэвізіі), за выклю-

чэннем рэзкага скарачэння колькасці і ўдзельнай вагі юрыдычна вольных катэгорый і груп насельніцтва з-за прадастаўленай уладальнікам зямель магчымасці "вольнага" іх запрыгоньвання (гл. главу 4), што зноў жа ўпісвалася ў палітыку заляцанняў са шляхтай, найбольш характэрнай для гэтага манарха.

Нягледзячы на спыненне падараванняў сялян у прыватнае спадчыннае ўладанне, тэндэнцыя да раздачы, продажу нават калі не вёсак, то свабодных казённых земляў у меншай ці большай ступені працягвала існаваць ва ўнутранай палітыцы царызму. На працягу ўсёй першай паловы XIX ст. дваране безупынна "закідвалі" прастол праектамі аб раздачы казённых зямель і сялян у прыватныя рукі.

Былі і іншага роду прапановы. Так, у 1810 – 1811 гг. для Аляксандра I была складзена "Записка о мерах укрощения возмутительного духа Польши"[40]. Невядомы аўтар (магчыма, ім быў чыноўнік Правіянцкага дэпартамента Ваеннага міністэрства Д. Мертвага, які двойчы інспектаваў заходнія губерні ў пачатку XIX ст.[41]) лічыў, што "фізічнае становішча далучаных ад Польшчы да Расіі правінцый, паводле ўсіх палітычных правіл, патрабуе, каб утрымліваць у іх, пераважна перад іншымі, немалую вайсковую сілу". Паводле падлікаў, для задавальнення патрэб такога войска на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны "павінна быць казённага маёнтка па меншай меры 100 000 дымоў, ці 200 000 мужчынскага полу душ, сапраўды да земляробства вызначаных". Для дасягнення гэтай мэты прапанавалася адабраць усе населеныя маёнткі ў духавенства, а таксама выкупіць раней падараваныя ўладанні. Даказваючы нявыгаднасць і стратнасць для казны існаваўшай формы арэнднай эксплуатацыі казённай вёскі, аўтар запіскі падрабязна выклаў план, як можна адабраць дзяржаўных сялян з рук часовых уладальнікаў і ўстанавіць уласнае земляробскае праўленне.

Але гэтыя прапановы тады не былі прыняты. Таму становішча дзяржаўных сялян заставалася няпэўным. Так, у 1810 г., каб вызваліць месца пад першыя ваенныя пасяленні, было вырашана перасяліць з Віцебскай і Магілёўскай губерняў да 2000 сем'яў дзяржаўных сялян у Новарасійскі край. Праўда, справа абмежавалася перасяленнем толькі 667 сем'яў з Бабылецкага староства Клімавіцкага павета[42]. Палова сялян, якія вымушаны былі зняцца з абжытых месцаў і пакінуць радзіму, памерла падчас пешага пераходу, а астатнім на месцы іх

пасялення практычна нічога не было падрыхтавана. Пакінутыя аракчэеўскай адміністрацыяй на волю лёсу, знясіленыя і галодныя, перасяленцы станавіліся ахвярамі цяжкіх хвароб[43]. Да жніўня 1818 г. сетка ваенных пасяленняў ахапіла шэраг губерняў імперыі, у тым ліку і Магілёўскую. Тут быў размешчаны асабовы склад Ялецкага і Полацкага пяхотных палкоў, якія папаўняўся мясцовымі казённымі сялянамі. Вёскі разбураліся, а на іх месцы будаваліся агульныя аднолькавыя дамы з роўнымі, пад салдацкі строй, вуліцамі. У гэтых пасёлках устанаўліваўся рэжым жорсткай вайсковай муштры з дробязнай рэгламентацыяй і апекай не толькі сельскагаспадарчых работ для ўласнага ўтрымання, але і ўсяго асабістага жыцця пасялян[44]. Адсутнасць ваенных пасяленняў на базе дзяржаўнай вёскі ў цэнтры і на захадзе Беларусі наводзіць на думку, што прычынай таго з'яўляліся "польскія" планы Аляксандра I, з якіх ён свядома выключаў усходнюю частку Беларусі.

Сярод мер, прынятых урадам у сувязі з разладам дзяржаўных фінансаў, быў выдадзены ўказ ад 10 верасня 1810 г. аб продажы прыватным асобам 350 тыс. дзяржаўных сялян у 8 заходніх і 3 прыбалтыйскіх губернях[45]. На продаж вызначалі пераважна невялікія ўладанні, на якія скончыліся тэрміны іх арэнды. Так, у 1811 г. па Віцебскай губерні былі куплены памешчыкамі, ваеннымі і грамадзянскімі чыноўнікамі Трубацкае, Арленскае, Шатроўскае, Касцешынскае, Чарніцкае староствы і дзве часткі Веліжскага, у якіх налічвалася адпаведна 21, 68, 191, 12, 342, 192 і 725 рэвізскіх душ[46]. Падрыхтоўка да продажу і апісанне маёнткаў расцягнуліся да 1816 г., за гэты час было прададзена 37 маёнткаў і ў іх 11 686 рэвізскіх душ у Кіеўскай, Валынскай, Падольскай, Віленскай, Віцебскай і Мінскай губернях. Сяляне выступалі супраць новых формаў запрыгоньвання, у шэрагу выпадкаў яны самі імкнуліся выкупіцца[47]. Так, у 1818 г. адбылося хваляванне ў маёнтку Чарніца Полацкага павета, прададзенага чатыром памешчыкам. Сяляне адмаўляліся падпарадкоўвацца апошнім і прасілі вярнуць іх у казённае ведамства[48]. Продаж аказаўся нявыгадным і стратным для казны, таму што дваране адмаўляліся набываць маёнткі па назначаных цэнах, у сувязі з чым ён быў спынены. Ды і ўвогуле ўрад пачаў пераходзіць на шлях аховы і павелічэння казённай уласнасці.

Гэтаму працяглому і супярэчліваму працэсу садзейнічала набываўшая ўсё большую выразнасць палітычная лінія царызму ў "Заходнім краі". Пасля 1830 г. быў распрацаваны канкрэтны план па

ажыццяўленні поўнага зліцця забраных ад Рэчы Паспалітай зямель з усёй тэрыторыяй Расіі, падымаючы ў гэтых землях сцяг праваслаўя і адзінай рускай народнасці. Для гэтага ўказам ад 1 студзеня 1831 г. уводзілася агульнарасійскае заканадаўства і канчаткова адмянялася з 25 чэрвеня 1840 г. дзеянне Статута Вялікага княства Літоўскага ў беларускіх губернях[49]. З 1831 па 1848 г. у якасці вышэйшага дарадчага органа пры цару функцыянаваў асобы Камітэт па справах заходніх губерняў. У склад Камітэта ўвайшлі 6 чалавек: міністры і вышэйшыя дзяржаўныя саноўнікі. Яго ўзначаліў старшыня Камітэта міністраў В. П. Качубей[50]. Ужо на першым пасяджэнні Мікалай I даручыў Камітэту "ўнікнуць у меркаванне захадаў, якія прыняты быць могуць, каб губерні, ад Польшчы далучаныя, прыведзены былі да таго парадку, які для кіравання ў другіх расійскіх губернях існуе"[51]. Камітэт разглядаў праекты адміністрацыйных і палітычных мерапрыемстваў для заходніх губерняў, якія паступалі ад міністэрстваў, губернатараў і генерал-губернатараў, і прадстаўляў іх на зацвярджэнне цару.

У гэтай сувязі сялянскае пытанне ў заходніх губернях Расійскай імперыі набывала не толькі сацыяльна-эканамічнае, але і асобае палітычнае значэнне. Задача нейтралізацыі шляхецкай апазіцыі спачатку абумовіла падняцце на шчыт палітыкі Кацярыны II, што пагражала поўным знікненнем дзяржаўных сялян у Беларусі, Літве і на Правабярэжнай Украіне. Разам з вядомымі ўжо планамі аб маяратах падымалася пытанне аб стварэнні на аснове канфіскаваных у паўстанцаў 1830 – 1831 гг. і нават усіх казённых маёнткаў ваеннафеадальных пасяленняў. Ініцыятарам пасялення ворных салдат "рускага паходжання" як ваеннай і палітычнай апоры царызму ў краі выступіў віленскі генерал-губернатар М. А. Далгарукаў. Гэтыя планы знаходзілі ўсямерную падтрымку ўплывовага ваеннага міністэрства. Для ажыццяўлення падрыхтаванага ў 1835 г. праекта намячалася, выключаючы прыпісаных да акруг ворных салдат, масавае перасяленне сялян канфіскаваных і дзяржаўных маёнткаў і перавод іх у рускія губерні. Аднак абставіны, якія склаліся ў пачатку 40-х гг. у Беларусі і Літве, сведчылі, што з апоры рэжыму ваенныя пасяленні могуць ператварыцца ў ачагі антыпрыгонніцкай барацьбы. Таму праекты пасяленняў ворных салдат былі адменены[52]. Міністр дзяржмаёмасцей П. Дз. Кісялёў пісаў ваеннаму міністру (1852): "Паралічэнне... у ва-

енныя пасяленні прывяло б у трывожны стан... дзяржаўных сялян і пахіснула б у іх... давер'е да дзеянняў урада"[53].

Канчатковы адказ царызму ад раздач дзяржаўных сялян азначаў перамогу новай лініі ў яго барацьбе супраць апазіцыйнага руху ў заходніх губернях, палітыкі заляцанняў да сялянства, асноўным правадніком якой стаў міністр дзяржаўных маёмасцей граф Кісялёў. Фельдмаршал І. Ф. Паскевіч, які кіраваў падаўленнем паўстання, пісаў цару 29 лістапада 1831 г.: "Я думаю, калі зменшыцца ўлада памешчыкаў над сялянамі... то Польшча, можа быць, калі не прыхільна, ва ўсякім разе не небяспечна Расіі, і нават у вайне"[54]. У кіруючых колах пачынаюць ускладаць надзеі на "дзяржаўных сялян, як людзей, адданых ураду"[55]. Перавага такой пазіцыі забяспечыла рэзкае павелічэнне беларускай казённай вёскі перш за ўсё за кошт памешчыцкай (гл. главу 1) і царкоўнай (гл. главу 3) уласнасці, а таксама за кошт шэрагу спецыфічных груп сельскага насельніцтва, губляўшых свой ранейшы статус ці ўладальнікаў.

Пасля паўстання ноўгарадскіх ваенных пасялян 1831 г. ваенныя пасяленні, што існавалі ва ўсходняй частцы Беларусі, былі пераўтвораны (да 1836 г.) у акругі ворных салдат. Асноўная эканамічная мэта, якая ставілася перад такімі акругамі, зводзілася да абкладання іх насельніцтва па магчымасці большым памерам грашовых і натуральных павіннасцей на карысць дзяржавы. Агульная колькасць насельніцтва акруг ворных салдат на тэрыторыі Віцебскай (Дынабургскі павет – сучасная Латвія) і Магілёўскай (Клімавіцкі павет) губерняў у пачатку 1837 г. склала каля 22 700 чалавек[56]. Аднак існаванне гэтых акруг па-ранейшаму абыходзілася дорага ўраду, а самавольства і злоўжыванні вайсковай адміністрацыі выклікалі незадавальненне і ўцёкі пасялян. Катэгорыя ворных салдат была ліквідавана ў другой палове 50-х гг. Спачатку, у 1856 г., усе яны былі перададзены ва ўдзельнае ведамства. Аднак у хуткім часе ў адносінах віцебскіх і магілёўскіх пасялян Дзяржаўны савет перагледзеў рашэнне аб пераводзе ва ўдзельныя сяляне, паколькі раней яны знаходзіліся ў казённым ведамстве[57]. 24 снежня 1858 г. выйшаў указ аб падпарадкаванні былых ворных салдат Віцебскай і Магілёўскай губерняў Міністэрству дзяржаўных маёмасцей нароўні з дзяржаўнымі сялянамі[58].

У 1836 г. было ліквідавана ўдзельнае землеўладанне на тэрыторыі Беларусі, што вяло сваё паходжанне ад рэшткаў эканомій і расло

тут, верагодна, шляхам куплі. Міністэрства царскага двара арганізавала выгадны для сябе абмен раскіданых па краіне асобных уладанняў імператарскай сям'і на масу казённых маёнткаў Сімбірскай губерні[59]. У парадку гэтага абмену 3109 рэвізскіх душ удзельных прыгонных у Віцебскай і Магілёўскай губернях трапілі ў склад дзяржаўных сялян[60].

У якасці ўладальнікаў сялян на Беларусі выступалі таксама некаторыя гарады, размешчаныя ў яе заходняй частцы. Гарадское землеўладанне склалася тут у XV – XVI ст. праз куплю маёнткаў у прыватных асоб магістратамі, што пацвярджалася прывілеямі вялікіх князёў ВКЛ. Прычым у асобных выпадках за гарадамі замацоўваліся не толькі акаляючыя іх землі, але і асобныя вёскі, маёнткі і фальваркі. Такія правы, напрыклад, атрымалі ў 1408 г. Брэст, а ў 1502 і 1506 гг. Гродна. Сейм Рэчы Паспалітай у 1611 г. надалей забараніў набываць маёнткі гарадам[61].

У 40 – 50-х гг. XIX ст. "гарадскія" сяляне займалі першае месца сярод невялікай часткі прыгонных, званых ведамаснымі, г. зн. якія належалі, акрамя гарадоў, навучальным установам (напрыклад, Віленскаму універсітэту), папячыцельскім установам, дому віленскага генерал-губернатара, Беларускаму вольнаму эканамічнаму таварыству, камітэту Друскеніксіх мінеральных вод і да т. п. (гл. табл. 1, іншыя). Паводле IX рэвізіі "гарадскіх" сялян налічвалася 305 душ мужчынскага полу ў Віленскай і 3847 у Гродзенскай губернях[62]. Губернскаму гораду Гродна належалі вёскі Грандзічы, Мончына, Лапёнкі, Капліца, Малахавічы, Вялікая і Малая Альшанкі, Цвіклічы, Гібулічы і Палоткава. Павятовы горад Брэст валодаў фальваркам Казловічы з вёскай Дамброўскай[63]. Усяго дзесяці гарадам Гродзенскай губерні, пераважна ў яе заходняй частцы (былой Беластоцкай вобласці), належала 48 населеных маёнткаў. У Віленскай губерні такія маёнткі належалі генерал-губернатарскай Вільні. Прыпісаныя да маёнткаў сяляне атрымлівалі ў карыстанне зямлю і адбывалі за гэта паншчыну ці плацілі аброк, маглі прыцягвацца да выканання гарадскіх грамадскіх павіннасцей па прыбіранні вуліц, рамонту мастоў і г. д. Пасля VI рэвізіі (1811) гэтыя сяляне абкладаліся падушным падаткам.

Гарадскімі вёскамі звычайна кіравалі непасрэдна гарадскія думы, ратушы і магістраты, але былі выпадкі перадач іх у арэнднае

валоданне, нават памешчыкам. 7 кастрычніка 1847 г. Камітэт міністраў, разглядаючы пытанне аб абкладанні гарадоў былой Беластоцкай вобласці віннай пошлінай, прыйшоў да высновы, што "знаходжанне населеных маёнткаў ва ўладанні гарадоў наогул не можа быць прызнана зручным і што варта іх падпарадкаваць аднастайнаму кіраванню". Камітэт даручыў Міністэрству ўнутраных спраў сабраць інфармацыю аб гарадскіх маёнтках і сялянах для перадачы іх у загадванне Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Такія звесткі сабралі і абагульнілі толькі да 1853 г. Аднак пры патуранні губернскай адміністрацыі гарадскія ўлады выступілі з усялякімі праектамі захавання за сабой маёнткаў аж да перадачы сялян у казённае кіраванне без зямлі, арганізавалі бюракратычную валакіту і фактычна сарвалі перавод "гарадскіх" сялян у дзяржаўныя[64].

Нярэдка ў статыстыцы і даследаваннях да дзяржаўных адносяць сялян, што знаходзіліся ва "ўмоўным уладанні". Апроч першых паезуіцкіх і скульцецкіх (гл. главу 3), гэта так званыя ленныя: раздадзеныя сеймам Рэчы Паспалітай у непадзельную спадчынную ўласнасць да спынення мужчынскай лініі. Знаходзячыся пад "наглядам урада", такога роду маёнткі кіраваліся як вотчынныя і паступалі ў распараджэнне казны толькі ў выпадку сканчэння дзеяння праў уладання. Далейшы лёс і аналіз праваадносін гэтых сялян з уладальнікамі прыводзяць да высновы, што іх належыць адносіць да разраду памешчыцкіх[65]. IX рэвізія паказвае ленных сялян на тэрыторыі Беларусі (у цяперашніх межах) у колькасці 9294 душы мужчынскага полу[66]. З іх асноўная маса (6786) знаходзілася ў Мінскай губерні, астатнія – у заходніх раёнах.

Царскі ўрад рабіў спробы папоўніць склад беларускіх дзяржаўных сялян і за кошт іншаэтнічных супольнасцей. У першую чаргу была звернута ўвага на татараў і цыганоў, каб праз "асяляньванне" дамагчыся размывання асаблівасцей іх сацыяльнага і нацыянальнага жыцця.

Пасяленні татараў на землях Вялікага княства Літоўскага пачалі ўзнікаць з XIV ст. Асноўным абавязкам большасці з іх было нясенне вайсковай службы, за што яны атрымлівалі зямлю і пацверджаныя ў шматлікіх прывілеях правы шляхецтва. Татарскія палкі прынялі ўдзел у паўстанні Т. Касцюшкі, што вымусіла Кацярыну II рэскрыптам ад 30 кастрычніка 1794 г. зацвердзіць татараў "у іх улас-

насці і перавагах". Звесткі пра колькасць татараў вельмі бедныя і несупастаўныя. Паводле наяўных звестак, іх у Віленскай і Гродзенскай губернях (1802 г.) было 1172[67], Мінскай (V рэвізія) – 288 душ мужчынскага полу[68]. Праз 40 гадоў справаздачы губернатараў паказваюць у Гродзенскай 875 рэвізскіх[69] і ў Мінскай 325 абодвух полаў душ[70]. У дакументах сустракаюцца згадкі аб прысутнасці татараў і ва ўсходняй частцы Беларусі ў статыстыцы некаторых маёнткаў[71].

Прывілеяваная вярхушка татараў, якая валодала нават населенымі маёнткамі, да 40-х гг. выпрасіла пацвярджэнне сваіх правоў і злівалася з масай пануючага саслоўя. Частка татараў, якая спачатку дабівалася стварэння "войск на іх ранейшай аснове", была прынята на ваенную і грамадзянскую службу. Асноўная ж маса заставалася ў стане чыншавай шляхты, якую нароўні з апошняй паны пачалі ўпісваць ў рэвізскія сказкі. Так, VII рэвізія зафіксавала ўключаных у аклад (гадавы памер дзяржаўных павіннасцей) татараў Віленскай губерні колькасцю 98 душ[72].

Міністр фінансаў Д. А. Гур'еў у 1820 г. устанавіў разбор татараў, каб "тых, якія такіх (аб дваранстве. – *У. С.*) доказаў не пададуць і займаюцца рамёствамі, дваранству непрыстойнымі, абкласці падушнымі і аброчнымі падаткамі нароўні з казённымі сялянамі". Аднак разбор зацягваўся, татары ўпарта супраціўляліся пераходу ў сялянскае саслоўе. На падставе рэзалюцыі па гэтай справе вялікага князя Канстанціна Паўлавіча Сенат 10 верасня 1830 г. выдаў указ аб залічэнні недаказаўшых дваранства ў вольныя людзі, даючы пры гэтым права доказу дваранства ў далейшым[73]. Такіх татараў аказалася параўнальна няшмат: напрыклад, па Гродзенскай губерні 11 душ мужчынскага полу; астатнія 220 асоб былі прызнаны ў дваранскім званні. 1 лістапада 1832 г. Камітэт па справах заходніх губерняў у адказ на скаргі татараў, улічваючы іх няўдзел у паўстанні 1830 – 1831 гг., спыніў практычныя дзеянні ў адносінах да іх да заканчэння разбору ўсёй шляхты[74].

Нягледзячы на законы Рэчы Паспалітай, што прадпісвалі недапушчэнне і выгнанне цыганоў з дзяржавы, яны "ў часы смутныя" пранікалі на тэрыторыю Беларусі і ўжо ў XVIII ст. карысталіся дазволам Радзівілаў на свабодны гандаль вакол Міра і Нясвіжа. Расійскі ўрад адразу ж стараўся прызначыць цыганоў у існуючыя саслоўі, запісваючы іх і да сялян. Напрыклад, паводле ведамасцей казённых ма-

ёнткаў Полацкай губерні 1792 г., у Віцебскай эканоміі лічылася 114 цыганоў мужчынскага полу[75]. Аднак змяніць векавы спосаб іх жыцця было няпроста. Перад вайной 1812 г. цыганоў фармальна, прымяніўшы законы аб бадзяжніцтве, прыпісалі да гарадоў, але большасць (пераважна бедных) цыганоў працягвала вандраваць.

Энергічныя намаганні для "ўстанаўлення аселасці бадзяжных цыганоў" прыняло Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Паводле ўказа ад 13 сакавіка 1839 г., былі сабраны, са згоды землеўладальнікаў, звесткі аб прыпісаных да іх цыганах, якіх пасялілі на землях казённых маёнткаў[76]. У 1847 г. пачалі ператвараць у дзяржаўных сялян многіх вандруючых цыганоў на той падставе, што яны згубілі свае мяшчанскія дакументы[77]. X рэвізія (1858) паказала цыганоў у складзе дзяржаўных сялян па губернях: Віленскай – 38, Віцебскай – 62, Гродзенскай – 31, Магілёўскай – 43[78]. Яны па-ранейшаму ўяўлялі сабой найменш устойлівую катэгорыю сельскага насельніцтва. Упартае адстойванне цыганамі звыклага ладу жыцця мела тады і глыбокую сацыяльную падставу: жаданне пазбегнуць уваходжання ў сферу непасрэднай эксплуатацыі прыгонніцкай дзяржавы.

Сярод мер, накіраваных на нейтралізацыю апазіцыйнага руху, была спроба перасялення ў заходнія губерні рускіх дзяржаўных сялян. З прапановай аб пасяленні ў Жмудзі рускіх сялян, "якія прынясуць... нашу мову, нашы звычаі і адданасць рускіх трону", выступіў генерал-губернатар Далгарукаў. Яго падтрымаў Заходні камітэт[79]. У лютым 1836 г. урад зацвердзіў Палажэнне аб перасяленні рускіх сялян у Віленскую, Гродзенскую і Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць. Міністр фінансаў даручыў казённым палатам гэтых губерняў сабраць звесткі пра колькасць душ у свабодных ад трымання і ненаселеных маёнтках, пакінуць вольным людзям, што жылі там, не больш васьмі дзесяцін зямлі на рэвізскую душу, а астатнюю адводзіць пад пасяленні рускіх сялян[80]. З выпатрабаваных ад казённых палат папярэдніх звестак быў складзены план пасялення 9651 рэвізскай душы на 77 212 дзесяцінах зямлі[81]. Спачатку пасяленцам даваўся шэраг пераваг, у тым ліку пяцігадовая ільгота ад уплаты падаткаў і земскіх павіннасцей і вызваленне на дзесяць гадоў ад воінскага пастою.

Сярод дзяржаўных сялян Калужскай, Курскай, Арлоўскай і Пскоўскай губерняў быў аб'яўлены набор ахвотнікаў перасяліцца

ў Беларусь і Літву. Нягледзячы на вострае малазямелле, сяляне, не давяраючы ўладам і маючы "самае нявыгаднае меркаванне аб тамтэйшым краі", адмаўляліся перасяляцца. Замест вызначаных праектам амаль 10 тыс. душ набралася некалькі сотняў[82]. У сапраўднасці перасялілася нямногім больш за 150 душ мужчынскага полу[83].

Рускія сяляне, раскіданыя дробнымі групамі па тэрыторыі Беларусі і Літвы, не маглі доўга захоўваць сваю "самабытнасць" і непазбежна раствараліся ў масе мясцовага насельніцтва. Гэта не адпавядала палітычным намерам урада. 15 лютага 1838 г. Камітэт па справах заходніх губерняў распарадзіўся прыпыніць перавод сюды рускіх сялян і прадпісаў казённым палатам знаходзіць магчымасці для пасяленняў не менш чым па 200 душ з будовай грэка-расійскай царквы[84]. Вызваляць для гэтага землі прадугледжвалася нават шляхам перамяшчэння казённых сялян з аднаго маёнтка ў другі. Аднак ажыццяўленне такой задачы аказалася не пад сілу мясцовым уладам – перш за ўсё з-за малазямелля беларускага і літоўскага сялянства.

Такім чынам, шырока задуманая перасяленчая кампанія не прынесла жаданых вынікаў. Застаўся неажыццёўленым і праект Далгарукава аб пасяленні рускіх сялян на мяжы з Прусіяй у якасці мытнай варты[85].

VIII (1834) і IX (1850) рэвізіі паказвалі рэзкі рост колькасці і ўдзельнай вагі дзяржаўных сялян сярод насельніцтва Беларусі, карэнным чынам змянялася іх унутраная структура. Ужо паводле ведамаснай статыстыкі 1837 г. сярод дзяржаўных сялян Беларусі ўдзельная вага старосцінскіх скарацілася да 69,9 %, 23,8 % складалі канфіскаваныя, 6,3 – паманастырскія (табл. 2). Пазней, у 1857 г., склад "уласна казённых сялян" размяркоўваўся, напрыклад, па Мінскай губерні наступным чынам: старосцінскія – 18377, ці 38,7 %, паманастырскія – 3006, ці 6,3 %, падухоўныя – 19550, ці 41,2 %, канфіскаваныя – 6529, ці 13,8 %, рэвізскіх душ мужчынскага полу[86]. Пераводзячы разнародныя маёнткі ў склад дзяржаўных, урад ажыццяўляў тэндэнцыю да выраўноўвання эканамічнага становішча і уніфікацыі правоў і абавязкаў сялянства. Важную ролю ў гэтых адносінах адыграў сенацкі ўказ ад 15 мая 1840 г.[87], які скасоўваў адрозненні ў найменнях казённых маёнткаў і сялян і надаваў усім агульную назву: дзяржаўныя сяляне.

*Табліца 2*[88]

**Склад казённых маёнткаў і дзяржаўных сялян у 1837 г.**

| Губерня[89] | Катэгорыя маёнткаў | | | | | | | | | Разам | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | старосцінскія | | | паманастырскія | | | канфіскаваныя | | | | | |
| | ма-ёнт-каў | душ муж. полу | % | ма-ёнт-каў | душ муж. полу | % | ма-ёнт-каў | душ муж. полу | % | ма-ёнт-каў | душ муж. полу | % |
| Віленская | 23 | 9 256 | 59,3 | 11 | 609 | 3,9 | 24 | 5 752 | 36,8 | 58 | 15 617 | 100,0 |
| Віцебская | 27 | 22 241 | 87,2 | 9 | 2 468 | 9,7 | 2 | 802 | 3,1 | 38 | 25 511 | 100,0 |
| Гродзенская | 129 | 43 284 | 62,2 | 31 | 2 080 | 3,0 | 64 | 24 174 | 34,8 | 224 | 69 538 | 100,0 |
| Мінская | 75 | 26 410 | 79,3 | 21 | 2 178 | 6,5 | 24 | 4 731 | 14,2 | 120 | 33 319 | 100,0 |
| Магілёўская | 38 | 11 735 | 66,4 | 21 | 2 848 | 16,1 | 1 | 3 085 | 17,5 | 60 | 17 668 | 100,0 |
| *Усяго* | 292 | 112 926 | 69,9 | 93 | 10183 | 6,3 | 115 | 38 544 | 23,8 | 500 | 161 653 | 100,0 |

* * *

У царскім заканадаўстве дзяржаўныя сяляне атрымалі найменне "свободных сельских обывателей", але на самой справе яны не былі такімі. Узятыя асобна як саслоўе, дзяржаўныя сяляне ў той жа час складалі частку (разрад, катэгорыю) сялянства ў цэлым і захоўвалі ўласцівыя яму агульныя рысы ніжэйшага класа-саслоўя феадальнага грамадства. У Расіі, як адзначаў акадэмік М. М. Дружынін, "дзяржаўныя сяляне займалі прамежкавае становішча паміж памешчыцкімі прыгоннымі і свабоднымі людзьмі"[90]. Яны сплачвалі аброк і лічыліся асабіста вольнымі, мелі магчымасць перайсці ў іншае падатнае саслоўе і памяняць месца жыхарства. На Беларусі, дзе панавала паншчына, ажыццяўленне гаспадарчых, адміністрацыйных і судовых правоў над сялянамі аддавалася арандатарам і адміністратарам казённых маёнткаў. Урад прыняў шэраг узаконенняў для абмежавання самавольства часовых уладальнікаў[91], але правы, якія даваліся велікарасійскім дзяржаўным сялянам, у беларускіх губернях ва ўмовах арэнднай сістэмы не маглі быць з поспехам рэалізаваны.

Першая трэць XIX ст. з'явілася часам найбольшага росквіту арэнднай эксплуатацыі казённай вёскі, калі амаль усе маёнткі знаходзіліся ў розных відах арэнды, трымання і залогу. Фармальна аб'ём паншчынных работ і плацяжоў казённых сялян вызначаўся на аснове інвентароў, якія зацвярджаліся губернскімі казённымі палатамі. Але фактычна, пры патуранні казённых палат, якія ўжо з прычыны мноства іншых абавязкаў і невялікага штату чыноўнікаў не маглі ажыццяўляць дзейсны кантроль за выкананнем інвентароў, згуба, замена, падробка і разам з тым парушэнне інвентароў былі паўсюднай з'явай. У выніку эканамічнае і прававое становішча належачых казне сялян у заходніх губернях практычна не адрознівалася ад становішча памешчыцкіх прыгонных і было значна горшым, чым у цэнтральных рускіх губернях.

Сялянскі рух у дзяржаўнай вёсцы Беларусі адлюстроўваў агульную эвалюцыю іх становішча ў складзе імперыі. Характэрна, што ў апошняй трэці XVIII ст. не зафіксавана значных хваляванняў, але ўжо з пачатку і да 40-х гг. XIX ст. нарастала масавая і ўпартая хваля сялянскіх выступленняў, якія прымусілі ўрад сур'ёзна задумацца над

іх прычынамі. Акрамя таго, палітычнае становішча ў краі ўскладнілася паўстаннем 1830 – 1831 гг., у ходзе якога значная частка мясцовага дваранства прадэманстравала апазіцыю да расійскага цара. Таму ліквідацыя арэнднай сістэмы і звязанага з ёй "гаспадарчага становішча" дыктавалася не толькі ўсім ходам сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржаўнай вёскі, але ў значнай ступені і палітычным фактарам, асабліва калі ўраду стала вядома аб агітацыі сярод сялянскіх мас шляхецкіх дэмакратаў.

28 снежня 1839 г. былі падпісаны законы аб новай сістэме кіравання і люстрацыі дзяржаўных маёнткаў у заходніх губернях[92]. На губернскім узроўні ствараліся палаты, а яшчэ ніжэй – акруговыя ўпраўленні дзяржаўных маёмасцей. У ходзе люстрацыі – новага апісання дзяржаўных уладанняў – змяншаліся павіннасці сялян і павялічваліся іх зямельныя надзелы. На аснове ўказаў 1844 і 1845 гг. сяляне казённых маёнткаў пераводзіліся з паншчыны на аброк і адначасова спынялася практыка здачы маёнткаў у арэнду. На месцах ствараліся сельскія грамады з выбарным кіраваннем, якім давяралася самастойнае вырашэнне гаспадарчых, адміністрацыйных і судовых спраў. Гэта фактычна ўраўноўвала дзяржаўных сялян Беларусі з сялянамі ўнутраных губерняў імперыі.

Істотна пашыраўся і ўмацоўваўся іх прававы статус. Згодна з "Законамі аб правах стану сельскіх жыхароў", якія ўвайшлі ў другі том спецыяльна выдадзенага "Зборніка пастаноў па кіраванню дзяржаўнымі маёмасцямі" (Спб., 1850), прызнавалася "грамадзянская свабода" дзяржаўных сялян, што выгадна адрознівала іх ад бяспраўных памешчыцкіх падданых. У гэтым плане прынцыповае значэнне мелі: права ўступлення ў шлюб, правы бацькоўскія, права апекі і папячыцельства, права наследавання, права ўласнасці, правы абавязацельныя, права на занятак гандлем і промысламі. Спыненне прававога стану дзяржаўных сялян магло быць здзейснена толькі з пераходам у іншыя саслоўі і званні, пры паступленні на вайсковую службу ці, у крайнім выпадку, па суду за ўчыненае злачынства. Іншая рэч, што практычна рэалізацыя гэтых правоў пацвярджалася далёка не ўсюды, не заўжды і не ў поўнай ступені. Тым не менш гэта дазволіла М. М. Дружыніну характарызаваць дзяржаўных сялян, як "асобае саслоўе прыгоннай Расіі"[93].

## Бібліяграфічныя спасылкі

[1] ПСЗ-І. Т. 19. № 13865.

[2] *Мелешко В. И.* Очерки аграрной истории... С. 46–47.

[3] РДАСА, ф. 12, спр. 159, арк. 41–42.

[4] *Мелешко В. И.* Очерки аграрной истории... С. 51–52, 227–230.

[5] ПСЗ-І. Т. 23. № 17090.

[6] *Жукович П. Н.* Сословный состав населения... // Журнал Министерства народного просвещения. 1915. № 5. С. 155.

[7] РДАСА, ф. 16, спр. 244, арк. 24, 132–136 адв.

[8] *Похилевич Д. Л.* Королевские экономии Литвы и Белоруссии в 70 – 80-х годах XVIII в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. Вильнюс, 1964. С. 347–348.

[9] ПСЗ-І. Т. 23. № 17264.

[10] *Żytkowicz L.* Rządy Repnina na Litwie w latach 1794–1797. Wilno, 1938. S. 323, 398–399.

[11] Падлічана па: РДГА, ф. 1374, воп. 2, спр. 969, арк. 143–177.

[12] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 86.

[13] *Козловский П. Г.* О структуре землевладения в Западной и Центральной Белоруссии во второй половине XVIII в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1969 г. Киев, 1979. С. 87.

[14] *Востоков А.* Старческие воспоминания виденного, слышанного и читанного о происшествиях в западных областях России и в Царстве Польском с 1793 года по настоящее время // Вестник Юго-Западной и Западной России. 1864. Февр. Отд. II. С. 52.

[15] *Жукович П. Н.* Сословный состав населения... // Журнал Министерства народного просвещения. 1915. № 1. С. 90–92.

[16] *Семевский В.* Пожалования населенных имений в царствование Екатерины II-й. С. 26, 45.

[17] Вестник Европы. 1867. Т. 1. Отд. 1. С. 318–319.

[18] Русский архив. 1866. Стб. 1309.

[19] РДАСА, ф. 16, спр. 244; НГА Беларусі ў Мінску, ф. 2002, воп. 1, спр. 4, 5; ф. 3219, воп. 1, спр. 2011; ф. 3268, воп. 1, спр. 6 і інш.

[20] Свод законов гражданских и межевых. Спб., 1842. Ч. 1. С. 132.

[21] *Козловский П. Г.* Землевладение и землепользование... С. 112–113.

[22] *Жукович П.* О русском землевладении в Северо-Западном крае со времени присоединения его к России. Спб., 1895. С. 6.

[23] *Державин Г. Р.* Соч. Спб., 1871. Т. 6. С. 729.

[24] *Чепко В. В.* Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972. С. 23–24; Гісторыя Беларускай ССР: У 5-ці т. Мн., 1972. Т. 1. С. 449–450.

[25] История уделов за столетие их существования. 1797 – 1897: У 3 т. Спб., 1902. Т. 3. Приложения. С. 132–134.

[26] Могилевская старина. Могилев, 1901. Вып. 2. С. 97.

[27] *Дембовецкий А. С.* Опыт описания Могилевской губернии. Могилев, 1882. Кн. 1. С. 3.

[28] НГА Беларусі ў Мінску, ф. 2567, воп. 1, спр. 220, арк. 859.

[29] Гл.: *Грыцкевіч В., Мальдзіс А.* Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980. С. 114–115; НГА Беларусі ў Мінску, ф. 295, воп. 1, спр. 459; ф. 333, воп. 24, спр. 5.

[30] *Шильдер Н. К.* Император Павел Первый. Спб., 1901. С. 327.

[31] РДАСА, ф. 7, спр. 2985, ч. 1, арк. 121–150, 342.

[32] РДГА, ф. 1341, воп. 1, спр. 130, арк. 88.

[33] НГА Беларусі ў Мінску, ф. 2567, воп. 1, спр. 220, арк. 261.

[34] РДАСА, ф. 7, спр. 2918, ч. 2, арк. 1.

[35] *Чепко В. В.* Классовая борьба... С. 93.

[36] РДАСА, ф. 16, спр. 217, арк. 1–3 адв.

[37] Цыт. па: *Предтеченский А. В.* Очерки общественно-политической истории России в первой четверти XIX века. М.; Л., 1957. С. 163.

[38] *Богданович М.* История царствования Александра I и Россия в его время. Спб., 1869. Т. 1. С. 97; Приложения. С. 44.

[39] ЦДГА Украіны ў Кіеве, ф. 533, воп. 1, спр. 1652, арк. 6.

[40] Сб. ИМ. Спб., 1902. Вып. 11. С. 379–389.

[41] Гл.: Записки Дмитрия Борисовича Мертваго. 1760–1824. М., 1867. Стб. 132–139, 281–295.

[42] Журналы Комитета министров. Спб., 1891. Т. 2. С. 477–480.

[43] Гл.: *Петрович Н.* Принудительное переселение бобылецких крестьян из Могилевской губернии в Новороссию // Архив истории труда в России. 1924. Кн. 11–12. С. 149–163.

[44] *Мельнікаў М.* Аракчэеўскія пасяленні ў Беларусі // Беларусь. 1956. № 8. С. 31; *Блашков Ю. А.* Финансовые мотивы в возникновении военных поселений в России // Весн. Бел. ун-та. Сер. 3. 1996. № 1. С. 35–36.

[45] РДВГА, ф. ВУА (Военно-ученый архив), спр. 424, арк. 1–2; ПСЗ-I. Т. 31. № 24244, 24346.

[46] *Раев А.* О продаже государственных имуществ в России // Журнал Министерства государственных имуществ. Ч. 70. 1859. Отд. II. С. 271.

[47] *Дружинин Н. М.* Государственные крестьяне в дворянских и правительственных проектах 1800 – 1833 гг. // Исторические записки. 1940. Т. 7. С. 160–162.

[48] *Игнатович И. И.* Крестьянское движение в России в первой четверти XIX века. М., 1963. С. 354–355.

[49] ПСЗ-II. Т. 6. № 4233; Т. 15. № 13591.

[50] *Середонин С. М.* Исторический обзор деятельности Комитета министров. Спб., 1902. Т. 2. Ч. 1. С. 54–55.

[51] ГАДА ў Варшаве. Збор матэрыялаў Мінскага гуртка Варшаўскага таварыства апекі над помнікамі мінуўшчыны, спр. 48, арк. 10 адв.

[52] *Неупокоев В. И.* Крестьянский вопрос в Литве... С. 74–76.

[53] *Заблоцкий-Десятовский А. П.* Граф П. Д. Киселев... Т. 2. С. 138.

[54] РДГА, ф. 1018, воп. 5, спр. 510, арк. 1 адв.

[55] *Заблоцкий-Десятовский А. П.* Граф П. Д. Киселев... Т. 4. С. 158.

[56] *Блашков Ю. А.* Экономическое положение пахотных солдат Витебской и Могилевской губерний // Роль крестьянства в социально-экономическом развитии общества. Мн., 1984. С. 80.

[57] История уделов... Спб., 1902. Т. 1. С. 114, 632–633.

[58] Журнал Министерства государственных имуществ. 1860. № 3. С. 140.

[59] *Горланов Л. Р.* Удельные крестьяне России. Смоленск, 1986. С. 26.

[60] РДГА, ф. 571, воп. 9, спр. 40, арк. 38–39, 152–153.

[61] *Тамсама*, ф. 1589, воп. 1, спр. 943, арк. 62; ДГА Літвы, ф. 378, 1840 г., спр. 1385, арк. 110–114.

[62] РДГА, ф. 571, воп. 9, спр. 53, арк. 24–29, 65–70.

[63] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 522.

[64] РДГА, ф. 384, воп. 6, спр. 534.

[65] Гл.: *Улащик Н. Н.* Предпосылки крестьянской реформы... С. 51; *Конюхова Т. А.* Государственная деревня Литвы... С. 36–38; *Неупокоев В. И.* Крестьянский вопрос в Литве... С. 22, 289–291.

[66] Падлічана па: РДГА, ф. 571, воп. 9, спр. 53, арк. 25–26, 66–67, 133–134.

[67] ДГА Літвы, ф. 378, 1802 г., спр. 145, арк. 29.

[68] РДГА, ф. 571, воп. 9, спр. 8, арк. 87–89.

[69] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 268.

[70] ДГА Літвы, ф. 378, 1845 г., спр. 1987, арк. 42.

[71] РДАСА, ф. 16, спр. 898, арк. 25; РДВГА, ф. ВУА, спр. 18359, арк. 68.

[72] ДГА Літвы, ф. 378, 1813 г., спр. 274, арк. 199–200.

[73] *Тамсама*, арк. 63, 155–164, 205–208.

[74] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 809, арк. 6–8, 16.

[75] РДАСА, ф. 12, спр. 216, арк. 2; РДВГА, ф. ВУА, спр. 18359, арк. 14.

[76] ДГА Літвы, ф. 378, 1840 г., спр. 1374, арк. 7.

[77] *Шпилевский П.* Путешествие по Полесью и Белорусскому краю // Современник. 1853. № 8. Отд. 2. С. 61.

[78] Материалы для статистики России, собираемые по ведомству Министерства государственных имуществ. Вып. 3. С. 180–181.

[79] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 364.

[80] ДГА Літвы, ф. 515, воп. 19, спр. 241, арк. 1–2, 7.

[81] РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 1943, арк. 10.

[82] *Тамсама*, спр. 1942, арк. 2–5, 17–26, 47–52, 59–73.

[83] Падлічана па: РДГА, ф. 384, воп. 1, спр. 207, арк. 107–108, 116–117, 122, 136, 190; НГА Беларусі ў Мінску, ф. 295, воп. 1, спр. 624, арк. 144–145; ДГА Літвы, ф. 525, воп. 13, спр. 63, арк. 263.

[84] РДГА, ф. 384, воп. 1, спр. 193, арк. 320–322, 418.

[85] Московские ведомости. 1867. Февр. № 32.

[86] Падлічана па: *Зеленский И.* Минская губерния. Ч. 1. С. 621.

[87] ПСЗ-II. Т. 15. № 13471.

[88] РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 2043, арк. 9–17; ДГА Літвы, ф. 378, 1830 г., спр. 598, арк. 328. Колькасць сялян мужчынскага полу ўлічана разам з пражываўшымі ў гэтых маёнтках вольнымі людзьмі, аднадворцамі і яўрэйскім насельніцтвам.

[89] У складзе губерняў улічаны толькі паветы на цяперашняй тэрыторыі Беларусі ў адміністрацыйным падзеле да 1843 г.

[90] *Дружинин Н. М.* Государственные крестьяне... Т. 1. С. 38.

[91] Гл.: ПСЗ-I. Т. 19. № 13865; Т. 29. № 22158; Т. 32. № 25065; Т. 34. № 27746.

[92] Гл.: ПСЗ-II. Т. 14. № 13035, 13036.

[93] Большая Советская Энциклопедия. 3-е изд. М., 1972. Т. 7. С. 163.

## Глава 3

# СЕКУЛЯРЫЗАЦЫЯ ЦАРКОЎНЫХ УЛАДАННЯЎ

У XVIII ст. царква, перш за ўсё рымска-каталіцкая, з'яўлялася буйнейшым уласнікам зямлі і прыгонных на Беларусі. Яна атрымоўвала падараванні маёнткамі ад каралеўскай улады, магнатаў і вышэйшых службовых асоб. Толькі ў Віленскага епіскапства на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага знаходзілася 600 вёсак, 330 з іх складалі сталовыя епіскапскія, а 270 належала духоўнаму савету – капітулу. У цэнтральнай і заходняй частках Беларусі ў 1790 г. налічвалася 39 085 усіх царкоўных дымоў[1]. На тэрыторыі, што адышла да Расіі ў 1772 г., рымска-каталіцкай царкве належала 35 943, уніяцкай – 6340 і праваслаўнай – 1075 сялян мужчынскага полу[2]. Сяляне ва ўладаннях каталіцкай царквы цярпелі яшчэ большы ўціск, чым дзяржаўныя і нават памешчыцкія прыгонныя.

Права падачы сялянамі скаргаў (суплік) духоўнаму начальству на адміністрацыю маёнткаў звычайна абарочвалася супраць іх жа саміх. Адработачная рэнта пераважала ў сістэме эксплуатацыі манастырскіх сялян і выяўляла ў другой палове XVIII ст. тэндэнцыю да павелічэння[3]. Сеймавая пастанова (канстытуцыя) 1677 г. замацоўвала за духавенствам маёнткі ў Вялікім княстве Літоўскім "на вечныя часы"[4].

У 60-х гг. XVIII ст. урад Кацярыны II адабраў у панаваўшай у Расійскай імперыі праваслаўнай царквы населеныя маёнткі. Пасля гэтага лагічна было меркаваць, што і на забраных у хуткім часе ад Рэчы Паспалітай землях Беларусі не толькі праваслаўнае, але і уніяцкае і асабліва рымска-каталіцкае духавенства будзе пазбаўлена маёнткаў на карысць дзяржавы. Аднак тут палітычныя абставіны аднеслі поўную секулярызацыю царкоўных уладанняў на нявызначаную перспектыву. Не замацаваўшыся на новай тэрыторыі, царскі ўрад не рашаўся ісці на абвастрэнне адносін з моцным і ўплывовым у феадальных колах каталіцкім клірам, тым больш, што на глебе барацьбы супраць буржуазных рухаў у Еўропе адбывалася ў гэты час збліжэнне царызму з Ватыканам. Папства, актыўна выступіўшае супраць канстытуцыі 1791 г., прынятай Чатырохгадовым сеймам, не падтрымала паўстання Касцюшкі і моўчкі згадзілася на раз-

бор Рэчы Паспалітай. У сваю чаргу, Кацярына II з разуменнем аднеслася да патрэб каталіцкага духавенства і лічыла за лепшае схіляць царкоўных іерархаў на свой бок.

Канфіскацыя маёнткаў у духавенства абмежавалася тады агульнымі мерамі, што прымяняліся ў адносінах да прыватных уладальнікаў. Так, у наказе Кацярыны II губернатарам Пскоўскай і Магілёўскай губерняў ад 28 мая 1772 г. прадпісвалася: “Аб манастырах вы зробіце разгляд: 1) тыя манахі, якія нам не жадаюць прысягаць, а за граніцу пойдуць, пакідаючы манастыры пустымі, тых манастыроў вёскі загадайце ўзяць у казённае кіраванне; 2) тое ж зрабіце з вёскамі тых манастыроў, якія за граніцай; 3) іншых пакіньце пры кіраванні іх маёнткамі да далейшага аб гэтым устанаўлення”[5]. У адносінах апошніх царскі ўрад прымаў меры да “захавання цэласці”, імкнучыся не дапусціць як продажу, так і новага набыцця маёнткаў царквой. Літоўскі генерал-губернатар Рапнін у прадпісанні ад 11 жніўня 1796 г. аб забароне духавенству ўплочваць з царкоўных маёнткаў свае прыватныя даўгі выказаў пазіцыю ўрада больш пэўна і адкрыта. Ён падкрэсліў, што гэта “маёнткі дзяржаўныя, на гэтую свяшчэнную частку аддзеленыя... толькі часова”[6].

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у Магілёве была заснавана Беларуская каталіцкая епархія на чале з адданым расійскаму ўраду епіскапам С. Богуш-Сестранцэвічам. Царкоўныя маёнткі, што знаходзіліся на гэтай тэрыторыі і даходы з якіх паступалі ў распараджэнне іерархаў Віленскага дыяцэза, паводле ўказа 22 лістапада 1773 г. адыходзілі ў казну, а магілёўскаму епіскапу прызначалася штогадовае “ўтрыманне” ў памеры 10 тыс. рублёў[7]. Віленскі капітул, такім чынам, пазбавіўся Стрэшынскай воласці (2926 душ), Падгорскага і Саржыцкага войтаўстваў (3149). Казённымі сталі таксама тры пагосты Чэпельскай плябаніі (1986) і тры Рэжыцкай (1241), а ўсяго – 203 вёскі, у якіх лічылася 9302 душы мужчынскага полу[8]. З манастырскіх вотчын секвестру падвергся толькі маёнтак Клімаўшчызна (66 душ), уладальнікі якога – францысканцы – засталіся за мяжой. Але і ён неўзабаве, па распараджэнні беларускага генерал-губернатара Чарнышова, быў аддадзены манашкам-марыявіткам[9].

Найбольшыя страты панесла царква ў цэнтральнай частцы Беларусі. Рэскрыпт 8 снежня 1792 г. на імя камандуючага войскамі генерала М. М. Крачэтнікава паўтараў распараджэнне імператрыцы аб

манастырах, дадзенае яму 20 гадоў назад як Пскоўскаму губернатару. Згодна з гэтым распараджэннем, былі канфіскаваны ўладанні духавенства, якое засталося за мяжой. Паводле прадстаўленых мінскім генерал-губернатарам "скарочаных ведамасцей", духоўныя маёнткі, што ўвайшлі ў склад казённых, налічвалі 10 905 "карэнных" і 803 "вольнажывучых" сялян мужчынскага полу[10]. Паўстанне 1794 г. выклікала дадатковую канфіскацыю царкоўных маёнткаў. Указ ад 3 мая 1795 г. прадпісваў "роўным чынам і ад зрабіўшыхся бяздзейнымі архірэйскіх дамоў ці капітул рымскага і уніяцкага веравызнання, ці тых, якія надалей вакантнымі зробяцца, ці ж якіх начальнікі па-за межамі расійскімі знаходзяцца, адабраўшы (маёнткі.– *У. С.*), прылічыць у казну, пакідаючы іншыя... да будучага ў далейшым наогул па царкоўных справах уладкавання"[11]. У выніку ўсяго на тэрыторыі Беларусі, увайшоўшай па другім падзеле, у казну паступіла 21 928 мужчынскіх душ ад рымска-каталіцкага і 3700 ад уніяцкага духавенства[12]. Сярод секулярызаваных каталіцкіх маёнткаў выдзяляліся разлеглыя ўладанні, што складаліся з мноства вёсак. Дастаткова назваць сталовыя епіскапскія Паляны (4775 душ) і Уборцы (1412 душ), маёнткі віленскага капітула Стрэшын (2287 душ), Бераснёўка (1560 душ), віленскага бенедыкцінскага манастыра Вязынь (1000 душ) і інш.

У заходняй частцы Беларусі адразу былі канфіскаваны ў застаўшыхся пад уладай Прусіі каталіцкіх ксяндзоў фальваркі Бучамль і Жыдомля, у якіх лічылася 368 душ мужчынскага полу. Акрамя таго, па прадпісанні Рапніна ад 7 ліпеня 1796 г. у казну былі ўзяты фальваркі Ставы, Сеўкі і Камяніца ў Брэсцкім павеце, што засталіся пасля смерці луцкага епіскапа Нарушэвіча, у якіх пражывала 1333 мужчынскага і 1222 жаночага полу душ. Манастыры і уніяцкае духавенства захавалі свае ўладанні[13]. Панесла чарговыя страты Віленскае епіскапства. Епіскап Ігнат Масальскі, які спачатку заўзята выступаў супраць дысідэнтаў, пасля атрымання буйнога хабару ад царскага ўрада рэзка змяніў сваю пазіцыю і стаў амаль ці не главой расійскай партыі ў Рэчы Паспалітай. Здавалася, каталіцкія іерархі цалкам маглі разлічваць на захаванне з пераходам пад уладу Расіі ўладанняў епіскапства ў Літве і на захадзе Беларусі. Аднак варшаўскія паўстанцы павесілі Масальскага. Паводле ўказа ад 4 снежня 1796 г., сталовыя епіскапскія маёнткі прымаліся ў казну, а новаму епіскапу Касакоўскаму прызначалася грашовае "ўтрыманне"[14].

Першапачаткова Вярхоўнае Літоўскае праўленне на чале з М. В. Рапніным прызначала ў епіскапскія маёнткі адміністратараў, але ўжо праз год выявілася, "што адміністратары ў некаторых ключах рабілі ўціскі сялянам пры выпатрабаванні ад іх залішніх павіннасцей і пры зборы з іх у карысць сваю даходаў", а іншыя "аказаліся перад казной няспраўнымі плацельшчыкамі". Апошняя акалічнасць выклікала асаблівы непакой грамадзянскага губернатара Булгакава, які вырашыў замяніць адміністрацыйнае кіраванне здачай маёнткаў у арэнду[15]. У 1799 г. у складзе казённых лічылася 7384 мужчынскага і 7123 жаночага полу душ епіскапскіх сялян, пражываўшых у Браслаўскім, Вількамірскім, Ваўкавыскім, Лідскім і Ашмянскім паветах Літоўскай губерні[16].

Казна наклала свае правы на так званыя скульцецкія маёнткі, выдзеленыя са сталовых епіскапскіх (пад назвай "скульты") для раздачы ў пажыццёвае ўладанне дваранам пры ўмове ўнясення чацвёртай часткі даходаў – "кварты" – у казну епіскапа. Такіх маёнткаў у Беларусі і Літве было 31, з іх 15 у Браслаўскім, а астатнія ў Віленскім і Вількамірскім паветах. Яны ўяўлялі сабой дробныя, нявыгадныя для ўстанаўлення прамога адміністрацыйнага кіравання зямельныя ўладанні, пераважна без прымацаваных да іх прыгонных. Па даных на 1806 г., з 1261 рэвізскай душы ў скульцецкіх маёнтках "карэнных" налічвалася толькі 191, астатнія з'яўляліся людзьмі "вольнымі" ці шляхціцамі[17]. Пажыццёвыя ўладальнікі кіравалі скульцецкімі маёнткамі на вотчынным праве, значыць, яны толькі намінальна сталі лічыцца дзяржаўнымі. Сяляне ўраўноўваліся ў правах з казённымі толькі пасля смерці ўладальнікаў. Пачынаючы з 1818 г., скульцецкія маёнткі паступова ўліваліся ў агульны склад казённых, пераходзячы ў арэнднае ўтрыманне[18].

Такім чынам, у 70 – 90-я гг. XVIII ст. царскі ўрад адабраў у духавенства на Беларусі больш 40 тыс. сялян мужчынскага полу. Хоць гэта закранула толькі частку ўсіх уладанняў царквы, але выклікала негатыўную рэакцыю каталіцкага духавенства, выказваўшага "незадавальненне адабраннем у іх маёнтнасцей"[19]. Сяляне ж не пратэставалі, тым больш, што апека казны давала ім шанц на паляпшэнне прававога і эканамічнага становішча[20]. Больш таго, у першай палове XIX ст. былі выпадкі ўдзелу царкоўных сялян у руху прыватнаўласніцкіх прыгонных за пераход у дзяржаўныя. Так, у 1822 – 1825 гг. "займелі жаданне быць казённымі" сяляне Талачынскай уніяцкай царк-

вы. Яны адмовіліся падпарадкоўвацца дваравому ўпраўленню і земскай паліцыі, за што былі аддадзены пад суд, а па ўказу сената "прыведзены ў належнае падпарадкаванне свайму ўладальніку"[21]. У 1845 г. узнік канфлікт паміж сялянамі в. Стайкі Баркалабаўскай царквы Быхаўскага павета і протаіерэем Карбоўскім. Сяляне звярнуліся да магілёўскага епіскапа са скаргай на Карбоўскага, "каб ён надалей устрымаўся ад жорсткіх непрыстойных яго сану нас мучэнняў і непамерных прыгонаў". Адыйшоўшыя самавольна ў Магілёў Ермалай Герасімаў, Аляксей Аляксандраў і Апанас Іваноў, відаць, даведаліся там аб перадачы духоўных маёнткаў дзяржаве, бо, вярнуўшыся ў вёску, смела заявілі, што рабіць ім "спагнанні ніхто не смее і не мае права, яны – казённыя". Карбоўскі ў сваю чаргу запатрабаваў ад улад "з вінаватымі... абыйсціся па ўсёй строгасці закону, унушаючы ім пакору ўладальніку"[22].

Асобным шляхам праходзіла секулярызацыя маёнткаў езуіцкага ордэна, які з'явіўся на Беларусі пасля Люблінскай уніі 1569 г. і за два стагоддзі стварыў тут магутную эканамічную базу ў форме вотчыннага землеўладання. 11 калегій і 5 рэзідэнцый утрымлівалі ў сваіх руках 79 фальваркаў і 222 вёскі. У 1773 г. у Вялікім княстве Літоўскім ордэн езуітаў валодаў 550 тыс. га зямлі і 47 610 феадальна-залежнымі сялянамі[23].

Ордэн езуітаў актыўна ўдзельнічаў у палітычным жыцці, што выклікала пратэсты ўрадаў шэрагу еўрапейскіх дзяржаў. 21 ліпеня 1773 г. папа Клімент XIV выдаў булу аб роспуску гэтага ордэна. У Рэчы Паспалітай езуіцкія маёнткі былі перададзены ў распараджэнне Адукацыйнай камісіі, якая распрадала іх шляхце пры ўмове ўплаты з даходаў 6 % на ўтрыманне вучылішчаў, што складала фундушавы (вучэбны) фонд. Гэтыя маёнткі атрымалі найменне першых паезуіцкіх, яны знаходзіліся пад "наглядам урада", але кіраваліся як вотчынныя і маглі паступаць у распараджэнне казны толькі ў выпадку спынення правоў уладання. Першыя паезуіцкія сяляне, што знаходзіліся на тэрыторыі заходняй і цэнтральнай частак Беларусі, фактычна трапілі ў разрад памешчыцкіх прыгонных і ў далейшым зведалі тую ж долю. Па даных на 1790 г., у паезуіцкіх уладаннях беларускіх (у сучасных межах) паветаў Вялікага княства Літоўскага знаходзілася 644 гарадскіх і 7179 сельскіх дымоў[24], на 1837 г. у паезуіцкіх першых на той самай тэрыторыі Расійскай імперыі – 22 267 душ мужчынскага полу[25].

Статус “умоўнага ўладання”, у якім знаходзіліся першыя паезуіцкія сяляне, даваў ім зачэпку дабівацца правоў дзяржаўных сялян, калі апошнія ў сярэдзіне XIX ст. істотна выдзеліліся з масы земляробскага насельніцтва Беларусі. Так, у 1851 г. сяляне маёнтка Літвяны Свянцянскага павета звярнуліся да генерал-губернатара са скаргай на памешчыка Вішнеўскага і запатрабавалі пераводу на аброк па прыкладзе казённых сялян. У адказ генерал-губернатар загадаў аб’явіць, што “як яны паезуіцкія сяляне, то не могуць быць пераведзены на аброк і павінны знаходзіцца ў поўнай залежнасці ад уладальніка”. Абураныя сяляне 23 кастрычніка захапілі карчму, дзе “прычынілі грубасці” памешчыку і яго людзям, а потым пайшлі ў двор і ўзяліся расшукваць аканома. Хваляванне было спынена шляхам устанаўлення воінскага пастою. Віленскі грамадзянскі губернатар, які выязджаў у Літвяны, канстатаваў, што “галоўнейшай прычынай скаргаў і непадпарадкавання іх аказваецца памылковы погляд і няправільнае ўяўленне”. Падобныя выступленні адначасова адбываліся ў в. Данюшава і в. Сурвілішкі Ашмянскага павета[26]. Уладальнікі першых паезуіцкіх маёнткаў вымушаны былі ўлічваць патрабаванні сялян, ідучы на некаторыя саступкі[27], але аж да адмены прыгоннага права не ўпусцілі вотчыннага характару ўлады над імі.

Некалькі інакш складваліся адносіны езуітаў з вярхоўнай уладай на тэрыторыі ўсходняй часткі Беларусі, якая раней (з 1772 г.) была ўключана ў склад Расійскай імперыі. Першапачаткова Кацярына II была настроена варожа і падазрона да ордэна. У чарнавым накідзе аб кіраванні далучанай па першым падзеле Рэчы Паспалітай тэрыторыі яна назвала езуітаў “вераломнейшымі ўсіх іншых папейскіх ордэнаў” і прадпісала “пры першым ад іх, інтарэсу нашаму супраціўным, подзвігу... оптам выгнаць з гэтых зямель, прыстаўвячы адміністратараў да нерухомай маёмасці іх”[28]. Аднак яны першымі кінуліся прысягаць расійскай імператрыцы, абяцаючы дабівацца лаяльнасці новых падданых. Була папы не была дапушчана ў Расію, і ордэн тут застаўся ва ўладанні ўсёй сваёй маёмасці. Указам ад 9 красавіка 1774 г. з езуіцкіх сялян часова адмяняліся вінны і напалову дзяржаўны падаткі, “каб яны (езуіты.– *У. С.*) ня мелі недахопу ва ўтрыманні сябе” і ў падзяку за “выхаванне юнацтва”[29]. У 1780 г. у Полацкай губерні налічвалася 8889, а ў Магілёўскай 2809 езуіцкіх сялян мужчынскага полу[30].

Між тым кампраміс царызму з езуітамі насіў часовы характар і трымаўся да тых пор, пакуль цэнтр ордэна знаходзіўся ў г. Полацку і яго дзейнасць больш-менш кантралявалася расійскімі ўладамі. Сітуацыя змянілася, калі папа Пій VII апублікаваў у 1814 г. булу аб аднаўленні Таварыства Ісуса, якое стала кіравацца з Рыма. Спасылаючыся на тое, што езуіты "ўздумалі ўзрушваць... у Царстве нашым праваслаўную грэчаскую веру", Аляксандр I у 1815 г. аб'явіў аб выдварэнні іх з Пецярбургу, а 13 сакавіка 1820 г. выйшаў указ аб высылцы езуітаў за межы Расійскай імперыі. Палажэннем Камітэта міністраў ад 7 студзеня 1822 г. 35 маёнткаў (9830 душ мужчынскага полу), што належалі езуітам, былі канфіскаваныя і сенацкім указам ад 13 красавіка замацаваныя за казной[31]. Віцебскай і Магілёўскай казённым палатам даручалася "кіраванне гэтымі маёнткамі нароўні з іншымі казённымі старосцінскімі"[32]. Яны атрымалі найменне другіх паезуіцкіх.

Становішча сялян у былых уладаннях езуітаў было нялёгкім, гаспадарка запушчанай, казённыя палаты з цяжкасцю знаходзілі ахвочых узяць паезуіцкія другія маёнткі ў арэнду. У фальварку Ужвальд Віцебскай губерні казённыя рэвізоры знайшлі драўляную калодку, якую выкарыстоўвалі спецыяльна для катавання сялян[33]. Таму нядзіўна, што сяляне спадзяваліся з пераменай уладальнікаў на паляпшэнне свайго становішча. Будучы дзекабрыст А. Бястужаў пісаў у 1821 г. з Полацкага павета: "Мужыкі бедныя, але кажуць, што цяпер ім рай, у параўнанні з жыццём пад уладай езуіцкай. Яны рады, што іх выгналі"[34].

Становішча сялян, якія заставаліся ва ўладанні духавенства, час ад часу непакоіла царскі ўрад і вымушала прымаць некаторыя захады па ўрэгуляванні іх адносін з уладальнікамі.

У 1820-х гг. ураджэнец Віленскай губерні Ю. Янушэвіч, які працаваў настаўнікам у дваранскіх дамах Беларусі і Літвы, пасля беспаспяховых спроб трапіць на прыём да Аляксандра I, выклаў пісьмова ў сваіх праектах наступнае: "Стан селяніна, належачага духавенству, ёсць самы нікчэмны, бо гэтыя апошнія, забываючы, што яны павінны служыць прыкладам іншым у чалавечнасці і справядлівасці, больш яшчэ прыгнятаюць сялян, чым свецкія, што зусім супроць усім правілам рэлігіі"[35]. Адзначаючы, што асноўная частка даходаў паступае ў распараджэнне вышэйшага духавенства, у той час

як маса святароў жыве ў бядоце, ён прапаноўваў адабраць маёнткі ў царквы і прызначыць духавенству дзяржаўнае жалаванне[36]. Мясцовая адміністрацыя атрымлівала даносы на злоўжыванні ксяндзоў ад духоўных асоб праваслаўнай царквы, незадаволеных эканамічнай і палітычнай перавагай каталіцызму ў краі. У ананімным лісце, прадстаўленым 15 ліпеня 1834 г. Мікалаю І, адзначалася: "Многія і вельмі многія рымскія папы́ маюць у сябе прыгонных праваслаўнага веравызнання сялян і абыходзяцца з імі як інквізітары з ерэтыкамі"[37].

Сапраўды, часта ва ўладанні ксяндзоў знаходзіліся сяляне іншых хрысціянскіх абрадаў. Напрыклад, у Мінскай губерні, згодна з данымі першай паловы 30-х гг. XIX ст., рымска-каталіцкаму духавенству належала сялян мужчынскага полу: 1988 праваслаўных, 7159 уніятаў і толькі 3088 рымска-католікаў[38]. З меркаванняў падняцця прэстыжу афіцыйнай царквы імперыі ўрад у 1836 г. забараняе іншавернаму духавенству набываць у прыгоннае ўладанне праваслаўных сялян, а 24 студзеня 1839 г. выдае ўказ "Аб мерах супраць жорсткага абыходжання рымска-каталіцкіх духоўных з іх сялянамі і служыцелямі"[39]. У ім прадугледжваліся пакаранні царкоўным уладальнікам за злоўжыванні ў адносінах да сялян аж да суда і адхілення ад кіравання маёнткамі; генерал-губернатары атрымлівалі права прызначаць чыноўніка, якому духоўныя сяляне маглі б падаваць свае скаргі.

Пераломам у адносінах царызму да царкоўнай маёмасці ў заходніх губернях наступае пасля нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830 – 1831 гг. у рамках крокаў, якія рабіў Камітэт па справах заходніх губерняў да палітычнага супакаення краю. Адным з важнейшых напрамкаў урадавай палітыкі стала барацьба супраць уплыву каталіцкай царквы, што змыкалася са шляхецкай апазіцыяй. Урад ішоў па лініі змяншэння колькасці каталіцкага духавенства і падрыву яго эканамічнай базы. Ліквідацыя царквы як буйнога феадала-ўласніка ставіла яе ў большую залежнасць ад дзяржаўнай улады. "Ва ўсіх краінах, дзе каталіцкае духавенства пазбавілася велізарных сваіх маёнткаў, – пісаў Мікалаю І віленскі генерал-губернатар Ф. Я. Міркавіч, – яно разам з тым траціла палітычнае значэнне і ўплыў на грамадства"[40]. На Беларусі ўрад яшчэ разлічваў, што перавод царкоўных сялян у казну пазбавіць іх ад рэлігійнага ўплыву каталіцкага духавенства, забяспечыць паступовы пераход у праваслаўе і тым самым узмацніць палітычныя пазіцыі царызму ў краі.

Пры практычным ажыццяўленні гэтага курсу ўрад аб'ектыўна дзейнічаў у духу палітычнай запіскі магілёўскага губернатара М. М. Мураўёва: "з вялікай асцярожнасцю", "спачатку быццам бы часова пазбавіўшы багацейшыя манастыры і кляштары нерухомых маёнткаў, калі ж з цягам часу з гэтай думкай звыкнуцца, то рашуча адабраць наогул усе духоўныя маёнткі"[41].

4 кастрычніка 1832 г. выйшла сакрэтнае распараджэнне міністра ўнутраных спраў Дз. М. Блудава да беларускага і літоўскага генерал-губернатараў скласці ведамасці аб усіх фундушавых сялянах, што належалі каталіцкаму духавенству, "без ніякай агалоскі"[42]. Пры V Аддзяленні імператарскай канцылярыі пад старшынствам яго начальніка П. Дз. Кісялёва былі створаны камітэты па адабранні ў каталіцкага духавенства населеных маёнткаў і ўладкаванні ў "Заходнім краі" быту праваслаўнага духавенства[43]. Да канца 30-х гг. яны сабралі "сакрэтна, без абвяшчэння намераў", падрабязныя апісанні духоўных маёнткаў па ўсіх губернях. Гэтыя падрыхтоўчыя матэрыялы, дастаўленыя чынамі земскай паліцыі, выявілі цяжкае становішча сялян царкоўных маёнткаў, дзе захоўваліся традыцыі жорсткай эксплуатацыі. Ведамства П. Дз. Кісялёва, у дадзеным выпадку не зацікаўленае ў прыхарошванні сапраўднага становішча спраў, канстатавала, што "маёнткі духоўныя з'яўляюцца амаль зусім спустошанымі з прычыны, што кіраўніцтва духоўных асоб вельмі мала клапоціцца пра дабро гэтай Вялікай грамады"[44]. Згодна з данясеннем чыноўнікаў, што абследавалі вялікі (1332 мужчынскага і 1027 жаночага полу душ) маёнтак ліквідаванага за дапамогу паўстанцкім атрадам Картуз-Бярозскага манастыра, "сяляне... знаходзяцца ў вельмі пасрэдным і большай часткай у кепскім становішчы; многія з іх не маюць ні коней, ні валоў"[45].

Зразумела, царызм не пакінуў без увагі спачуванне і падтрымку рымска-каталіцкімі манастырамі паўстанцкіх дзеянняў. У дакладзе Камітэта па справах заходніх губерняў ад 28 лістапада 1831 г., ухваленым Мікалаем I "для паступовага выканання", прапаноўвалася зменшыць іх колькасць на Беларусі і пакінуць толькі ў гарадах і некаторых мястэчках, а маёнткі наогул ва ўсіх манастыроў адабраць, замяніўшы іх штогадовымі грашовымі выплатамі[46].

19 ліпеня 1832 г. выйшаў указ аб ліквідацыі некамплектных (што не мелі поўнага складу манахаў) рымска-каталіцкіх манастыроў і пе-

радачы іх маёнткаў у склад казённых[47]. Цікава, што ў папярэдніх намётках указа меркавалася гэтыя маёнткі перадаць у агульную масу каталіцкіх, але пасля, пад уплывам думкі, што ў такім выпадку "ўрад не дасягне галоўнай сваёй мэты", было вырашана перадаць епархіяльнаму начальству толькі капіталы скасаваных манастыроў, а маёнткі з прыгоннымі сялянамі – у казну[48].

Закрыццё манастыроў, што праходзіла пад непасрэдным наглядам Мікалая І, было ажыццёўлена ў верасні 1832 г., а ў хуткім часе складзены вопісы іх маёмасці[49]. Па Віленскай губерні было ліквідавана 40 манастыроў і паступіла ў казённае ведамства 2270 душ мужчынскага полу[50], па Віцебскай адпаведна 8 і 1509[51], па Гродзенскай – 31 і 2066[52], Мінскай – 21 і 2151[53], Магілёўскай – 21 і 2848[54]. У 1837 г. па Віцебскай губерні дапаўняльна секулярызавалі ў казну 4 маёнткі (2347 рэвізскіх душ), што належалі манашкам-бернардзінкам і магілёўскай семінарыі[55].

У складзе дзяржаўных паманастырскія маёнткі (так іх сталі называць) паступілі ў распараджэнне Дэпартамента дзяржаўных маёмасцей Міністэрства фіінансаў, а на месцах, у губернях, – казённых палат. Урад, імкнучыся да павышэння казённых даходаў з гэтых маёнткаў, стараўся прымусіць арандатараў аказваць сялянам дапамогу і зрабіў шэраг распараджэнняў для аблягчэння іх становішча. Так, па маёнтку Шклоўскага манастыра Міністэрства фінансаў дазволіла выдаць у пазыку сялянам хлеб з эканамічных запасаў. Пакідаліся на аброку невялікія маёнткі, з дазволам сялянам кароткачасовых адлучак на заработкі. Дэпартамент дзяржмаёмасцей прадпісаў віцебскай і гродзенскай казённым палатам надзяляць дадаткова сялян зямлёй, расчышчанай з-пад лясных зараснікаў[56].

Для кіравання паманастырскімі маёнткамі часова прызначаліся адміністратары, але, паводле прызнання надворнага саветніка Архіпава, камандзіраванага Міністэрствам фінансаў у Гродзенскую губерню, "казённая палата, нават пры самым строгім наглядзе, не ў стане адхіліць злоўжыванні, якія там могуць быць". Ён даносіў 9 сакавіка 1833 г., "што дваранін Косця, прызначаны адміністратарам у фальварак Кватары, без дазволу казённай палаты прадае таемна розны хлеб і авечую воўну і ўтрымлівае за кошт таго маёнтка вялікую колькасць людзей, што складаюць уласных яго слуг"[57].

Віленскі генерал-губернатар М. А. Далгарукаў прапаноўваў адразу ж адмяніць арэндную сістэму і перавесці паманастырскіх сялян на

аброчнае становішча, каб "сяляне, якія заставаліся ў распараджэнні ўладальнікаў духоўнага звання", адчулі "невыгоднасць свайго становішча ў параўнанні з першымі"[58]. Міністэрства ж фінансаў, спасылаючыся на нязначнасць, раздробленасць і раскіданасць паманастырскіх маёнткаў, адмовілася ад люстрацыі і, пакінуўшы павіннасці сялян на вырашэнне губернатараў, аддавала іх з 1833 г. у кароткатэрміновую арэнду. Улічаныя даходы прызначаліся на ўтрыманне прытулкаў, вучылішчаў і духавенства скасаваных манастыроў. 15 верасня 1838 г. ужо Міністэрства дзяржмаёмасцей распарадзілася аддаваць паманастырскія вёскі ў 12-гадовае арэнднае трыманне з умовай правядзення люстрацыі ў рамках агульнай рэформы дзяржаўных маёнткаў[59].

Царскі ўрад паступова рыхтаваў зліццё уніяцкай царквы з праваслаўнай, што было завершана Полацкім царкоўным саборам 1839 г. У 1828 і 1835 гг. быў закрыты шэраг манастыроў уніяцкага ордэна базыльянаў, але маёнткі іх, што падлягалі арэндаванню на ўзор казённых, прыпісваліся да уніяцкіх прыходскіх цэркваў[60]. Урад праяўляў крайнюю асцярожнасць і пакідаў на некаторы час уніяцкаму духавенству маёнткі. Толькі ў 1833 і 1834 гг., калі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях узніклі хваляванні на рэлігійнай глебе, у рымска-каталіцкага і уніяцкага духавенства былі адабраны пяць маёнткаў і ўстаноўлена казённае кіраванне яшчэ адным у сувязі з пераводам сялян у праваслаўе. Пауніяцкія вёскі, дзе па VIII рэвізіі (1834 г.) лічылася 2894 душы мужчынскага полу, аддаваліся ў арэнду, а з 1838 г. праводзілася іх люстрацыя паводле правіл, устаноўленых для маёнткаў, канфіскаваных у паўстанцаў 1830 – 1831 гг.[61]

Распаўсюдзіўшы на заходнія губерні агульнаімперскае заканадаўства, царскі ўрад стаў дзейнічаць больш рашуча. Са спасылкай на тое, "як непрыстойна духоўнай асобе адрывацца ад яго прамых святарных абавязкаў", 25 снежня 1841 г. быў падпісаны шэраг указаў аб прыёме ў дзяржаўную маёмасць усіх населеных маёнткаў вышэйшага праваслаўнага і іншавернага духавенства заходніх губерняў[62]. 10 мая 1843 г. з'явіліся ўказы аб перадачы ў казну населеных маёнткаў прыходскіх цэркваў[63], а 28 лютага 1844 г. – маёнткаў, выдзеленых па эксдывізіях ва ўласнасць каталіцкага духавенства[64]. Пры гэтым на ўвазе мелася рэзалюцыя Мікалая І Камітэту па справах заходніх губерняў, што "зусім не мяркуецца адабраць у духавенства яго набытак, але адхіліць ад кіравання, прыняўшы яго на

Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, выдаючы з яго ўтрыманне духавенству параўнальна з агульнай масай даходаў"[65].

Прыём духоўных маёнткаў меркавалася закончыць у пачатку 1842 г. і адразу ж прыступіць да іх люстрацыі з пераводам сялян на аброк і арганізацыяй новага сельскага ўпраўлення. Гэта адпавядала правядзенню ў жыццё асноўных палажэнняў рэформы, ажыццяўляемай П. Дз. Кісялёвым у дзяржаўнай вёсцы. Для прыёму маёнткаў ствараліся спецыяльныя камісіі са станавога прыстава, чыноўніка губернскай палаты дзяржаўных маёмасцей і духоўнага дэпутата. Аднак прыём зацягнуўся, і Кісялёў ухваліў прапанову Міркавіча аб пакіданні на 1 год у адміністрацыйным кіраванні тых маёнткаў, якія акажуцца на паншчынным становішчы. У губерні былі пасланы міністэрскія чыноўнікі для правядзення рэвізіі падухоўных маёнткаў. 10 мая 1842 г. выйшаў указ Сената аб залічэнні духоўных сялян у агульны склад дзяржаўных і ўраўноўванні іх з дзяржаўнымі ва ўсіх адносінах[66].

Прыём у казну населеных маёнткаў прыходскага іншавернага духавенства пачаўся толькі 1 верасня 1843 г. і павінен быў закончыцца да студзеня 1844 г. Духоўныя ўладальнікі скарысталіся гэтым і пачалі спусташаць маёнткі, абцяжарваючы сялян павіннасцямі, што намнога перавышалі павіннасці дзяржаўных сялян. У цыркуляры ад 29 лістапада 1843 г. палатам дзяржмаёмасцей заходніх губерняў Кісялёў прадпісаў неадкладна замяніць духоўнае кіраванне казённым, зрабіць распараджэнні для аблягчэння сялян у павіннасцях і засеву азімых палёў яравым збожжам[67]. Прыём у казну населеных маёнткаў прыходскага праваслаўнага духавенства ажыццяўляўся ў 1845 г[68]. Па стане на 31 кастрычніка 1845 г. з падухоўных прыходскіх маёнткаў Гродзенскай губерні 44 былі аддадзены пасля выпраўлення інвентароў у арэнду, 6 знаходзіліся ў кіраванні адміністратараў, а 32 пераведзены на пазямельнае аброчнае становішча[69]. Прыём традыцыйных і закладных маёнткаў праводзіўся без якіх-небудзь змен для сялян, не ўключаючы іх у агульную масу дзяржаўных. Выдзеленыя па эксдывізіях прымаліся ў казну, "распаўсюдзіўшы на сялян гэтых маёнткаў усе існуючыя ў Зводзе законаў пастановы аб дзяржаўных сялянах"[70].

Усяго ў складзе дзяржаўных маёмасцей пяці беларускіх губерняў (1847 г.) лічылася 546 падухоўных маёнткаў і 87 269 рэвізскіх душ, 1/3 з якіх прыходзілася на Віленскую губерню (табл. 3). Асноўная маса зямельных уладанняў была адабрана ад каталіцкага духавенства, бо

праваслаўная царква мела параўнальна невялікую колькасць сялян. Люстрацыя падухоўных маёнткаў, што праводзілася ў другой палове 40-х гг., канчаткова зліла іх з масай дзяржаўных.

*Табліца 3*[71]

**Колькасць духоўных маёнткаў і сялян, паступіўшых у казну. 1847 г.**

| Губерня | Маёнткаў | Душ мужчынскага полу | |
|---|---|---|---|
| | | рэвізскіх | у наяўнасці |
| Віленская | 219 | 29 488 | 29 361 |
| Віцебская | 45 | 13 687 | 12 836 |
| Гродзенская | 138 | 19 657 | 19 708 |
| Мінская | 105 | 18 618 | 18 677 |
| Магілёўская | 39 | 5 819 | 5 985 |
| *Усяго* | 546 | 87 269 | 86 567 |

Вышэйшае духавенства, незадаволенае пазбаўленнем матэрыяльных сродкаў, пастаралася зрабіць усё, каб законнымі ці незаконнымі шляхамі пакінуць у сваім распараджэнні найбольшую колькасць зямлі. Пад націскам царкоўных іерархаў Міністэрства дзяржаўных маёмасцей не заўсёды рашуча ішло на ліквідацыю рэшткаў сярэдневякоўя, што выявілася ў захаванні некаторых павіннасных абавязкаў сялян у адносінах да духавенства. Неапраўдана зацягвалася перадача ў казну асобных маёнткаў. Таму царква яшчэ ў 1851 г., знайшоўшы розныя прычыны, утрымлівала ў сваіх руках больш 5 тыс. рэвізскіх душ; удзельная ж вага іх сярод сялянскіх разрадаў з часоў VII рэвізіі скарацілася ад 5,4 да 0,4 % (гл. табл. 1).

"Сяляне, – па словах кіеўскага генерал-губернатара Дз. Г. Бібікава, – цалкам разумелі аказваемае ім дабрадзейства, выяўлялі ўсеагульнае задавальненне і сустракалі чыноўнікаў, што прымалі маёнткі (у казну), з хлебам і соллю"[72]. Хоць у сапраўднасці карціна была не такой ідылічнай, як паказвалі яе афіцыйныя асобы, тым не менш працэс секулярызацыі ў цэлым прыхільна ўспрымаўся сялянскай масай. Хваляванні ў паманастырскай і падухоўнай вёсках узнікалі толькі на глебе злоўжыванняў старой і новай адміністрацыі і патрабаванняў сялянамі неадкладнага пераводу на аброк[73]. У складзе дзяржаўных у сувязі з рэформай П. Дз. Кісялёва ім адкрываліся лепшыя прававыя і сацыяльныя перспектывы.

* * *

З секулярызацыяй царкоўных уладанняў было звязана і афіцыйнае афармленне катэгорыі сялян-služак пры архірэйскіх дамах і манастырах. Раней архірэйскія і манастырскія служкі выбіраліся на нявызначаны тэрмін з сялян для адбывання павіннасцей пры праваслаўных і уніяцкіх архірэйскіх дамах і манастырах. У Расійскай імперыі іх статус упершыню быў афіцыйна вызначаны пастановай аб духоўных маёнтках ад 26 лютага 1764 г. У сувязі з адабраннем апошніх у казну архірэйскія дамы і манастыры атрымалі права мецьслужак з ліку сялян бліжэйшых секулярызаваных вёсак па колькасці і памеры іх жалавання згодна з асобымі штатамі, у залежнасці ад класу гэтых дамоў і манастыроў.

Каталіцкія манастыры таксама трымалі на паслугах сялян з уласных маёнткаў, але пасля пазбаўлення маёнткаў указам ад 20 ліпеня 1848 г. ім прызначаліся служкі з дзяржаўных сялян каталіцкага веравызнання[74]. У гэтую катэгорыю траплялі маладыя (з 15 гадоў), пераважна вызваленыя ад рэкруцкага набору і менш патрэбныя ў гаспадарцы сяляне, бабылі, па 1 – 2 ад маёнтка[75]. Як і царкоўныя старасты, на гэты час яны выключаліся з падушнага акладу і вызваляліся, праўда на практыцы не заўсёды, ад грамадскіх і інвентарных работ і павіннасцей[76].

Палажэнне Дзяржаўнага савета, зацверджанае царом 31 сакавіка 1832 г., і далейшыя распараджэнні Міністэрства дзяржаўных маёмасцей падрабязна рэгламентавалі спосабы папаўнення гэтай катэгорыі пераважна з дзяцей служак і, толькі пры недахопе апошніх, прызначэння туды новых сялян на тэрмін не менш 20 гадоў. Былі прыняты захады да “выраўноўвання гэтай павіннасці” сярод сельскіх грамад дзяржаўных сялян шляхам устанаўлення між імі чарговасці.

Паводле IX рэвізіі (1850) штатных служак пры архірэйскіх дамах і манастырах лічылася: у Віцебскай губерні – 181, Гродзенскай – 70, Мінскай – 344 душы мужчынскага полу[77]. Мінская губерня, пасля Кіеўскай, лідзіравала па колькасці гэтай катэгорыі насельніцтва ва ўсёй тагачаснай Расійскай імперыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

[1] *Мараш Я. Н.* Из истории борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви. Мн., 1969. С. 11, 14.

[2] *Мелешко В. И.* Очерки аграрной истории... С. 54.

[3] Гл.: *Мараш Я. Н.* Положение крестьян в монастырских владениях католической церкви западных районов Белоруссии второй половины XVIII в. // Материалы по истории сельского хозяйства и крестьянства СССР. М., 1974. Сб. 8. С. 152–179.

[4] Ручной словарь, или краткое содержание польских и литовских законов. Спб., 1810. С. 63, 124, 151.

[5] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 27.

[6] Цыт. па: *Толстой Д. А.* Римский католицизм в России. Спб., 1876. С. 46.

[7] ПСЗ-I. Т. 19. № 13922, 14073, 14122.

[8] Падлічана па: РДАСА, ф. 248, воп. 64, спр. 5607, арк. 450–451 адв., 457–460.

[9] РДВГА, ф. ВУА, спр. 18359, арк. 14.

[10] РДАСА, ф. 16, спр. 244, арк. 169 адв.–170.

[11] Сборник документов, касающихся административного устройства Северо-Западного края при императрице Екатерине II (1792 – 1796). Вильна, 1903. С. 46.

[12] Падлічана па: РДАСА, ф. 16, спр. 244, арк. 11 адв.–18 адв., 26 адв.–28 адв.

[13] РДАСА, ф. 16, спр. 244, арк. 20; РДГА, ф. 1374, воп. 1, спр. 211, арк. 5, 9 адв.; ДГА Літвы, ф. 378, 1796 г., спр. 113, арк. 3; ф. 515, воп. 22, спр. 37; ф. 1219, воп. 1, спр. 615; спр. 739, арк. 2.

[14] Сб. РИО. Т. 16. С. 543–544.

[15] ДГА Літвы, ф. 378, 1797 г., спр. 9, ч. 1, арк. 411–412; ф 1219, воп. 1, спр. 161; спр. 223, арк. 1–7.

[16] *Тамсама*, ф. 515, воп. 22, спр. 54, арк. 6–7.

[17] Падлічана па: ДГА Літвы, ф. 525, воп. 13, спр. 4, арк. 2–5.

[18] *Конюхова Т. А.* Государственная деревня Литвы... С. 36.

[19] Архив Государственного совета. Спб., 1888. Т. 2. С. 567.

[20] Гл.: *Мараш Я. Н.* Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569 – 1795). Мн., 1971. С. 236.

[21] РДГА, ф. 1281, воп. 11, спр. 81, арк. 6, 68 адв.

[22] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 189–191.

[23] *Блинова Т. Б.* Иезуиты в Белоруссии. Мн., 1990. С. 97.

[24] *Мараш Я. Н.* Землевладения иезуитов в Белоруссии в XVI – XVIII вв. // Проблемы аграрной истории: В 2 ч. Мн., 1978. Ч. 1. С. 92.

[25] Падлічана па: РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 2043, арк. 10–17.

[26] ДАРФ, ф. 109, 4 эксп., 1851 г., спр. 200, арк. 136–139, 151.

[27] Гл.: *Улащик Н. Н.* Крепостная деревня Литвы и Западной Белоруссии накануне реформы 1861 года // Вопросы истории. 1948. № 12. С. 56–57.

[28] Бумаги императрицы Екатерины II, хранящиеся в государственном архиве Министерства иностранных дел. Спб., 1874. Т. 3. С. 248.

[29] РДАСА, ф. 248, воп. 64, спр. 5607, арк. 359.

[30] РДАСА, ф. 16, спр. 381, арк. 113; спр. 382, арк. 483.

[31] ПСЗ-I. Т. 38. № 28863, 28999.

[32] РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 687, арк. 13.

[33] Гл. укладку ў кн.: Крестьянское движение в России в 1796 – 1825 гг.: Сб. документов. М., 1961. С. 720–721.

[34] Русская старина. 1901. № 2. С. 394–395.

[35] ДАРФ, ф. 1165, воп. 1, спр. 95, арк. 10 адв.

[36] РДВГА, ф. ВУА, спр. 761, арк. 20–21.

[37] Русская старина. 1897. № 11. С. 384.

[38] РДГА, ф. 1589, воп. 1, спр. 943, арк. 80–81.

[39] Гл.: ПСЗ-II. Т. 14. № 11954; Т. 20. Прибавление к т. 11. № 9770а.

[40] Русский архив. 1890. Кн. 1. С. 429.

[41] Сборник статей, разъясняющих польское дело по отношению к Западной России. Вильна, 1887. Вып. 2. С. 306.

[42] ДГА Літвы, ф. 378, 1832 г., спр. 2279, арк. 1.

[43] *Лебедев Н. А.* Граф Павел Дмитриевич Киселев // Русская старина. 1880. № 11. С. 630.

[44] РДГА, ф. 1589, воп. 1, спр. 943, арк. 58–59.

[45] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 31, воп. 2, спр. 11, арк. 7–9, 62–63.

[46] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 4. С. 102.

[47] Гл.: ПСЗ-II. Т. 7. № 5506.

[48] *Зинченко А. Л.* Реформа государственной деревни и секуляризация церковного землевладения в западных губерниях Российской империи // Исторические записки. Т. 112. С. 103–104.

[49] Сб. ИМ. Спб., 1896. Вып. 8. С. 48.

[50] РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 1395, арк. 61–76.

[51] *Тамсама*, спр. 1403, арк. 69–76.

[52] *Тамсама*, спр. 1415, арк. 68–85.

[53] *Тамсама*, спр. 1420, арк. 3–4.

[54] *Тамсама*, спр. 1424, арк. 88–102.

[55] РДГА, ф. 384, воп. 1, спр. 7, арк. 21–22.

[56] *Тамсама*, ф. 379, воп. 3, спр. 1403, арк. 84–85; спр. 1424, арк. 43–54; ф. 384, воп. 1, спр. 7, арк. 74–75.

[57] РДГА, ф. 379, воп. 3, спр. 1415, арк. 21, 48–49.

[58] ЧОИДР. 1864. Кн. 1. Отд. V. С. 196.

[59] РДГА, ф. 384, воп. 1, спр. 888, 890, 923; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 31, воп. 2, спр. 47.

[60] Русская старина. 1870. Кн. 1. С. 533 – 534, 548 – 549; Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 4. С. 122.

[61] Общее обозрение состояния государственных имуществ по губерниям, подведомственным второму департаменту. Спб., 1841. С. 4.

[62] ПСЗ-II. Т. 16. № 15152, 15153; Московские ведомости. 1842. № 4.

[63] ПСЗ-II. Т. 18. № 16828, 16829.

[64] *Тамсама*. Т. 19. № 17673.

[65] РДГА, ф. 1266, воп. 1, спр. 26, арк. 230 адв.– 231.

[66] РДГА, ф. 384, воп. 2, спр. 1130, арк. 1–2; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 31, воп. 2, спр. 223а, арк. 1–4, 213–214, 431, 988; спр. 247, арк. 77; спр. 326, арк. 4.

[67] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 31, воп. 2, спр. 326, арк. 2, 419.

[68] *Тамсама*, спр. 346.

[69] РДГА, ф. 384, воп. 2, спр. 1130, арк. 55.

[70] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 31, воп. 2, спр. 335, арк. 4, 17.

[71] РДГА, ф. 384, воп. 2, спр. 1130, арк. 85–86.

[72] Цыт. па: *Семевский В. И.* Крестьянский вопрос в России... Т. 2. С. 493.

[73] Гл.: *Конюхова Т. А.* Крестьянское движение... С. 418; *Чепко В. В.* Классовая борьба... С. 169, 189.

[74] ДГА Літвы, ф. 515, воп. 19, спр. 211, арк. 3; ПСЗ-II. Т. 5. № 3908; Т. 14. № 11954; Т. 23. № 22458.

[75] ДГА Літвы, ф. 515, воп. 5, спр. 212.

[76] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 748, арк. 5; ф. 2, воп. 21, спр. 603; ПСЗ-II. Т. 12. № 9918, 10111.

[77] *Вешняков В.* Исторический обзор происхождения разных названий государственных крестьян // Журнал Министерства государственных имуществ. 1857. № 1. С. 27–35.

# Глава 4

## НІВЕЛІРОЎКА СПЕЦЫЯЛЬНЫХ КАТЭГОРЫЙ СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

Акрамя асноўных груп сялянства (памешчыцкіх, дзяржаўных і царкоўных), у беларускай вёсцы існавалі адносна нешматлікія катэгорыі непрыгоннага ці паўсвабоднага насельніцтва, якія надавалі ёй своеасаблівы сацыяльны і нацыянальна-рэлігійны каларыт і былі прадметам адмысловых клопатаў як землеўласнікаў, так і царскіх улад. І тыя, і другія імкнуліся зліць гэтыя катэгорыі (назавём іх спецыяльнымі) з асноўнай масай эксплуатуемага сялянства. Аднак гэтыя спецыфічныя катэгорыі насельніцтва звычайна аказвалі супраціўленне уніфікацыі, калі яна суправаджалася звужэннем іх ранейшых правоў і пагаршала эканамічнае становішча.

Між тым рэальная "свабода" гэтых катэгорый была даволі адноснай. Па прызнанні прадстаўніка царскай адміністрацыі, гродзенскага губернатара Мураўёва, "усе гэтыя свабодныя саслоўі, наколькі заўважыць можна з інвентароў і інструктароў мястэчак, абкладзены разнароднымі павіннасцямі ў сэнсе добраахвотных умоў і звыш таго ў мястэчках падпарадкоўваюцца розным паборам самым нявызначаным, якія часта супярэчаць карэнным існуючым узаконеням і абмяжоўваюць промысел"[1]. Таму меў рацыю Карл Маркс, калі, канспектуючы кнігу Гакстгаўзена "Сельскі лад Расіі" (Лейпцыг, 1866), два разы паправіў аўтара і назваў незапрыгоненых сялян, што жылі на чужой прыватнаўласніцкай зямлі, квазі-вольнымі[2].

Фінансавыя і адміністрацыйныя інтарэсы абсалютысцкай дзяржавы патрабавалі ўстаранення саслоўных перагародак і юрыдычнага афармлення разнастайных земляробскіх катэгорый, зраўноўваючы іх з асноўнай масай сялянства. У прадпісанні Кацярыны II аб правядзенні пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай перапісу душ ва ўсходнебеларускіх губернях дазвалялася прызнаваць адметны стан сялян толькі ў тым выпадку, калі апошнія дакументальна і ўмовамі існавання змогуць даказаць свае перавагі[3]. Зразумела, што гэта ўдавалася зрабіць нямногім. Адміністрацыя імкнулася да павелічэння колькасці прыгоннага насельніцтва і запісвала ў рэвізскіх сказках за землеўласнікамі тых, хто карыстаўся адноснай свабодай.

Перапісны прэс нівеліраваў перш за ўсё прадстаўнікоў некалі шматлікай катэгорыі сялян-слуг, якія праўлялі вайсковыя і іншыя абавязкі, што патрабавалі спецыяльных навыкаў, і таму займалі прывілеяванае становішча. Да гэтага часу цэлыя разрады сельскіх рамеснікаў і сельскагаспадарчых слуг знікалі па меры таго, як развіццё рамяства і гандлю падточвала феадальныя вытворчыя адносіны, у рамках якіх яны працавалі. Значэнне ранейшых функцый сялян-слуг адыходзіла на другі план, а землеўладальнікі ператваралі іх у чыншавых, радзей – у цяглых прыгонных. Па сутнасці, да канца XVIII ст. захаваліся толькі асочнікі і часткова стральцы, што зберагалі пушчы і дзічыну, баяры-зямяне, што выконвалі пераважна паліцэйска-кур'ерскую службу, і абслугоўваючыя фальваркі гуменныя і мельнікі[4]. Хоць ураду былі добра вядомы правы і прывілеі служылых людзей[5], ён не спяшаўся пацвярджаць іх. Ва ўсходняй частцы Беларусі сяляне-слугі былі запісаны па прыналежнасці ў склад памешчыцкіх, дзяржаўных, дварцовых і духоўных сялян.

У цэнтральнай і заходняй частках Беларусі ў сувязі з паўстаннем 1794 г. расійскі ўрад вымушаны быў праводзіць больш гнуткую сацыяльна-саслоўную палітыку і афіцыйна прызнаваць існаванне некаторых спецыфічных груп сельскага насельніцтва. Тут ваенна-служылыя людзі па прад'яўляемых дакументах вызначаліся нават у дваранскае саслоўе (шляхту), вялікая колькасць іх была прызнана свабоднымі[6]. Паводле V рэвізіі (1795) у Віленскай і Слонімскай губернях, пераважна ў першай, лічылася 117 084 мужчынскага і 111 215 жаночага полу вольных сялян, што мелі права перамяшчэння[7].

Сяляне-слугі, пакінутыя ў складзе прыватнаўласніцкіх ці дзяржаўных, поўнасцю залежалі ад волі ўладальнікаў, але змаглі яшчэ доўгі час і ў назве захоўваць асаблівасці свайго становішча і эксплуатацыі. Барон фон Кампенгаўзен, які праязджаў у пачатку XIX ст. праз Віцебскую і Магілёўскую губерні, заўважыў сярод сялянства зямян, што называлі сябе шляхціцамі. З яго слоў, “яны служаць лёкаямі і наглядчыкамі; плоцяць пану па чатырнаццаць рублёў у год; носяць шаблі, белыя каптаны, чорныя шапкі і паясы”[8]. Характэрную эвалюцыю ваенна-служылых людзей паказваюць інвентары ўладання Смаргонь. Нягледзячы на павелічэнне ў другой палове XVIII ст. удзельнай вагі баяраў і зямян (па інвентары 1788 г. складалі адпаведна 61 і 167 двароў з усіх 515 у маёнтку), яны ўжо плацілі высокі грашовы аброк, а замест ранейшых

вайсковых абавязкаў зрэдку неслі паліцэйскую службу[9]. Да 1831 г. колькасць зямянскіх двароў скарацілася да 77. Граф Праздзецкі (уладальнік Смаргоні да 1831 г.) паводле свайго меркавання пераводзіў зямян пры нявыплаце належнага чыншу ў паншчынных (цяглых) сялян і наадварот[10].

Практыка запрыгоньвання выклікала ў адказ частыя і ўпартыя выступленні раней прывілеяваных груп сельскага насельніцтва. 9 ліпеня 1834 г. Ваўкавыскі павятовы суд даносіў гродзенскаму губернатару, "што дапушчэнне сялян мець у сябе ад былых польскіх каралёў прывілеі і іншыя розныя выпіскі на польскай мове спараджае вялікае зло, бо яны, не разумеючы ні сілы такіх, ні важнасці тых пры цяперашнім расійскім урадзе, тлумачаць скажона, разносяць свае перавагі, праз гэта з'яўляюцца непаслушэнствы і розныя між чэрню недарэчныя чуткі, якія выклікаюць наступствы самыя шкодныя"[11]. Нямногім удалося адстаяць свае правы ці вырвацца з-пад улады прыватных уладальнікаў.

Выключэнне склалі лясныя слугі (асочнікі, стральцы і інш.), што найлепш захаваліся на працягу XVI – XVIII ст. Справа ў тым, што з развіццём таварна-грашовых адносін і магчымасцю збываць лесаматэрыялы на ўнутраным і знешнім рынках лясы станавіліся ўсё больш каштоўнай крыніцай прыбытку землеўласнікаў. Гэтая акалічнасць абумоўлівала іх узмоцненую ахову і рацыянальнае выкарыстанне. У 60 – 70-х гг. XVIII ст. кіраўнік каралеўскіх маёнткаў (эканомій) на Беларусі і Літве А. Тызенгаўз правёў шэраг рэформ. У складзе Кіраўніцтва эканоміямі, якое знаходзілася ў Гродне, быў створаны Лясны дэпартамент на чале з аўдытарам і рэгентам. У распараджэнне дэпартамента са складу эканомій вылучаліся вёскі, што размяшчаліся ў лясах ці знаходзіліся паблізу. Гэтыя паселішчы аб'ядноўваліся ў лясніцтвы[12].

Непасрэднай аховай і доглядам лесу, выкарыстаннем яго багаццяў займаліся так званыя слугі, якія выбіраліся пераважна з сялян. Кожны з іх меў свае дакладна вызначаныя абавязкі, асабліва ў час арганізацыі каралеўскіх паляванняў, калі галоўную ролю адыгрывалі стральцы. Развядзеннем і ўтрыманнем пчол у штучных дуплах-борцях займаліся бортнікі. Палявалі на баброў, здабывалі іх футра і мяса баброўнікі. Асноўныя абавязкі па ахове пушчаў выконвалі асочнікі. Рознымі былі і памеры зямельных участкаў, якімі карысталіся лясныя

слугі. У больш прывілеяваным становішчы знаходзілася вышэйшая лясная адміністрацыя – ляснічыя, падляснічыя, бухгалтары, пісары. За сваю работу яны атрымлівалі прадукты, грошы і зямлю, якую апрацоўвалі прыгонныя. Намнога большыя за сялянскія зямельныя ўчасткі атрымлівалі стражнікі, якія набіраліся пераважна са шляхты. Сяляне ў лясніцтвах павінны былі выконваць не толькі функцыі лясных слуг, але і абслугоўваць увесь складаны гаспадарчы комплекс, куды ўваходзілі рэкі і азёры, лугі і пашы, дарогі і масты, палі і г. д. Паступова, калі значэнне палявання знізілася і павялічылася гаспадарчае асваенне лесу, лясных абавязкаў у сялян стала менш, іх пачалі абкладаць звычайнымі феадальнымі павіннасцямі. У канцы XVIII ст. сялян, прымацаваных да лясоў Гродзенскага, Брэсцкага і Кобрынскага лясніцтваў, было 8482 душы абодвух полаў, колькасць двароў – 1211. Яны складалі 7 так званых кватэр (падлясніцтваў), 14 фальваркаў і 6 ключоў[13].

Пры падараваннях царскім урадам дзяржаўных маёнткаў рускім памешчыкам апошнія квапіліся і на лясныя багацці. Так, відныя военачальнікі фельдмаршалы П. А. Румянцаў і А. В. Сувораў жадалі далучыць да сваіх новых уладанняў лясы, дзе жывуць "дзікія каровы" (г. зн. зубры). Як выключэнне, яны атрымалі Кобрынскае і частку Брэсцкага лясніцтваў. А ўвогуле Кацярына II 4 снежня 1795 г. зацвердзіла прадстаўленне генерал-губернатара М. В. Рапніна "адносна зберажэння... казённых лясоў, каб яны захаваны былі... для... дзяржаўных патрэб"[14]. "У сувязі з такім распараджэннем, якое робіцца на карысць казны і цэласці лясоў, – даносіў грамадзянскі губернатар А. Булгакаў у Пецярбург, – я лічу неабходным, каб належачых ужо і прыпісваемых да лясніцтваў вёсак з іх душамі ў партыкулярнае ўладанне не даравацъ, так як лясы, за аддачай сялян, застаючыся без належнага нагляду і ачышчэння, зусім знішчаны будуць"[15]. 11 ліпеня 1797 г. Рапнін распарадзіўся пакінуць падараваныя ў Белавежскай пушчы генералу Дуніну вёскі Ціхая Воля, Баркі і Яловікі "пры той жа павіннасці ў казённым упраўленні" і замяніць іх раўназначнымі па колькасці сялян з Брэсцкай эканоміі[16]. Такім чынам, у адрозненне ад масы сялян каралеўскіх эканомій лясныя слугі ўвогуле былі захаваны ад падараванняў царскім прыдворным і пакінуты ў казённым ведамстве. Па даных на 11 сакавіка 1797 г., у трох кватэрах Гродзенскага лясніцтва знаходзіліся 382 два-

ры, 1381 мужчынскага і 1296 жаночага полу душ і ў трох кватэрах Брэсцкага лясніцтва адпаведна 132, 633 і 556[17].

Як і ўсе дзяржаўныя маёнткі, лясніцтвы аддаваліся ў арэнду прыватным асобам. Часовыя ўладальнікі мала клапаціліся аб захаванні і доглядзе казённых лясоў, а больш аб уласнай выгодзе. У такіх умовах спецыфічныя абавязкі сялян усё больш адыходзяць на другі план і замяняюцца адбыццём паншчыны ў лясных фальварках. Лясныя слугі змагаліся за захаванне сваіх ранейшых абавязкаў і прывілеяў, якія выгадна адрознівалі іх ад асноўнай масы эксплуатуемага сялянства.

У 1809 г. сяляне Гродзенскага лясніцтва адмовіліся выконваць павіннасці віцэ-губернатару Максімовічу, спасылаючыся на дакументы, што вызвалялі іх ад паншчыны. Па загадзе цара яны былі прыведзены да паслушэнства, а кіраўнікі выступлення аддадзены пад суд. У 1821 г. у сялян лясніцтва адабралі Трацяковыя лугі, расчышчаныя яшчэ іх продкамі ад зараснікаў[18]. Аднак барацьба працягвалася, сяляне звярталіся са скаргамі на дзеянні адміністрацыі ў розныя інстанцыі. У 1823 г. лясное кіраўніцтва задаволіла патрабаванне сялян вёскі Замасцяны аб замене трохдзённай паншчыны, якую адбывалі на карысць арандатара, грашовым аброкам. Неўзабаве яны адмовіліся выконваць і гэтую павіннасць. 3 снежня 1826 г. міністр фінансаў у пісьме да гродзенскага губернатара адзначыў, што тыя сяляне вясной вымушаны былі з-за недахопу хлеба харчавацца агароднінай і рознымі травамі. Чыноўнікі казённай палаты, пасланыя для рэвізіі Гродзенскага лясніцтва, вымушаны былі канстатаваць перавышэнні павіннасцей і грашовых плацяжоў у параўнанні з зацверджанымі ў інвентары і разбазарванне арандатарам Максімовічам дзяржаўнай маёмасці[19]. Узмацненне феадальнай эксплуатацыі лясных слуг адмоўна ўплывала на стан лясоў і лясную гаспадарку.

Для ўзмацнення аховы дзяржаўных лясоў царскі ўрад прыняў палажэнне аб пастаяннай лясной варце, што выбіралася з дзяржаўных сялян, якія вызваляліся ў сувязі з гэтым ад іншых павіннасцей. Гэтае палажэнне стала прымяняцца ў Гродзенскай губерні з 1849 г.[20], і на яго аснове, відаць, было перагледжана становішча лясных слуг. Паводле X рэвізіі (1858) сярод дзяржаўных сялян мужчынскага полу налічвалася 23 у Віцебскай і 1399 у Гродзенскай губернях лясных вартаўнікоў[21].

Вайсковая неабходнасць выклікала з'яўленне катэгорыі выбранцаў (выбраных з сялян). У сувязі з недахопам і нежаданнем шляхты, якая служыла конна, папаўняць рады пяхоты, апошняя па законе, абнародаваным каралём Стэфанам Баторыем у 1571 г., камплектавалася з сялян. Сейм 1590 г. устанавіў норму адбору сялян для службы ў пяхоце: адзін чалавек ад 20 дымоў (сялянскіх гаспадарак) каралеўскіх эканоміяў і старостваў[22]. З абвастрэннем сацыяльнай і нацыянальна-рэлігійнай барацьбы ў пануючага саслоўя расло недавер'е да выбранецкай пяхоты, якая і была ліквідавана ў бурным 1649 г.

Аднак выбранцы як група ваенна-служылага насельніцтва захаваліся ў належаўшых князям Радзівілам вёсках Сярагі, Варкавічы, Лучнікі, Агароднікі, Бранавічы і Падзёры. Яны атрымоўвалі "ў вечнасць" зямельныя надзелы ад 0,5 да 1,5 валокі і няслі службу ў Слуцкім гарнізоне. Радзівілы, якія актыўна ўдзельнічалі ў ваенна-палітычнай барацьбе, забяспечылі з 1654 па 1805 г. колькасны рост выбранецкага насельніцтва ад 50 – 80 да 1500 чалавек[23].

У праектах набору войскаў канфедэратаў і прыцягнення ў якасці наёмнікаў жыхароў Рэчы Паспалітай у расійскую армію выбранцы адсутнічалі[24]. Вялікі князь Павел у 1779 г. адмовіўся ад плана вярбоўкі ў армію насельніцтва ўсходняй часткі Беларусі, так як у гэтых "правінцыях не толькі вольных людзей няма, але амаль усе падданыя памешчыцкія, за выняткам самага малога ліку вызваленых"[25]. Магчымасці адраджэння і захавання выбранцаў былі канчаткова перакрэслены палітыкай сацыяльнага недаверу да прыгнечаных сялянскіх мас, якую цвёрда праводзіла Кацярына II. У сакрэтным рэскрыпце ад 12 ліпеня 1793 г. на імя барона Ігельстрома прадпісвалася "прыняць за правіла пры знішчэнні войскаў Рэспублікі зноў прыводзіць іх у той стан і на той манер, як яны раней былі... ды каб і надалей па магчымасці складваліся яны адным шляхецтвам ці вольнапісанымі, знішчаючы пераважна, калі магчыма, тыя палкі, якія складзены з рэкрутаў, набраных з сялян"[26].

У 1808 г. Дамінік Радзівіл зрабіў спробу перавесці выбранцаў на паншчыну. У адказ сяляне шасці вёсак, па словах мінскага губернатара, "уздумаўшы, што яны свабодныя ад падданства, намерваліся адхіліцца ад належнага падпарадкавання памешчыку"[27]. Вынікам працяглай і ўпартай барацьбы было тое, што выбранцаў пакінулі пры ранейшых чыншавых абавязках і залічылі па рэвізіі

1811 г. у разрад вольных хлебаробаў. Працяглы судовы працэс выбранцаў з Радзівіламі, а потым з Вітгенштэйнамі, якія змянілі іх, закончыўся ў 1834 г. рашэннем Дзяржаўнага савета, зацверджаным Мікалаем I, згодна з якім выбранцы (866 душ мужчынскага полу) былі прызнаныя свабоднымі, але землі, якія яны займалі, – уласнасцю памешчыка[28]. Выбранцы адмовіліся плаціць чынш за зямлю, і ўрад намерваўся перасяліць іх на казённыя землі Прычарнамор'я. Але пасля паўстання 1830 – 1831 гг., улічваючы праваслаўнае веравызнанне выбранцаў, ён адмовіўся ад гэтага праекта. Вітгенштэйн згаджаўся прадаць землі выбранецкіх вёсак у казну толькі з горадам Слуцкам і наваколлямі. Слуцк з'яўляўся павятовым цэнтрам, і таму ўрад прыняў гэтую ўмову, а Вітгенштэйн у 1846 г. згадзіўся на прапанаваную яму суму[29].

На ўсходзе Віцебскай губерні пражывалі панцырныя баяры – нашчадкі былой пагранічнай варты Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Яны набіраліся з незапрыгоненага насельніцтва і атрымлівалі за нясенне вайсковай службы зямельныя надзелы са спадчынным правам. З усіх груп ваенна-служылага насельніцтва ў Вялікім княстве Літоўскім панцырныя баяры былі найбольш прыбліжаны да шляхецкага саслоўя.

У складзе Расійскай імперыі функцыі аховы ранейшай граніцы ВКЛ адпалі. Панцырныя баяры паводле перапісу 1772 г. былі залічаны да дварцовых сялян і нават пачалі даравацца рускім памешчыкам. Аднак гэтая група насельніцтва праявіла незвычайную настойлівасць і ўпартасць у адстойванні сваіх правоў. Спасылаючыся на пацверджаныя ў 1763 г. велікакняжацкія прывілеі і даравальную грамату цара Аляксея Міхайлавіча, панцырныя баяры звярнуліся ў Сенат і да Кацярыны II з просьбай аб ураўнаванні іх з расійскімі аднадворцамі[30]. Указам ад 21 студзеня 1788 г. сяляне, якія змаглі даказаць баярскае паходжанне, ураўноўваліся з украінскімі казакамі, а астатнія, што пражывалі на баярскіх землях, заставаліся ў складзе дварцовых сялян. Паводле рэвізіі 1782 г., першых аказалася 3412, другіх – 2756 (у тым ліку 22 лічылі сябе шляхтай)[31]. Большая частка сялян дабілася пералічэння ў панцырныя баяры (казакі), колькасць іх узрасла з 3420 (у 1792 г.)[32] да 4053 (у 1800 г.) душ мужчынскага полу[33].

Прызнанне асабістых і маёмасных правоў панцырных баяраў сутыкнулася з інтарэсамі новых памешчыкаў, якім многія з гэтых бая-

раў былі падараваны. Паводле ўказа Сената ад 2 красавіка 1805 г., казна выплочвала адпаведную грашовую кампенсацыю такім памешчыкам[34]. Сенат ухваліў прапанову віцебскага, магілёўскага і смаленскага генерал-губернатара князя Хаванскага аб пераразмеркаванні зямель панцырных баяраў з надзяленнем участкамі па колькасці душ, "прызнаўшы як іх саміх асабіста, так і землі іх казённай уласнасцю"[35]. Аднак праект Хаванскага не быў ажыццёўлены. Цяжбы панцырных баяраў з уладальнікамі падараваных маёнткаў аб выдзяленні зямель, размежаванні іх, супраць спроб запрыгоньвання ішлі ўсю першую палову XIX ст.[36]

Паводле даных Міністэрства дзяржаўных маёмасцей за 1849 г., панцырныя баяры ў колькасці 11 510 душ абодвух полаў пражывалі ў Гарадоцкім, Невельскім, Себежскім, Віцебскім і Рэжыцкім паветах[37]. Міністэрства, лічачы нязручным існаванне сярод сельскага насельніцтва асобнай групы, практыкавала перасяленні панцырных баяраў у многазямельныя губерні, дзе яны канчаткова страчвалі свае правы, зліваліся з агульнай масай дзяржаўнага сялянства. Так, у 1853 г. былі перасялены ў Заходнюю Сібір 379 сем'яў (1412 душ мужчынскага полу)[38]. Яшчэ ў 1790 г. 445 "панцырных баяраў, перайменаваных у казакі", былі адпраўлены на службу ў вёславы флот[39].

Паводле ўказа 1807 г., панцырныя баяры зраўноўваліся з астатнім сельскім насельніцтвам у выплаце дзяржаўных падаткаў і адбыцці рэкруцкай, земскай і грамадскіх павіннасцей. Панцырныя баяры, якія пражывалі на памешчыцкіх землях і ў г. Віцебску, у 1823 г. былі вызвалены ад аброку ў казну і абкладзены нароўні з вольнымі людзьмі заходніх губерняў; у 1859 г. былі адменены некаторыя абмежаванні ў іх грамадзянскіх правах. 27 сакавіка 1873 г. цар зацвердзіў рашэнне Дзяржаўнага савета "Аб увядзенні пражываючых у Віцебскай губерні панцырных баяраў у агульны састаў сельскіх і гарадскіх жыхароў"[40].

Паходжанне разраду "вольных людзей" з'яўляецца адным з найбольш нявысветленых і заблытаных пытанняў аграрнай гісторыі Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны. Свабоднае насельніцтва, што пражывала паводле дагавораў з землеўладальнікамі і мела права перамяшчэння, вядома тут яшчэ з XVI ст. Пачатак яму паклала, відаць, невялікая колькасць сялян, што пазбегла тады запрыгоньвання землеўладальнікам. Сюды далучаліся выйшаўшыя на волю пры-

гонныя, іншаземцы: раменікі і беглыя, частка слуг панцырных, баяраў і зямян, што мелі дакументы і юрыдычна карысталіся правам перасялення. Нягледзячы на ўцягванне феадаламі вольных людзей у прыгонную залежнасць, колькасць іх расла, асабліва ў гады ваенных спусташэнняў, эпідэмій, голаду[41].

Ва ўсходняй частцы Беларусі, як ужо адзначалася вышэй аб умовах правядзення перапісу 1772 г., вольным людзям было цяжка сцвердзіцца ў сваім званні. Ды і колькасць іх была невялікай, што можна вытлумачыць аддаленасцю гэтай тэрыторыі ад раёнаў, дзе большасць насельніцтва ў XIII – XV ст. павінна была складацца са свабодных грамадзян, гатовых ва ўсякі час падняцца на барацьбу з крыжакамі. Тым не менш указам ад 20 кастрычніка 1783 г. за вольнымі людзьмі былі пакінуты правы, якія, па сутнасці, прыраўноўвалі іх да мяшчан[42].

У абводах другога і асабліва трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай урад сутыкнуўся з нязвыклымі для яго рознага роду "вольнапражываючымі" людзьмі, якія "па кантрактах карыстаючыся свабодай пераходу ў іншыя месцы... плоцяць толькі чынш за зямлю і падаткі ў казну, а паншчыны ніякай не выконваюць"[43]. Пры правядзенні перапісу вольных людзей прадпісвалася адзначаць асобна ад "карэнных" (аселых). Як даносіў 24 студзеня 1808 г. цару сенатар Аляксееў, пры правядзенні V рэвізіі (1795) у складзе вольных людзей апынуліся: паселеныя ў памешчыкаў збеглыя; вызваленыя ад паншчынных работ прыгонныя; бабылі і хто вярнуўся з распушчаных войскаў; староцінскія і духоўныя сяляне, якіх часовыя ўладальнікі імкнуліся схаваць ад раздач рускім памешчыкам; пражываючыя па кантрактах на прыватнай зямлі шляхціцы[44]. Па выніках V рэвізіі ў Слонімскай губерні знаходзілася 11 833, а ў Завілейскім і Ашмянскім паветах Віленскай губерні адпаведна 2682 і 2227 вольных людзей мужчынскага полу[45].

У 1797 г. урад пакінуў на становішчы вольных збеглых у Літоўскую губерню з розных губерняў людзей, надалей катэгарычна забараняючы падобныя пераходы[46]. Указам ад 23 лютага 1799 г. было вызначана: "Род людзей, што пасяліліся ў Літоўскай губерні з даўніх часоў з Цэсарыі, Прусіі і другіх земляў і пры былой рэвізіі названых вольнымі, пакінуць на такіх жа падставах, на якіх яны цяпер знаходзяцца"[47]. Гэта павялічыла прыток сялян з тэрыторый, што кантраляваліся тады Аўстрыяй і Прусіяй. Губернская адміністрацыя, аба-

піраючыся на ўказ ад 27 кастрычніка 1797 г., які дазваляў прыбылым з-за мяжы выбіраць род жыцця, ахвотна прымала збеглых, пасяляючы, "каб унікнуць злоўжыванняў, якія ад іх могуць адбыцца", "у паветах, да граніцы недатычных, а менавіта: Віленскім, Браслаўскім, Завілейскім, Ашмянскім і Навагрудскім". Мясцовыя прыгонныя не прамінулі пакарыстацца такой магчымасцю і нярэдка ўцякалі за мяжу, каб прыбыць адтуль свабоднымі людзьмі. Адміністрацыя прымала, праўда, далёка не заўсёды паспяхова, меры, каб распазнаць сялян і вярнуць іх ранейшым памешчыкам. Паводле ўказа ад 9 мая 1802 г., выхадцы "з ранейшых польскіх абласцей, занятых Аўстрыяй і Прусіяй", былі ўключаны ў склад вольных людзей[48].

*Табліца 4*[49]

**Колькасць вольных людзей у Беларусі і Літве**

| Губерні | VIII рэвізія (1834) | | | IX рэвізія (1850) |
|---|---|---|---|---|
| | На казённых землях | На ўласных і прыватных землях | Разам | На ўласных землях |
| Віленская | 17 208 | 53 079 | 70 287 | 437 |
| Віцебская | 76 | - | 76 | - |
| Гродзенская | 736 | 2 225 | 2 961 | 74 |
| Ковенская | - | - | - | 1 643 |
| Мінская | 334 | 5 848 | 6 182 | 660 |
| *Усяго* | 18 354 | 61 152 | 79 506 | 2 814 |

У выніку вольныя людзі сталі не толькі найбольш разнастайнай паводле сацыяльнага складу, але і самай многанацыянальнай катэгорыяй сельскага насельніцтва. Нямногія з іх мелі ўласную зямлю, асноўная маса пражывала ў прыватных уладальнікаў на розных умовах (гл. табл. 4), што трагічна адбілася на іх лёсе. Пры патуранні мясцовых улад і ўрада, які ў заканадаўстве першай трэці XIX ст. пайшоў на звужэнне правоў, асабліва пераходу, вольных людзей, памешчыкі выкарыстоўвалі ўсе легальныя і нелегальныя спосабы для ператварэння апошніх у сваіх прыгонных. Так, вольны чалавек Ян Дычка неаднаразова скардзіўся віленскаму генерал-губернатару на шляхцянку Ленскую і яе аканома Навіцкага "за рабаванне каня, быдла, усёй гаспадарчай маёмасці, прыгнёт

паншчынай па 10 дзён у тыдзень і забранне розных дакументаў, што пацвярджаюць вольнасць". Тры гады (1822 – 1825) цягнулася гэтая справа ў Лідскім павятовым, а пасля ў Гродзенскім галоўным судзе, паколькі памешчыца Ленская ўсяляк перашкаджала яе справядліваму вырашэнню. І ўсе ж, дзякуючы настойлівасці Яна Дычкі, ён вырваўся з-пад запрыгоньвання[50]. Але гэта было шчаслівым выключэннем.

Колькасць вольных людзей катастрафічна змяншалася, самі яны даходзілі да роспачы. Гродзенскі губернатар у справаздачы за 1840 г. асобна адзначаў, што "ў ліку самазабойцаў было некалькі вольных, непадлеглых памешчыцкай уладзе людзей"[51]. Віленскі генерал-губернатар М. А. Далгарукаў у пісьме ад 17 мая 1837 г. начальніку V Аддзялення імператарскай канцылярыі П. Дз. Кісялёву канстатаваў: "Калі не будуць прыняты меры, то гэтая справа будзе прычынай разарэння многіх бедных землеўладальнікаў і скончыцца прымацаваннем усіх свабодных людзей, што жывуць у маёнтках багатых уладальнікаў"[52].

Імкнучыся аслабіць нарастанне сацыяльных супярэчнасцей у вёсцы і адстойваючы фінансавыя інтарэсы казны, царызм рабіў спробы распрыгоньвання (разбору) вольных людзей, але ў цэлым яны не ўвянчаліся поспехам. Так, у Ашмянскім павеце паводле разбору было вызвалена з памешчыцкага ўладання 159, а ў Завілейскім толькі 20 рэвізскіх душ[53].

У вольных людзей існавала (з 1812 г.) розніца ва ўплаце падушнага падатку. Калі ў старосцінскіх маёнтках яны плацілі нароўні з сялянамі па 3 рублі асігнацыямі, то ў астатніх уладаннях – па 7 рублёў. Гэта выклікала ўпартую барацьбу апошніх за перасяленне на казённыя землі. Ведамства дзяржаўных маёмасцей, якому было даручана распрацаваць праект уладкавання ўсіх вольных людзей, прапанавала перасяляць іх у вялікарасійскія губерні і такім чынам абарачаць у казённых сялян. Камітэт па справах заходніх губерняў не зацвердзіў прапановы, баючыся, што гэтая мера прывядзе ўсіх памешчыцкіх сялян "да абурэння і непадпарадкавання". Улады таксама адхілілі праект рэвізора А. Ф. Арцымовіча аб пасяленні распрыгоньваемых вольных людзей на казённай зямлі, што займала шляхта і аднадворцы[54]. Відаць, толькі нямногія змаглі выкарыстаць распараджэнне міністра дзяржмаёмасцей Кісялёва (пасланае 13 сакавіка 1839 г. генерал-губернатару Далгарукаву) аб дазволе вольным лю-

дзям пасля сканчэння тэрмінаў кантрактаў з памешчыкамі пераходзіць "у саслоўе казённых сялян, дзе гэтыя згодзяцца прымаць іх"[55].

Паводле ўказа ад 23 верасня 1840 г., вольныя людзі, што пасяліліся на казённай зямлі, уводзіліся ў склад сельскіх грамад дзяржаўных сялян і ўраўноўваліся з імі ва ўплаце падатку і чыншу. Закон ад 23 мая 1847 г. перадаваў у распараджэнне Міністэрства дзяржаўных маёмасцей вольных людзей, якія мелі ўласныя землі. Тых, хто пражываў у памешчыкаў, міністэрства не рашалася ўзяць у сваё падпарадкаванне, паколькі "прыватныя ўладальнікі зямель не пацерпяць умяшальніцтва пабочнай улады ў добраахвотныя адносіны між імі і вольнымі людзьмі і палічаць за лепшае не мець іх на сваіх землях"[56]. Аднак, хоць і асцярожна, рабіліся захады да уніфікацыі становішча гэтай найбольшай часткі вольных людзей. Згодна з правіламі, зацверджанымі царом 25 ліпеня 1864 г., яны пераставалі ўтвараць асобны ад сельскіх жыхароў стан і ўваходзілі ў агульны склад сялянскага саслоўя[57].

Каланістамі ці замежнымі пасяленцамі называліся тыя іншаземцы, якія пасяліліся на казённых, прыватнаўласніцкіх ці набытых купляй землях. Хоць асноўныя заканадаўчыя і практычныя мерапрыемствы царскага ўрада па гэтым пытанні накіроўваліся на засяленне шматзямельнага поўдня імперыі, тым не менш пры наяўнасці свабодных зямель дазвалялася прымаць іншаземцаў і ў беларускіх губернях[58]. Спачатку многіх з іх залічылі ў склад вольных людзей, але ў 1826 г. па распараджэнні міністра фінансаў устанавілі роўнае з усімі сялянамі падатковае абкладанне. На працягу першых дзесяці гадоў каланісты вызваляліся ад уплаты падаткаў і не неслі рэкруцкай павіннасці. Ім давалася права першачарговага рашэння ў судах, але катэгарычна забаранялася ўладаць населенымі маёнткамі. У складзе Экспедыцыі дзяржаўнай гаспадаркі 1797 – 1803 гг. існавала спецыяльная "Кантора апякунства над іншаземцамі"[59].

Пасля перадачы ў 1837 г. замежных пасяленцаў з Міністэрства ўнутраных спраў у Ведамства дзяржаўных маёмасцей былі сабраны звесткі аб гэтым разрадзе сельскага насельніцтва. Паводле прадстаўленых у 40-х гг. даных, "выхадцы з Прусіі і іншых нямецкіх дзяржаў" пражывалі: у Мінскім павеце (вюртэмбергскія каланісты ў вёсках Калядзічы, Карзюкі, Дзергаі, Юцкі, Сляпянка і інш.) і ва ўсёй губерні – 63 (з 1781 і 1792 гг., на ўласнай і арэндавай зямлі),

Брэсцкім – 1097 (з 1662 г., на зямлі падараванай у 1717 г. Радзівіламі пры Дамачоўскім маёнтку, калоніі Нейброў і Нейдорф), Пружанскім – 97 (з 1809 г., на казённай зямлі маёнтка Масева) рэвізскіх душ. Адна нямецкая сям'я пасялілася (з 1835 г.) на панскай зямлі ў Рэчыцкім павеце, другая (з 1812 г.) – у маёнтку Ілья Вілейскага павета, а сям'я італьянца Скарулі (з 1837 г.) – на арандаванай зямлі каля горада Ашмяны[60].

У месцах кампактнага пражывання пасяленцы выбіралі са свайго асяроддзя старастаў, якія кіравалі грамадой, разбіралі спрэчкі. Паводле веравызнання, выхадцы з "нямецкіх дзяржаў" належалі да лютэранскай ці каталіцкай царквы. Так, у калоніях Нейброў і Нейдорф каталікамі лічыліся 361, а лютэранамі 646 душ мужчынскага полу (апошнія мелі асобны прыход і пастара). Адначасова з сельскай гаспадаркай яны пасняхова займаліся рознымі рамёствамі, асабліва сталярным.

Царскім уладам у Беларусі даводзілася мець справу і з рускімі стараверамі, якія ўцяклі сюды ад рэлігійных праследаванняў у часы Рэчы Паспалітай. Яны арандавалі зямлю ў феадалаў за аброк і на працягу ўсёй першай паловы XIX ст. з пераменным поспехам вялі барацьбу супраць запрыгоньвання землеўладальнікам. Указам ад 9 красавіка 1806 г. стараверам, якія мелі пісьмовыя дагаворы з панамі ці ўладальнікамі староставаў, пацвярджалася "вольнасць"[61]. На мяжы XVIII – XIX ст. "людзей расійскіх, якія ў розных месцах пасяліліся" (піліпонаў), налічвалася, напрыклад: у Завілейскім павеце – 1591, Браслаўскім – 2161, Лідскім – 3[62]; у Мінскай губерні быў 1951 піліпон[63]. Жылі яны замкнута, захоўваючы сваю веру, рускую мову, звычаі, былі ўстойлівыя да асіміляцыі. Тут улады адносіліся да старавераў значна мякчэй, чым у карэннай Расіі, нават лічылі іх у нейкай ступені чыннікам "абрусення краю" і процівагай польска-каталіцкаму ўплыву.

Пасля ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі з'явіліся і новыя катэгорыі сельскага насельніцтва, утвораныя ў выніку заканадаўчых і практычных мерапрыемстваў царскага ўрада.

Згодна з указам ад 20 лютага 1803 г. аб "вольных хлебаробах"[64], пацверджаным і дапоўненым Палажэннем ад 2 красавіка 1842 г. аб абавязаных сялянах, памешчыкам дазвалялася вызваляць прыгонных паасобку ці сёламі з абавязковым надзяленнем іх зямлёй. Сяляне

павінны былі за гэта заплаціць вялізны выкуп ці выконваць павіннасці паводле ўзаемнага дагавору з памешчыкам.

Ужо сучаснікі адзначалі, што "ўзаконенне аб вольных хлебаробах мае... свае недахопы, якія заключаюцца ў поўнай нявызначанасці спосабаў даравання сялянам свабоды і адносін, якія павінны існаваць паміж памешчыкам і вольнымі хлебаробамі"[65]. Гэтае заканадаўства не знайшло прымянення ў паўночна-заходніх губернях, паколькі супярэчыла існаваўшай тут практыцы даваць сялянам толькі асабістую свабоду без абавязковага надзялення зямлёй, што пацвярджалася ўрадам у кожным асобным выпадку. Выключэннем з'явіліся толькі 57 рэвізскіх душ у Полацкім павеце, за якіх казна ў 1819 г. заплаціла памешчыку, "зважаючы на выдатныя паслугі, зробленыя імі ў вайне 1812 года"[66]. Аказаўся практычна марным і ўказ ад 8 лістапада 1847 г. аб праве прыгонных выкупляцца на волю цэлымі сёламі пры продажы маёнткаў з публічных таргоў. Толькі напярэдадні рэформы 1861 г. многія памешчыкі вырашылі пазбавіцца ад прэтэндаваўшых на зямлю прыгонных. "Да ведама майго дайшло, – пісаў у маі 1858 г. віленскі генерал-губернатар У. І. Назімаў гродзенскаму губернатару, – што ўладальнікі прыватных маёнткаў адпускаюць многіх сялян на волю без уласнай іх на тое згоды"[67].

Аб колькасці разглядваемай катэгорыі маюцца самыя разнастайныя і нярэдка супярэчлівыя звесткі. Справа ў тым, што на месцах часта ўключалі сюды ўсіх сялян, якія тым ці іншым шляхам сталі ўласнікамі зямлі. Няма аднастайнасці і ў матэрыялах рэвізій. Па звестках з губернатарскіх справаздач у Магілёўскай (1831 г.) і ў Віцебскай (1841 г.) губернях было адпаведна 1167[68] і 510 [69] вольных хлебаробаў абодвух полаў. VIII рэвізія паказвае іх у Віцебскай губерні 305, а ў Магілёўскай 364 душы мужчынскага полу[70].

У 1809 г. Камітэт міністраў адхіліў прапанову аб пераводзе ў дзяржаўныя сяляне вольных хлебаробаў, якія аказаліся няздольнымі выконваць дагаворы, і ўзяцці казной на сябе гэтых абавязкаў[71]. З утварэннем жа Міністэрства дзяржаўных маёмасцей вольныя хлебаробы паступілі ў яго распараджэнне і па прапанове Кісялёва (указ ад 5 ліпеня 1848 г.) былі перайменаваны ў "дзяржаўных сялян, пасеЛеных на ўласных землях".[72]

У Расіі яшчэ ўрад Пятра І правёў чыстку пануючага саслоўя ад ніжэйшых пластоў, прылічыўшы іх да аднадворцаў і дзяржаўных ся-

лян. У Рэчы Паспалітай гэтага не адбылося, і на занятых Расійскай імперыяй яе тэрыторыях аказалася маса “дваранства, з якога, – на думку гродзенскага губернатара М. М. Мураўёва, – больш паловы наўрад ці дастойна гэтага наймення”[73]. Многія шляхціцы былі збяднелымі, па сваім эканамічным становішчы набліжаліся да сялян, іншы раз нават падвяргаліся запрыгоньванню, аб чым, да прыкладу, сведчыць справа Якава і Івана Жалязоўскіх, запісаных у сялянства ва ўладаннях памешчыкаў Вольскіх у Лідскім павеце[74].

Бедная шляхта з'яўлялася спрыяльным асяроддзем і асноўнай рухаючай сілай сацыяльна-палітычных рухаў і нацыянальнай барацьбы. Гэтая акалічнасць была заўважана царскім урадам ужо па ходзе паўстання 1794 г., у якім за лозунгамі ратавання Рэчы Паспалітай ён распазнаў “дух якабінізму”. Аднак спробы вырашаць праблему шляхты, што ўсё больш абвастралася, доўгі час блакіраваліся намаганнямі буйных землеўладальнікаў і палітычнымі ваганнямі Паўла і Аляксандра І у “польскім пытанні”.

Пасля паўстання 1830 – 1831 гг. стаў ажыццяўляцца цэлы комплекс мерапрыемстваў для папярэджвання магчымых шляхецкіх выступленняў, сярод якіх галоўнае месца займаў т. зв. “разбор” шляхты, што ажыццяўляўся на падставе ўказа ад 19 кастрычніка 1831 г. Гэтая працэдура ўяўляла сабой праверку дакументаў аб дваранскім паходжанні і перавод на гэтай аснове часткі шляхты ў падатковае саслоўе: аднадворцаў – у сельскай мясцовасці і грамадзян – у гарадах. Дваранскага звання пазбаўляліся звычайна дробныя, беспамесныя шляхціцы, якіх царскі ўрад імкнуўся зліць з масай сялянства.

У пяці беларускіх губернях, паводле спецыяльнага перапісу аднадворцаў 1842 – 1843 гг., пражывала 21 140 душ мужчынскага полу, у тым ліку на казённай зямлі – 2545, на ўласнай – 4347, на памешчыцкай – 9321, неаселых – 4927 (гл. табл. 5). Найбольшая колькасць аднадворцаў, як і шляхты, знаходзілася ў паветах, размешчаных бліжэй да Вільні – цэнтра былой Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Працэс разбору шляхты ішоў і далей. Так, на працягу 1846 г. толькі па адной Віленскай губерні залічылі ў новыя разрады аднадворцаў і грамадзян: 7716 мужчынскага і 8318 жаночага полу душ[75]. У Магілёўскай губерні ўсяго па стане на 1 студзеня 1866 г. было прыпісана са шляхты мужчынскага полу ў аднадворцы 12 481, у сяляне казённыя і ўласнікі – 310, астатнія – у

*Табліца 5*[76]

**Склад і рассяленне аднадворцаў паводле іх перапісу 1842 – 1843 гг.**

| Губерня | Разам аднадворцаў мужчынскага полу | У тым ліку | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | на казённай зямлі | на ўласнай зямлі | неаселых | на памешчыцкай зямлі |
| Віленская | 6 123 | 1049 | 1299 | 805 | 2970 |
| Віцебская | 2 349 | 107 | 107 | 2125 | 10 |
| Гродзенская | 3 247 | 239 | 1939 | 627 | 442 |
| Мінская | 8 427 | 1070 | 804 | 999 | 5554 |
| Магілёўская | 994 | 80 | 198 | 371 | 345 |
| *Усяго* | 21 140 | 2545 | 4347 | 4927 | 9321 |

мяшчане, грамадзяне і купцы. У дваранстве заставалася па губерні не больш за 850 чалавек ваколічнай шляхты[77].

Аднак становішча адарваных ад пануючага саслоўя аднадворцаў, абкладзеных значнымі падаткамі на карысць дзяржавы, абцяжараных залежнасцю ад землеўласнікаў і злоўжываннямі новай адміністрацыі, было нялёгкім. Яны па-ранейшаму заставаліся найбольш неспакойным элементам у краі. Таму Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, якому было даручана займацца новым разрадам, узяло курс на знішчэнне тых асаблівасцей, якія адрознівалі яго ад масы сялянства і спараджалі "шляхецкі ўспамін". Маючы гэта на ўвазе, міністр дзяржмаёмасцей П. Дз. Кісялёў дабіўся прыняцця мер для сканцэнтравання аднадворцаў на казённых землях і зліцця іх з асноўнай масай дзяржаўнага сялянства. 30 лістапада 1840 г. выйшла прадпісанне II Дэпартамента міністэрства аб некаторых ільготах аднадворцам, што перасяляліся з памешчыцкіх на казённыя землі, у прыватнасці ўстанаўліваўся чынш, не перавышаючы іх ранейшых плацяжоў. Палажэннем Камітэта па справах заходніх губерняў ад 15 снежня 1841 г. аднадворцы, якія жылі на казённых землях, уводзіліся ў склад сельскіх грамад і абкладаліся поруч з дзяржаўнымі сялянамі аброкам і зборамі пры захаванні па-ранейшаму замест падушнага падатку падымдымнага[78]. Хоць магчымасць бескантрольнага перамяшчэння аднадворцаў абмяжоўвалася, ім усё ж гарантаваліся правы на надзел, ільготныя ўмовы нарміраванай рэнты, змяншэнне рэкруцкага абавязку да агульнага ўзроўню. Усё гэта падмацоўвала іх тэндэнцыю

да пераходу на дзяржаўныя землі, але казённая вёска па прычыне малазямелля не змагла задаволіць гэтую тэндэнцыю. На 1855 г. усяго па дзевяці губернях Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны налічвалася 2998 аднадворцаў мужчынскага полу, паселеных на казённай зямлі[79].

Адначасова рабіліся спробы масавага перасялення аднадворцаў для зліцця іх з дзяржаўнымі сялянамі іншых губерняў. 25 сакавіка 1832 г. ім было дазволена сяліцца на свабодных казённых землях Саратаўскай, Арэнбургскай губерняў і ў Каўказскай вобласці. У 40-х гг. намаганні ўрада былі накіраваны на перасяленне заходніх аднадворцаў ў Кацярынаслаўскую, Херсонскую і Таўрычаскую губерні; у першай з іх было паселена больш 4 тыс. душ мужчынскага полу, у другой – да 1 тысячы[80]. Усяго да канца 1850 г. на казённыя землі было перапелена 12 948 заходніх аднадворцаў мужчынскага полу[81].

Міністэрства дзяржаўных маёмасцей адмовілася ад загадвання аднадворцамі, што жылі на памешчыцкіх землях, перадаўшы іх паводле ўказа ад 14 лютага 1846 г. Міністэрству ўнутраных спраў[82]. Указы ад 23 студзеня 1847 г. і 11 сакавіка 1853 г. вызначалі парадак пераходу ў казну маёнткаў і сялян, якія знаходзіліся ва ўладанні аднадворцаў[83]. Праўда, колькі-небудзь значнага папаўнення саслоўя дзяржаўных сялян гэтыя ўказы практычна не забяспечвалі.

Больш рашучы крок да зліцця аднадворцаў з масай падатковага насельніцтва быў зроблены указам ад 1 жніўня 1857 г., згодна з якім шляхта, не даказаўшая дваранства, залічвалася непасрэдна ў дзяржаўныя сяляне (на казённых землях) і ў вольныя людзі (на памешчыцкіх землях). Аднадворцы-ўласнікі залічваліся ў дзяржаўныя сяляне на ўласных землях, неаселыя – прыпісваліся да дзяржаўных сялян ці да гарадскіх саслоўяў[84].

Незавершанасць павольна праводзімай рэформы па ліквідацыі аднадворцаў адразу ж адбілася на ўдзеле іх у паўстанні 1863 г. Палкоўнік Рэйхарт, які з'яўляўся старшынёй Камісіі па палітычных справах у Мінску[85], у данясенні 13 жніўня 1863 г. начальніку штаба Корпуса жандараў настойваў неадкладна "прыпісаць іх да грамад казённых сялян, даць зямлю за ўмеркаваны аброк і скласці з іх нядоімку; такім чынам, аднадворцы, зліўшыся з масай, перастануць складаць асобнае саслоўе, якое патрабуе над сабой асобага нагляду, і, убачыўшы клопат аб іх начальства, зробяцца аселымі і адданымі ўраду"[86].

"Разбор" шляхты быў спынены ў канцы 1864 г. і паводле закона ад 31 снежня 1865 г. усіх земляробаў, што не вызначыліся ў падатковыя саслоўі, у тым ліку і жыўшых на памешчыцкай зямлі і неаселых батракоў, прадпісвалася залічыць у склад дзяржаўных сялян з шэрагам абмежаванняў у асабістых правах[87]. Аднак пасля паўстання 1863 г. сітуацыя змянілася, паколькі частка дзяржаўных сялян прыняла ў ім актыўны ўдзел. Улады згубілі веру ў іх палітычную добранадзейнасць і сталі прыпісваць шляхціцаў да грамад былых прыватнаўласніцкіх сялян[88]. Апошнім актам зліцця аднадворцаў з падатковым насельніцтвам стаў закон ад 19 лютага 1868 г. "Аб увядзенні аднадворцаў і грамадзян заходніх губерняў у агульны склад сельскіх ці гарадскіх жыхароў"[89].

У выніку складання шматлікіх праектаў, заканадаўчых і практычных мерапрыемстваў адносна яўрэйскага насельніцтва ўрад прыйшоў да выдання 13 красавіка 1835 г. закона аб утварэнні яўрэйскіх земляробскіх калоній, які пасля быў дапоўнены і дзейнічаў да 1866 г. Асноўная маса яўрэйскага насельніцтва, што пражывала ў гарадах і мястэчках, атрымала права сяліцца па дагаворах на казённай і памешчыцкай зямлі ці набываць зямлю шляхам куплі. Палажэннем Камітэта міністраў ад 25 сакавіка 1841 г. яўрэі-земляробы, паселеныя на дзяржаўных землях, перайшлі ў веданне Міністэрства дзяржаўных маёмасцей[90]. Для гэтых мэт меркаваўся адвод казённых земляў у паўднёвых і заходніх губернях Расійскай імперыі.

Нягледзячы на жаданне беспрацоўнай яўрэйскай беднаты выкарыстаць новыя пастановы для паляпшэння свайго становішча, маштабы і тэмпы ажыццяўлення іх былі невялікія. У 1866 г. яўрэяў-земляробаў на казённых землях у Віленскай губерні лічылася 1128, Віцебскай – 643, Гродзенскай – 814, Мінскай – 571, Магілёўскай – 719 рэвізскіх душ, хоць у сапраўднасці пражывала іх на месцах пасялення няшмат больш за палавіну[91].

Аналізуючы прычыны няўдач у арганізацыі яўрэйскіх земляробскіх калоній, мінскі губернатар пісаў у справаздачы за 1839 г., што "ўсе гэтага роду пасяленні складаюцца з самабяднейшых сем'яў, якія, пазбаўляючыся ўсіх сродкаў да ўтрымання свайго ў гарадах і мястэчках, рашаюцца на неабходнасці ўзяцца за плуг, каб пры першай, аднак, магчымасці вярнуцца ў мяшчанскае саслоўе"[92]. Афіцыйныя асобы, каб пазбегнуць адказнасці за промахі ў арганізацыі пасяленняў,

пастаянна спасылаліся на нібыта прыроджаную няздольнасць яўрэйскага народа да земляробства. "Аднак усё гэта рашуча не так, – пярэчыў чыноўнік С. Т. Славуцінскі, які служыў у міравых сялянскіх установах Ковенскай губерні. – Я сам бачыў яўрэяў-земляробаў у Віленскім павеце, што аруць і апрацоўваюць свае землі не горш сапраўдных тамтэйшых сялян"[93].

Цікавыя згадкі аб адной калоніі пад Смаргонню пакінуў у дарожным дзённіку 1856 г. знакаміты краёвы літаратар Уладзіслаў Сыракомля. Яму кінулася "ў вочы вёска, не падобная на іншыя: хаты акуратныя, выстраіліся ў шнур, як салдаты, гэтакія ж акуратныя вароты і платы, наводшыбе за хатамі выцягнуліся гэтак жа роўненька, адзін за адным, хлявы. Навокал не відаць ні дрэўца – нават не ўбачыш ніводнай ігрушы ці рабіны, якіх звычайна ніхто не саджае, але якія самі любяць аднекуль прыбандраваць пад сядзібы нашых сялян. Гэта ж – калонія яўрэяў-земляробаў, якіх у колькасці дваццаці пяці сем'яў пасяліў тут урад. Як відаць, каланістам палюбілася земляробства. На вуліцы не ўбачыш гразі, шуму ды гаму, як у яўрэйскіх мястэчках, за вёскай шчыруюць з сохамі ды баронамі людзі..."[94] Зразумела, так было далёка не ўсюды.

Каб ператварыць нядаўняга дробнага гандляра і рамесніка ў моцнага земляроба, патрэбны былі значная фінансавая і агранамічная дапамога і наогул зацікаўленасць дзяржавы ў пашырэнні пласта свабодных сялян. Усяго гэтага, нягледзячы на сістэму асобных мер і ільгот, яўна нехапала.

* * *

Эвалюцыя спецыяльных, паўсвабодных, асабіста незалежных катэгорый сельскага насельніцтва ў перыяд разлажэння феадальных і фарміравання капіталістычных адносін сведчыць аб зближэнні гэтых катэгорый з асноўнай масай сялянства, пераважна дзяржаўнага. Гэта тлумачыцца як свядомай і мэтанакіраванай дзейнасцю вярхоўнай улады, так і развіццём таварна-грашовых адносін, што нівеліравалі іх эканамічны стан.

Арганізаваныя ўрадам заканадаўчыя і практычныя мерапрыемствы знішчылі ў беларускіх губернях сярэдневяковае дзяленне сялян на шматлікія разрады і катэгорыі шляхам уключэння іх у адзі-

нае саслоўе дзяржаўных сялян, тым самым папоўніўшы яго колькасна і асабліва якасна. Так, паводле даных IX і X рэвізій, дзяржаўных сялян на асобых правах разам з леннымі па пяці беларускіх губернях налічвалася адпаведна 38 788 і 33 199 душ, што складала 9,3 і 8,3 % усяго саслоўя. Удзельная вага іх узрастала з усходу на захад: ад 2–7 % у Віцебскай і Магілёўскай да 8–16 % у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях[95]. Гэтая акалічнасць звязана перш за ўсё з размяшчэннем вольных людзей і аднадворцаў і ў значнай ступені абумоўлена эвалюцыяй саслоўна-прыпісной палітыкі царскага ўрада да і пасля паўстання 1794 г.

Працэс уключэння ў разрад дзяржаўных сялян спецыяльных катэгорый сельскага насельніцтва разам з тым аказаўся незавершаным. Аб гэтым сведчаць даныя аб складзе жыхароў дзяржаўнай вёскі Гродзенскай губерні. Па стане на 1 снежня 1847 г. у казённых маёнтках, акрамя сялян уласна дзяржаўных (127 624 душы мужчынскага полу), купцоў і мяшчан пражывала 4663, разначынцаў – 327, адстаўных салдат – 166, салдат у бестэрміновых водпусках – 211, кантаністаў – 465, салдацкіх жанок і ўдоў – 702[96]. Іх статус вызначаўся міністэрскімі распараджэннямі “аб уладкаванні пражываючых у казённых маёнтках пабочных людзей”[97]. Трэба мець на ўвазе і тую частку прадстаўнікоў “вольных” катэгорый, што засталіся па-за межамі дзяржаўнай вёскі; разам у сярэдзіне XIX ст. яны складалі 2,5 % усіх сялян (гл. табл. 1).

У адносінах да паступіўшых у склад казённага саслоўя розных праслоек і груп Міністэрства дзяржаўных маёмасцей свядома і сістэматычна праводзіла тэндэнцыю да уніфікацыі іх правоў і абавязкаў. Уніфікацыя была заканамерным вынікам развіцця таварна-грашовых адносін, што эканамічна збліжалі раней адасобленыя катэгорыі насельніцтва. Ход, метады, прыёмы, тэмпы і маштабы ажыццяўлення гэтай тэндэнцыі ў рашаючай ступені вызначаліся палітычнай сітуацыяй на Беларусі, узроўнем сацыяльнай барацьбы і грамадскага руху, адносінамі саміх саслоўных груп да вызначэння іх лёсаў. Поспех урадавых мерапрыемстваў залежаў і ад дзеянняў феадальна-прыгонніцкага дзяржаўнага апарату, які ў шэрагу выпадкаў аказаўся нядольным да вырашэння пастаўленых задач.

Сярэдневяковыя перагародкі, што аддзялялі адзін ад аднаго некаторыя катэгорыі дробных сельскіх вытворцаў, да канца не зніклі,

што абумоўлівалася захаваннем асноў феадальнага грамадскага ладу і зыходзячай адсюль розніцай ў становішчы земляробаў як карыстальнікаў феадальнай уласнасці і плацельшчыкаў феадальнай рэнты[98]. Аб існаванні гэтых асаблівасцей сведчыць і палітычны недавер асобным групам дзяржаўных сялян, выказаны П. Дз. Кісялёвым у сакрэтным прадпісанні ўпраўляючым палатамі дзяржаўных маёмасцей заходніх губерняў у сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі 1848 г. у Еўропе. "Хаця я цалкам упэўнены, – сцвярджаў міністр, – што дзяржаўныя сяляне, пасля ўсіх ласкаў, дараваных ім Аўгусцейшым манархам, не могуць мець ніякай нагоды да хвалявання, але... сярод гэтага саслоўя паселены рознага роду людзі, што адрозніваюцца і паходжаннем і верою, як: заходнія аднадворцы, раскольнікі, каланісты і сяляне, перайшоўшыя з уніі, якія лёгка могуць стацца аб'ектам узбуджэння"[99].

Канчаткова працэс нівеліроўкі ўсіх катэгорый сельскага насельніцтва быў завершаны ўжо ва ўмовах перамогшага буржуазнага грамадства ў парэформенны перыяд. Але памяць, прыкладам, аб тым, што "да Мікалая (першага. – *У. С.*) былі яшчэ дзе-нідзе вольныя людзі", захоўвалася сярод сялян нават у пачатку XX стагоддзя[100].

## Бібліяграфічныя спасылкі

[1] ДГА Літвы, ф. 378, п/а, 1832 г., спр. 19, арк. 34.

[2] Архив Маркса и Энгельса. М., 1952. Т. 12. С. 90–91.

[3] РДАСА, ф. 16, спр. 898, арк. 25–27.

[4] Гл.: *Похилевич Д. Л.* Крестьяне-слуги в Великом княжестве Литовском в XVII – XVIII веках // Средние века. М., 1962. Вып. 21. С. 141–169.

[5] РДАСА, ф. 248, воп. 65, спр. 5824, арк. 431–450.

[6] *Грицкевич А. П.* Хозяйственное и правовое положение военно-служилого населения в Слуцком княжестве в XVI – XVIII вв. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1962 г. Мн., 1964. С. 250–252.

[7] *Żytkowicz L.* Rządy Repnina na Litwie w latach 1794 – 1797. Wilno, 1938. S. 323.

[8] Журнал новейших путешествий. 1810. Ч. 2. № 1. С. 81–82.

[9] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII – XVIII вв. Владение Сморгонь. Мн., 1977. С. 11–12, 225–226, 231–233.

[10] *Улащик Н. Н.* Предпосылки крестьянской реформы... С. 308–309; *Конюхова Т. А.* Государственная деревня Литвы... С. 46–47.

[11] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 210, арк. 2 адв.

[12] Гл.: *Похилевич Д. Л., Чугай В.* Королевские леса Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1966 г. Таллин, 1971. С. 361–373; ЦДГА Украіны ў Львове, ф. 181, воп. 2, спр. 1032, 1070; спр. 1084, арк. 12–17.

[13] *Де-Пуле М.* Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794 – 1797 годах. Спб., 1871. С. 128.

[14] Сб. РИО. Спб., 1875. Т. 16. С. 345.

[15] РДГА, ф. 1374, воп. 1, спр. 211, арк. 1.

[16] ДГА Літвы, ф. 1219, воп. 1, спр. 975, арк. 32, 44–45.

[17] РДГА, ф. 1374, воп. 1, спр. 211, арк. 16–17; ДГА Літвы, ф. 1219, воп. 1, спр. 196, арк. 8–10.

[18] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 2, спр. 1328, арк. 132–133; ф. 2, воп. 2, спр. 216, арк. 5–6.

[19] *Тамсама*, ф. 1, воп. 2, спр. 1321; спр. 1328, арк. 80, 130 адв.

[20] ПСЗ-II. Т. 24. № 23613.

[21] Материалы для статистики России, собираемые по ведомству Министерства государственных имуществ. Вып. 3. С. 176, 187.

[22] *Шрейер Ю.* Военное дело в Литве // Военный сборник. 1861. Дек. С. 332.

[23] *Грицкевич А.* Выбранцы и их экономическое и юридическое положение в XVI – первой половине XIX вв. // Материалы конференции молодых ученых Белоруссии и Прибалтики. Вып. История, языкознание, литературоведение. Мн., 1963. С. 66–69.

[24] Гл.: Сб. РИО. Т. 16. С. 75, 316, 527; Русский архив. 1874. Кн. 2. С. 274–280; 1882. Кн. 1. С. 392.

[25] Русский архив. 1882. Кн. 1. С. 394.

[26] РДВГА, ф. ВУА, спр. 2727, арк. 47–47 адв.

[27] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 4. С. 188.

[28] *Грыцкевіч А.* Беларускія выбранцы // Полымя. 1970. № 11. С. 252–253.

[29] *Грыцкевіч А. П.* Гісторыя куплі Слуцка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1975. № 4. С. 43.

[30] РДАСА, ф. 248, воп. 64, спр. 5608, арк. 508–516.

[31] ПСЗ-I. Т. 22. № 16611.

[32] РДВГА, ф. ВУА, спр. 18359, арк. 13.

[33] РДАСА, ф. 248, воп. 58, спр. 4859, арк. 383.

[34] ПСЗ-I. Т. 28. № 21698.

[35] *Сементовский А.* Историческая записка о панцирных боярах // Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 год. Спб., 1868. С. 54.

[36] НГА Беларусі ў Мінску, ф. 2640, воп. 1, спр. 34, 634, 687.

[37] *Без-Корнилович М. О.* Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся. Спб., 1855. С. 262.

[38] Журнал Министерства государственных имуществ. 1853. Ч. 49. Отд. 2. С. 39; Приложение. С. 3.

[39] *Жукович П. Н.* Сословный состав населения... // Журнал Министерства народного просвещения. 1915. № 2. С. 263.

[40] ПСЗ-II. Т. 48. № 52061.

[41] *Ючас М. А.* О "добровольном" переходе вольных людей в крепостные в Литве XVI – XVIII вв. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1968 г. Л., 1972. С. 103.

[42] *Улащик Н.Н.* Предпосылки крестьянской реформы... С. 68, 76.

[43] ДГА Літвы, ф. 1219, воп. 1, спр. 739, арк. 4.

[44] Сб. ИМ. Спб., 1889. Вып. 2. С. 389–390.

[45] РДАСА, ф. 11, спр. 968, арк. 65; ДГА Літвы, ф. 378, 1802 г., спр. 145, арк. 29.

[46] НГА Беларусі ў Мінску, ф. 333, воп. 24, спр. 3, арк. 43 адв., 60 адв.; Сб. ИМ. Вып. 2. С. 390–391.

[47] ПСЗ-I. Т. 25. № 18871.

[48] ДГА Літвы, ф. 378, 1800 г., спр. 2, ч. 1, арк. 37, 339–341, 405, 940–941; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 731, арк. 8–9; Архив Государственного совета. Спб., 1888. Т. 2. Стб. 566–568; 1878. Т. 3. Ч. 1. Стб. 863–864.

[49] *Вешняков В.* Исторический обзор происхождения разных названий государственных крестьян // Журнал Министерства государственных имуществ. 1857. № 3. С. 89–90.

[50] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 2, спр. 473, арк. 1–13.

[51] ДГА Літвы, ф. 378, 1841 г., спр. 684, арк. 14.

[52] *Заблоцкий-Десятовский А. П.* Граф П. Д. Киселев... Т. 2. С. 217.

[53] ДГА Літвы, ф. 378, 1837 г., спр. 1586, ч. 1, арк. 189.

[54] Гл.: *Неупокоев В. И.* "Вольные" люди Литвы в первой половине XIX в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1960 г. Киев, 1962. С. 391–401.

[55] ДГА Літвы, ф. 378, 1837 г., спр. 1586, ч. 1, арк. 166; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 13, спр. 561.

[56] РДГА, ф. 1266, воп. 1, спр. 26, арк. 298 адв.

[57] Вольные люди западных губерний, живущие на владельческих землях, и узаконения, относящиеся до их устройства. Ковно, 1885. С. 8–16.

[58] ПСЗ-I. Т. 22. № 16196; Т. 28. № 21163; Журналы Комитета министров. Спб., 1888. Т. 1. С. 98.

[59] Гл.: *Вешняков В. И.* Экспедиция государственного хозяйства // Русская старина. 1902. № 7. С. 151–157.

[60] РДГА, ф. 384, воп. 1, спр. 17, арк. 6–7, 21–24, 117, 135–136, 242–244; НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 812, арк. 4–23.

[61] ПСЗ-I. Т. 29. № 22085; Архив Государственного совета. Т. 3. Ч. 1. Стб. 797–798.

[62] РДАСА, ф. 11, спр. 968, арк. 65; ДГА Літвы, ф. 378, 1802 г., спр. 145, арк. 29.

[63] Архив Государственного совета. Спб., 1892. Т. 4. Ч. 1. Стб. 545.

[64] Гл.: *Сергеева Н. И.* Проведение в жизнь указа о свободных хлебопашцах в начале XIX века // История СССР. 1968. № 4. С. 42–56; *Мироненко С. В.* Секретный комитет 1839 – 1842 гг. и указ об обязанных крестьянах: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. М., 1976.

[65] Записка статского советника Николая Тургенева "Нечто о состоянии крепостных крестьян в России" // Сб. ИМ. Спб., 1891. Вып. 4. С. 458.

[66] *Бирюкович В.* Устройство быта свободных хлебопашцев // Архив истории труда в России. Пг., 1921. Кн. 2. С. 62.

[67] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 5, спр. 1647, арк. 23.

[68] РДГА, ф. 1281, воп. 11, спр. 81, арк. 244 адв.

[69] Журнал Министерства внутренних дел. 1841. Ч. 42. № 11. Смесь. С. 16.

[70] РДГА, ф. 571, воп. 9, спр. 36, арк. 32–37, 141–145.

[71] Журналы Комитета министров. Спб., 1888. Т. 1. С. 286–287.

[72] РДГА, ф. 1589, воп. 1, спр. 982; Сб. РИО. Спб., 1896. Т. 98. С. 258.

[73] ДГА Літвы, ф. 378, п/а, 1832 г., спр. 19, арк. 3.

[74] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 2, спр. 1753.

[75] Краткое обозрение положения и действий Виленской казенной палаты в 1846 году. Б. м., б. д. С. 39.

[76] *Вешняков В.* Исторический обзор происхождения разных названий государственных крестьян // Журнал Министерства государственных имуществ. 1857. № 12. С. 73, 78.

[77] Вечерняя газета. 1866. № 127.

[78] *Чепко В. В.* Сельское хозяйство Белоруссии... С. 174.

[79] Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности Министерства государственных имуществ. Спб., 1888. Ч. 2. С. 25.

[80] *Вешняков В.* Исторический обзор... // Журнал Министерства государственных имуществ. 1857. № 12. С. 69–70.

[81] Обозрение управления государственных имуществ за последние 25 лет с 20 ноября 1825 года по 20 ноября 1850 года // Сб. РИО. Т. 98. С. 487, 497.

[82] НГА Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 1062, арк. 11–12.

[83] *Дружинин Н. М.* Государственные крестьяне... Т. 2. С. 66.

[84] *Улащик Н. Н.* Предпосылки крестьянской реформы... С. 96.

[85] ГАДА ў Варшаве. Збор матэрыялаў Мінскага гуртка .., спр. 26, арк. 47.

[86] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 533.

[87] *Неупокоев В. И.* Преобразование беспоместной шляхты в Литве в податное сословие однодворцев и граждан // Революционная ситуация в России в 1859 – 1861 гг. М., 1974. С. 22.

[88] *Самбук С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980. С. 39, 179.

[89] Виленские губернские ведомости. 1868. № 72.

[90] ПСЗ-II. Т. 10. № 8054; Т. 11. № 9799; Т. 16. № 14398.

[91] *Никитин В. Н.* Еврейские поселения северо- и юго-западных губерний (1835 – 1890). Спб., 1894. С. 175–194.

[92] ДГА Літвы, ф. 378, 1840 г., спр. 1374, арк. 3.

[93] Русский вестник. 1879. Т. 142. № 8. С. 784.

[94] *Сыракомля У.* Добрыя весці: Паэзія, проза, крытыка. Мн., 1993. С. 430.

[95] Падлічана па: Материалы для статистики России, собираемые по ведомству Министерства государственных имуществ. Спб., 1861. Вып. 3. С. 186 – 187. Варта ўлічыць, што да моманту правядзення IX і асабліва X рэвізій многія прадстаўнікі асобных катэгорый растварыліся ў асноўнай масе дзяржаўных сялян і пісаліся пад агульнай назвай.

[96] ДГА Літвы, ф. 378, 1846 г., спр. 1980, арк. 357.

[97] *Тамсама*, 1850 г., спр. 2450, арк. 6–22, 33–40; Журнал Министерства государственных имуществ. 1853. Ч. 49. Отд. 1. С. XV–XVI, XXXV–XXXVI, LIII.

[98] *Дружинин Н. М.* Государственные крестьяне... Т. 2. С. 284.

[99] ДАРФ, ф. 109, 1 эксп., 1848 г., спр. 153, арк. 2–2 адв.

[100] *Каганец К.* Творы. Мн., 1979. С. 61.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У канцы XVIII – першай палове XIX ст. на Беларусі адбываюцца важныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перамены. Складванне саслоўнай структуры сялянства ішло ў працэсе разлажэння феадальна-прыгонніцкіх і фарміравання капіталістычных адносін. Гэтаму працэсу спадарожнічала зліццё розных дробных катэгорый сялян у больш буйныя саслоўныя групы. А паколькі дзяржаўная адміністрацыя санкцыянавала і рэгулявала такое зліццё, то перш за ўсё дзяржаўныя сяляне аказаліся тым разрадам сельскага насельніцтва, які пашыраўся за кошт уключэння яго ў склад іншых катэгорый і груп, што страчвалі ў ходзе сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця грамадства свае ранейшыя прывілеі ці сваіх уладальнікаў. З гэтай прычыны дзейнасць дзяржавы па фарміраванні саслоўна-групавога складу сялянства праяўлялася перш за ўсё на прыналежных ёй сялянах і значна слабей на іншых, асабліва прыватнаўласніцкіх, разрадах сельскага насельніцтва.

Першапачатковую аснову казённага саслоўя склалі жыхары былых каралеўскіх староств, у далейшым яно папаўнялася за кошт сялян манастырскіх і духоўных маёнткаў, памешчыцкіх і ўдзельных прыгонных, асабіста незалежных ці паўсвабодных катэгорый сельскага насельніцтва.

У агульнарасійскім маштабе, ва ўмовах развіцця таварна-грашовых адносін, царызм лавіраваў паміж процілеглымі тэндэнцыямі: з аднаго боку, ён вымушаны быў падтрымліваць і пашыраць склад і правы казённага саслоўя, з другога – уступаць узрастаўшым апетытам памешчыцкага класа, які імкнуўся ператварыць дзяржаўных сялян у сваю ўласнасць[1]. Размах сялянскай барацьбы і нарастанне грамадска-палітычнага руху на тэрыторыях былой Рэчы Паспалітай у рашаючай ступені вызначалі перавагу той ці іншай тэндэнцыі, хоць у цэлым тут урад ішоў па шляху ад насаджэння за кошт дзяржаўных сялян рускіх памешчыкаў да пашырэння і ўмацавання гэтага саслоўя. Лёс дзяржаўных сялян на Беларусі залежаў не толькі і не столькі ад фіскальных інтарэсаў казны як феадала-ўласніка, колькі быў падпарадкаваны вырашэнню агульных задач палітычнай стратэгіі царызму ў краі.

У апошняй трэці XVIII ст., каб стварыць для сябе апору ў далучаным краі і задаволіць жаданні пануючага саслоўя, царызм пра-

водзіў палітыку насаджэння землеўладання рускага дваранства і пашырэння памешчыцкага сектара наогул. Таму, нягледзячы на значныя канфіскацыі ўласнасці апазіцыйных памешчыкаў і духавенства, на працягу гэтага часу колькасць дзяржаўных сялян на Беларусі скарацілася прыкладна ў 3 разы.

Нарастанне сялянскага пратэсту, правал планаў па насаджэнні рускага дваранскага землеўладання вымусілі Аляксандра I у 1801 г. спыніць практыку падараванняў сялян ва ўласнасць. З пачатку і да 30-х гг. XIX ст. царызм праводзіў палітыку задобрывання мясцовага дваранства, а мяжа, што аддзяляла дзяржаўных сялян ад памешчыцкіх, заставалася нетрывалай. З іншага боку, ужо ў агульнарасійскім маштабе, урад пераходзіў на шлях аховы і папаўнення казённай уласнасці. За гэты час адбылося, хоць і невялікае, але павелічэнне колькасці дзяржаўных сялян.

Паўстанне 1830 – 1831 гг. паказала няслушнасць "хісткага" ўрадавага курсу ў заходніх губернях. Спробы насаджаць тут маяратнае землеўладанне рускага дваранства за кошт канфіскаваных, а ў перспектыве і ўсіх казённых маёнткаў былі перакрэслены наступленнем крызісу прыгоннага ладу і выкліканым ім абвастрэннем сялянскай барацьбы, а таксама дэмакратызацыяй шляхецкага руху. Факты агітацыі шляхецкіх рэвалюцыянераў у сялянскім асяроддзі надзвычай устрывожылі царскі ўрад. Таму ім быў узяты курс на ўсямернае павелічэнне казённага саслоўя ў заходніх губернях пад "дабрадзейнай апекай" Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Да сярэдзіны XIX ст. дзяржаўныя сяляне па ўдзельнай вазе сярод насельніцтва выйшлі на ўзровень, які меўся на момант далучэння Беларусі да Расіі, а па колькасці пераўзышлі яго. Кожны пяты беларускі селянін стаў дзяржаўным.

Адваротныя працэсы назіраліся ў прыватнаўласніцкай вёсцы. Некаторыя даследчыкі ўжо звярнулі ўвагу на часовы рост памешчыцкага сектара ў канцы XVIII ст. і змяншэнне ўдзельнай вагі сялян памешчыцкіх і прыналежных духавенству (ад 70 – 80 да 50 – 60 % сярод усіх жыхароў) на працягу першай паловы XIX ст.[2] Гэты вывад у прынцыпе пацвярджаюць усе статыстычныя крыніцы, і з ім нельга не пагадзіцца. Іншая рэч, што тлумачэнне такому падзенню долі прыватнаўласніцкіх сялян часам давалася пад уплывам вульгарна-сацыялагічных скажэнняў у савецкай гістарычнай навуцы: сцвярджалася

аб нібыта прамым "выміранні" прыгоннага сялянства. У сапраўднасці ж змяненне суадносін паміж прыватнаўласніцкімі і дзяржаўнымі сялянамі (хоць першыя на Беларусі ўсё ж захавалі сваю абсалютную колькасную перавагу) не магло адбыцца толькі за кошт ваганняў тэмпаў натуральнага прыросту розных пластоў насельніцтва і урбанізацыі. Скарачэнне памешчыцкіх і царкоўных сялян ішло галоўным чынам праз канфіскацыі і секулярызацыі маёнткаў свецкіх і царкоўных феадалаў. Менавіта гэтым можна растлумачыць той факт, што ў 1816 – 1858 гг. сяляне Беларуска-Літоўскага рэгіёна склалі 30,1 % асоб, якія выйшлі са стану прыгоннай залежнасці ва ўсёй імперыі[3]. Да сярэдзіны XIX ст. сяляне былых памешчыцкіх і царкоўных вотчын колькасна пераважалі ў казённым саслоўі, а старосцінскія ўжо складалі меншую яго частку. Значыць, рост ліку дзяржаўных сялян з'яўляўся важнейшым фактарам змяншэння прыгоннага насельніцтва ў Беларусі і тым самым пацвярджаў слабасць феадальна-прыгонніцкай сістэмы, яе бесперспектыўнасць. Зніжэнне ўзроўню прыватнаўласніцкага насельніцтва за кошт пераводу яго ў казённае ведамства ішло ў адзіным рэчышчы з мерамі па абмежаванні прыгоннага права і з'яўлялася першым крокам на шляху да вызвалення сялян "зверху".

Шляхі пераводу сялян у казённае ведамства былі рознымі, асабліва для памешчыцкіх прыгонных: праз канфіскацыі, звязаныя з удзелам у палітычных падзеях іх уладальнікаў, радзей – за даўгі апошніх, у выніку адсутнасці спадчыннікаў ці шляхам куплі. У канцы XVIII – першай трэці XIX ст. прагледжваецца прама прапарцыянальная залежнасць колькасці канфіскаваных маёнткаў ад актыўнасці палітычнай барацьбы ў тых ці іншых рэгіёнах. Пераважна арыстакратычны характар шляхецкага руху ў гэты перыяд абумоўліваў, з аднаго боку, значныя канфіскацыі маёнткаў, а з другога – вяртанне іх яго ўдзельнікам. З неаднаразова праводзімых канфіскацый практычна толькі маёнткі ўдзельнікаў паўстання 1830 – 1831 гг., і тое пасля працяглай барацьбы ва ўрадавых сферах, у масе сваёй канчаткова папоўнілі дзяржаўны фонд. Узмацненне жорсткасці канфіскацыйнай палітыкі ў 40-х гг. супраць удзельнікаў рэвалюцыйных гурткоў і арганізацый не павялічыла саслоўя дзяржаўных сялян, паколькі ад шляхецкага руху, які набываў дэмакратычны аграрны характар, адыходзілі зямельныя ўласнікі.

Прыгонныя духоўных феадалаў пераходзілі ў склад дзяржаўных сялян праз секулярызацыю царкоўных уладанняў. З аднаго боку, яна з'яўлялася працягам урадавай секулярызацыйнай праграмы, распачатай у Расіі яшчэ Пятром I, з другога – абумоўлівалася змыканнем каталіцызму са шляхецкай апазіцыяй. Секулярызацыя праводзілася фактычна ў два этапы. Па меры ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі адбывалася агульная канфіскацыя маёнткаў свецкіх і царкоўных феадалаў, што заставаліся за мяжой ці выступілі супраць новай улады. У 70 – 90-я гг. XVIII ст. гэта закранула толькі частку царкоўных уладанняў, што належалі пераважна Віленскаму епіскапству. У 30 – 40-х гг. XIX ст. шэрагам спецыяльных указаў царкоўныя населеныя маёнткі былі перададзены ў казну. Некалькі раней (у 1773 і 1820 гг.) прайшла секулярызацыя ўладанняў езуіцкага ордэна, што абумоўлівалася асобымі ўзаемаадносінамі яго з Рымам, Варшавай і Пецярбургам. На першым этапе секулярызацыі духоўныя сяляне трапілі ў рукі пераважна прыватных уладальнікаў (праз "раздачы"), на другім – у склад дзяржаўных сялян.

Адносіны розных груп і катэгорый сялянства да пераходу ў склад дзяржаўных вызначаліся характарам змен у іх сацыяльным і прававым статусе. Мацней прыгнечаныя прыгонныя памешчыцкіх і царкоўных вотчын у цэлым прыхільна аднесліся да гэтай падзеі, якой спадарожнічала, калі не адразу, то ў перспектыве, паляпшэнне іх становішча. Больш таго, яны, асабліва ў час рэформы дзяржаўнай вёскі, вялі барацьбу за пераход у казённае ведамства. Гэтая барацьба, зліваючыся з пратэстам дзяржаўных сялян супраць спроб паглынання іх памешчыцкім феадалізмам, не толькі садзейнічала павелічэнню казённага саслоўя, але і ў многім абумоўлівала яго захаванне. Сялян не палохалі нават цяжкасці пераходнага перыяду, насычанага з-за нядзольнасці феадальнага дзяржаўнага апарату эфектыўна рашаць пастаўленыя перад ім новыя задачы шматлікімі злоўжываннямі. Распаўсюджанне на прыватнаўласніцкіх сялян, якія ўвайшлі ў склад дзяржаўных, правоў апошніх забяспечвала праз агульнасць карэнных асноў сацыяльна-эканамічнага становішча тых і другіх хуткае зліццё іх у аднародную масу. Захаванне ў сярэдзіне XIX ст. адрозненняў у назвах дзяржаўных сялян (старосцінскія, епіскапскія, другія паезуіцкія, канфіскаваныя, паманастырскія, пауніяцкія, падухоўныя) ужо мела чыста фармальны характар.

Інакш было са спецыяльнымі, паўсвабоднымі, асабіста незалежнымі катэгорыямі сельскага насельніцтва. Адны вялі паходжанне яшчэ ад часоў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай (выбранцы, панцырныя баяры, вольныя людзі, замежныя каланісты і інш.), старыя саслоўныя адрозненні якіх у многім згубілі сваю матэрыяльную аснову. Другія з'явіліся ў выніку сацыяльна-палітычных мерапрыемстваў расійскага ўрада (вольныя хлебаробы, аднадворцы заходніх губерняў, яўрэі-земляробы). Некаторыя сельскія жыхары з-за сваіх спецыфічных абавязкаў набывалі рысы асобага статуса ўнутры сялянскіх разрадаў (лясныя слугі, архірэйскія і манастырскія служкі). Дзяржава санкцыянавала знікненне фактычных адрозненняў у эканамічным становішчы гэтых катэгорый. Уводзімыя ў склад казённага саслоўя, за рэдкім выключэннем пад прамым націскам Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, яны, як правіла, аказвалі супраціўленне уніфікацыі свайго стану, упарта адстойвалі ранейшыя правы і прывілеі, што выгадна рознілі іх ад асноўнай масы эксплуатуемага феадалам-казной сялянства. Спецыяльныя катэгорыі сельскага насельніцтва склалі каля 1/10 часткі казённага саслоўя. Аднак фармальна туды ўключаныя, яны доўгі час захоўвалі фактычныя асаблівасці свайго становішча і эксплуатацыі. З прычыны ўключэння разнастайных, у тым ліку і з этнічнага боку, катэгорый сельскага насельніцтва ў склад дзяржаўных сялян апошнія адрозніваліся ад памешчыцкіх большай стракатасцю нацыянальнага складу.

Палітыка расійскага ўрада ў адносінах да спецыяльных катэгорый сельскага насельніцтва Беларусі, асабліва ў першыя дзесяцігоддзі, сведчыла аб яго імкненні да ўмацавання за іх кошт прыгонніцкай сферы. У той жа час для паўсвабоднага сялянства, якое апынулася яшчэ і пад націскам землеўладальнікаў, пераход пад уладу казны быў лепшым выйсцем, чым запрыгоньванне памешчыкам, асабліва з пераводам дзяржаўных маёнткаў на аброк і надзяленнем там сялян грамадзянскімі правамі. Таму дзейнасць у гэтым плане, хоць і не да канца паслядоўную, Міністэрства дзяржаўных маёмасцей можна лічыць адносна прагрэсіўнай. Іншая рэч, праводзячы палітыку уніфікацыі, збліжэння і зліцця розных разрадаў і груп вясковага жыхарства, царскі ўрад меў на мэце і іх дэнацыяналізацыю (русіфікацыю), што прысутнічала і ў спробах асяляньвання татараў і цыганоў. Але гэтая тэндэнцыя праводзілася асцярожна, абачліва, з разлікам на перспектыву. Ва

ўсякім разе, у адрозненне ад выразных клопатаў аб самабытнасці перасяленцаў з карэнных рускіх тэрыторый, нідзе ў афіцыйна-дакументальных матэрыялах не сустракаюцца нават намёкі на захаванне культурна-нацыянальных ці рэлігійных асаблівасцей нярускіх катэгорый земляробскага насельніцтва. Такія катэгорыі павінны былі пастулова растварацца ў беларускім этнасе і русіфікавацца разам з ім.

Прадметам асаблівых клопатаў царскай улады на Беларусі былі таксама спецыфічныя групы феадальна-залежнага насельніцтва, якія выдзяляліся з агульнай масы пераважна прыналежнасцю розным катэгорыям уладальнікаў, што, у сваю чаргу, выклікала некаторыя адрозненні ў іх правах і эканамічным становішчы, формах эксплуатацыі. Удзельныя падданыя, у склад якіх спачатку былі запісаны жыхары асобных каралеўскіх уладанняў (эканомій), праз падараванні трапілі ў склад памешчыцкіх, астатнія абменены на дзяржаўныя. Сяляне “падзеленай уласнасці” ці “ўмоўнага ўладання” (ленныя, першыя паезуіцкія, скульцецкія) таксама ў асноўным зліваліся з памешчыцкімі. Гарадскія ж, як і некаторых іншых ведамстваў, засталіся пры сваім статусе. Створаная Ваенным міністэрствам на казённых землях катэгорыя ваенных пасялян, пераўтвораная пазней у ворных салдат, трапіла ў склад дзяржаўных сялян. Міністэрства дзяржаўных маёмасцей рабіла захады для пераводу рознага роду маёнткаў і сялян у сваё распараджэнне, але гэта яму далёка не заўсёды ўдавалася.

Свядомае рэгуляванне дзяржавай саслоўнага складу сялянскай масы ў бок нівеліроўкі, сцірання сярэдневяковых перагародак адпавядала патрэбам пераходнага этапу сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства і сведчыла аб прыстасоўванні вярхоўнай улады да капіталістычных адносін. Зыходзячы з інтарэсаў казны як уласніка, з-за прамой падпарадкаванасці ўраду менавіта дзяржаўныя сяляне аказаліся тым разрадам сельскага насельніцтва, які больш за ўсё паглынаў астатнія. Эвалюцыя саслоўнага складу сялянства ў напрамку захавання толькі двух асноўных груп: дзяржаўных і памешчыцкіх, а ў далейшым ліквідацыя і іх саміх як феадальных саслоўяў, стварала прадпасылкі для фарміравання буржуазных элементаў і паўпралетарскіх пластоў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

[1] *Дружинин Н. М.* Государственные крестьяне... Т. 1. С. 88–89.

[2] Гл.: *Чепко В. В.* Сельское хозяйство Белоруссии... С. 110.

[3] *Кабузан В. М.* Крепостное крестьянство России в XVIII – 50-х годах XIX века. Численность, состав и размещение // История СССР. 1982. № 3. С. 78.

# ПАКАЗАЛЬНІК СЯЛЯНСКІХ КАТЭГОРЫЙ

Абавязаныя сяляне 94–95
Аднадворцы заходніх губерняў 7, 9, 96–99, 101, 102, 111
Архірэйскія і манастырскія служкі 78, 111

Ваенна-служылыя людзі 83–84, 87–89
Ваенныя пасяляне 4, 49–52, 112
Ведамасныя сяляне 7, 53, 112
Вольныя людзі 7, 9, 55, 56, 87, 89–93, 98, 101, 102, 111
Вольныя хлебаробы 88, 94–95, 111
Ворныя салдаты 51–52, 112
Выбранцы 8–9, 87–88, 111

“Гарадскія” сяляне 53–54, 112

Дзяржаўныя (казённыя) сяляне 3–8, 10–12, 20, 29–31, 33–34, 39–60, 78, 89, 93, 98, 100–102, 107–112
Дзяржаўныя сяляне, пaселеныя на ўласных землях 95, 98

Езуіцкія сяляне 8, 69–71
Епіскапскія сяляне 65–68, 110

Замежныя каланісты 93–94, 102, 111

Канфіскаваныя сяляне 4, 5, 7, 9–11, 16–30, 58, 109–110

Ленныя сяляне 8, 54, 101, 109, 112
Лясныя слугі 84–86, 111

Манастырскія сяляне 31, 65–67, 73, 107

Падухоўныя сяляне 76–77, 110
Паезуіцкія другія сяляне 71, 110
Паезуіцкія першыя сяляне 8, 11, 54, 69–70, 112
Паманастырскія сяляне 58, 74–75, 77, 110
Памешчыцкія (панскія) сяляне 3–5, 7, 8, 11, 12, 16–34, 107–112
Панцырныя баяры 88–90, 111
Пауніяцкія сяляне 75, 110

Рускія сяляне 5, 56–57, 112

Секвестраваныя сяляне 16–23, 25
Скульцецкія сяляне 54, 68, 112
Стараверы (раскольнікі) 94, 102
Старосцінскія сяляне 8, 11, 34, 39–47, 58, 90, 107, 109, 110
Сяляне-слугі 39, 83–89

Татары 54–55, 111

Удзельныя (дварцовыя) сяляне 40, 43, 44, 52–53, 88, 107, 112

Царкоўныя (духоўныя) сяляне 4, 7, 9–12, 31, 34, 39, 65–77, 90, 107–110
Цыганы 54–56, 111

Эканамічныя сяляне 39–44, 112

Яўрэі-земляробы 10, 99–100, 111

## ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........ 3

Глава 1. КАНФІСКАЦЫІ ПАМЕШЧЫЦКІХ МАЁНТКАЎ ........ 16

Глава 2. РАЗДАЧЫ І ПАПАЎНЕННІ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВЁСКІ ... 39

Глава 3. СЕКУЛЯРЫЗАЦЫЯ ЦАРКОЎНЫХ УЛАДАННЯЎ .... 65

Глава 4. НІВЕЛІРОЎКА СПЕЦЫЯЛЬНЫХ КАТЭГОРЫЙ СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ........ 82

ЗАКЛЮЧЭННЕ ........ 107

ПАКАЗАЛЬНІК СЯЛЯНСКІХ КАТЭГОРЫЙ ........ 114

Навуковае выданне

**Сосна** Уладзімір Аркадзевіч

**ФАРМІРАВАННЕ САСЛОЎНА-ГРУПАВОГА СКЛАДУ СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.**

Рэдактар *Л. В. Руткоўская*
Тэхнічныя рэдактары *І. П. Ціханава*, *Т. К. Рамановіч*
Карэктар *В. В. Ржэуцкая*
Камп'ютэрная вёрстка *В. А. Сырыч, М. Г. Шорап*

Падпісана да друку 05.05.2000. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 6,74. Ул.-выд. арк. 6,81. Тыраж 300 экз. Зак. 366.

Беларускі дзяржаўны універсітэт.
Ліцэнзія ЛВ № 315 ад 14.07.98.
220050, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 4.

Надрукавана ў Выдавецкім цэнтры БДУ.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.





ISBN 985-445-279-4

9 799854 452790 >